Дыпкур'ер

Беларусь лічыць акрэдытацыю пасла ЗША важным момантам у двухбаковых адносінах

Стар. 2

BELARUS 21.BY

Беларусь on-line у Інтэрнэце

Скарбонка

Нацыянальнаму акадэмічнаму народнаму аркестру Беларусі імя Жыновіча — 75 гадоў

Стар. 7

Кошт у Беларусі 1 000 рублёў.

9 лістапада, 2006

Газета з Беларусі

Голас Радзімы

Газета выходзіць у другі і чацвёрты чацвер месяца.

№ 45-46 (3019-3020)

Выдаецца з 1955 года

Стасункі

Удзельнікі веламарафона "Чарнобыль-2000+" праехалі па дарогах 38 краін

Стар. 3

Спадчына

Інтэрактыўная выстава "Мой мілы таварыш, мой лётчык"

Стар. 5

Між намі, еўрапейцамі

Люблю беларускую школу!

Стар. 13

Этнаастраномія

НА МОВЕ ЗОРАК...

Стар. 14

Спорт

"Більярд як спорт і мастацтва"

15 стар.

Афіша

"Цырк на вадзе" – містычны сплаў музыкі, казачнага свету і харэаграфіі

Стар. 16

Да ўвагі чытачоў!

Наступны нумар газеты "Голас Радзімы" выйдзе 23 лістапада 2006 года

Ракурс

Чайкі над Свіслаччу ў Мінску. Фота Максіма ГУЧАКА, БелТА.

Партрэт нацыі

Перапіс насельніцтва ў Беларусі будзе праведзены з 14 па 24 кастрычніка 2009 года

Указ аб гэтым падпісаў кіраўнік дзяржавы.

Для выканання мерапрыемстваў па яго падрыхтоўцы і правядзенні будзе павялічана колькасць работнікаў органаў дзяржаўнай статыстыкі на перыяд правядзення ўсяго комплексу работ.

Такія назіранні неабходны для атрымання надзейных і падрабязных даных аб колькасці, размеркаванні і складзе насельніцтва для наступнага выкарыстання пры распрацоўцы і рэалізацыі праграм у галіне сацыяльна-эканамічнага развіцця, адміністрацыйнай дзейнасці і пры правядзенні навуковых дэмаграфічных даследаванняў.

Перапіс насельніцтва — дзяржаўнае статыстычнае назіранне, якое праводзіцца адзін раз у дзесяць гадоў і мае важнае сацыяльна-палітычнае значэнне для краіны. Апошні перапіс насельніцтва ў Беларусі праводзіўся ў лютым 1999 года.

Стар. 2

Актуальна

Міграцыйная картка цяпер адзіная для Беларусі і Расіі

З 1 лістапада кожны іншаземец, які ўязджае ў нашу краіну ці ў Расію, будзе запаўняць адзіную міграцыйную картку.

У ёй неабходна ўказаць свае асабістыя даныя, мэту паездкі і тэрмін знаходжання. Новаўвядзенне дазволіць наладзіць кантроль над міграцыйнымі патокамі на тэрыторыі дзвюх дзяржаў і процістаяць нелегальнай міграцыі.

Міграцыйная картка выдаецца іншаземцам бясплатна і запаўняецца замежнымі грамадзянамі і асобамі без грамадзянства пры ўездзе ў Беларусь і Расію з тэрыторыі трэцяй дзяржавы.

Заканчэнне на **стар. 2**

Сітуацыя

Вяшчанне "Беларусь–ТБ" у Літве адноўлена

Пра гэту навіну журналісты даведаліся на прэзентацыі сайта тэлеканала "Беларусь-ТБ".

Раней інфармацыя пра канал была на карпаратыўным сайце Белтэлерадыёкампаніі. Цяпер "Беларусь-ТБ" прадстаўлена на сайце www.belarus-tv.by.

Акрамя гэтага, з прадзюсерскага цэнтра "Беларусь-ТБ" ператварылася ў паўнапраўны тэлеканал у складзе Белтэлерадыёкампаніі. З гэтай нагоды Белтэлерадыёкампанія і арганізавала прэзентацыю, на якой прысутнічалі старшыня БТРК Аляксандр Зімоўскі і галоўны дырэктар дырэкцыі тэлеканала "Беларусь-ТБ" Валерый Радуцкі.

Якія ж магчымасці сайта?

Заканчэнне **стар. 2,12**

Афіцыйна

Леанід Гуляка прызначаны Упаўнаважаным па справах рэлігій і нацыянальнасцяў

27 кастрычніка 2006 года Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка прызначыў Леаніда Гуляку Упаўнаважаным па справах рэлігій і нацыянальнасцяў. Гэтая структура стала правапрыемнікам былога Камітэта па справах рэлігій і нацыянальнасцяў пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь.

Па словах Прэзідэнта Беларусі, апошнія назначэнні завяршылі аптымізацыю органаў дзяржаўнага кіравання і іх кадравае забеспячэнне. Пасля прэзідэнцкіх выбараў была зацверджана новая структура і склад урада. Былі ліквідаваны некаторыя дзяржорганы — іх колькасць зменшылася з 47 да 39. Гэта дазволіла трохступеньчатую сістэму кіравання замяніць двухступеньчатай. Асноўнымі органамі кіравання на рэспубліканскім узроўні сталі міністэрствы і дзяржаўныя камітэты. Іх сфера дзейнасці значна пашырылася.

"Сёння фактычна завершаны працэс фарміравання ўпраўленчых структур", — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. Прэзідэнт напомніў, што зусім нядаўна ім былі падпісаны два ўказы, якія закраналі даныя пытанні. Адзін з іх тычыцца колькасці намеснікаў кіраўнікоў рэспубліканскіх органаў дзяржаўнага кіравання, падпарадкаваных ураду. "Асаблівасцю гэтага ўказа было тое, што мы не павялічваем колькасць намеснікаў міністраў, як бы гэта ні матывавалася самімі міністрамі і іншымі службовымі асобамі. Гэта непахіснае патрабаванне. Трэба дагружаць ужо існуючых намеснікаў кіраўнікоў міністэрстваў. Павялічваць штаты мы ні ў якім выпадку не будзем, будзем толькі памяншаць", — заявіў Прэзідэнт.

Валянціна ГРЫШКЕВІЧ.

ААЭ, Аргенціна, Арменія, Аўстралія, Аўстрыя, Балгарыя, Беларусь, Бельгія, Бразілія, Венгрыя, В'етнам, Вялікабрытанія, Германія, Данія, Егіпет, ЗША, Ізраіль, Індыя, Іран, Італія, Казахстан, Канада, Карэя (Паўднёвая), Кітай, Куба, Кыргызстан, Латвія, Лівія, Літва, Малдова, Мексіка, Нарвегія, Нідэрланды, ПАР, Польшча, Расія, Румынія, Сербія, Сірыя, Славакія, Славенія, Туркменістан, Турцыя, Узбекістан, Украіна, Уругвай, Францыя, Чэхія, Швейцарыя, Швецыя, Эстонія, Японія

"Голас Радзімы" ў 52 краінах

*NEWS FROM BELARUS * БЕЛОРУССКИЕ НОВОСТИ * BIALORUSKIE WIADOMOŚCI * NOTICIAS DE BELARUS * БІЛОРУСЬКІ НОВИНИ*

Дыпкур'ер

Беларусь лічыць акрэдытацыю пасла ЗША важным момантам у двухбаковых адносінах

24 кастрычніка ў ліку дыпламатаў сямі замежных дзяржаў свае даверчыя граматы Прэзідэнту Беларусі Аляксандру Лукашэнку ўручыла Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол ЗША Карэн Сцюарт.

Рэспубліка Беларусь зацікаўлена ў адкрытым і канструктыўным дыялогу са Злучанымі Штатамі Амерыкі на ўмовах раўнапраўя, узаемнай павагі і ўліку інтарэсаў, заявіў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка падчас цырымоніі.

"Розныя погляды па шэрагу праблем не павінны перашкаджаць нарошчванню сумесных намаганняў там, дзе нашы падыходы супадаюць", — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

"Спадзяюся, што дзейнасць новага пасла ЗША, дарэчы, якая вельмі добра ведае Беларусь, з улікам назапашанага ёю вопыту ў нашай краіне, будзе накіравана на пашырэнне ўзаемавыгадных і паважлівых адносін паміж нашымі дзяржавамі", — сказаў Прэзідэнт.

ЗША з'яўляюцца самым буйным інвестарам Беларусі па суме пералічаных сродкаў ва ўстаўныя фонды і знаходзяцца на другім пасля Расіі месцы па колькасці створаных сумесных і замежных прадпрыемстваў. На 1 студзеня 2006 года дзейнічала 523 такія прадпрыемствы. У 2006 годзе пачата падрыхтоўка адкрыцця прадстаўніцтва канцэрна "Белнафтахім" у ЗША.

НА ЗДЫМКУ: Прэзідэнт Беларусі і пасол ЗША ў час цырымоніі ўручэння даверчых грамат.

Фота БелТА.

Прэзідэнт Беларусі павіншаваў кардынала Казіміра Свёнтака

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 21 кастрычніка павіншаваў з днём нараджэння Кардынала Казіміра Свёнтака, Архіепіскапа Мітрапаліта Мінска-Магілёўскага на пенсіі, Апостальскага Адміністратара Пінскай епархіі.

"Ваша шматгадовая праца, непахісная вера, жыццёвая мудрасць і аптымізм заваявалі вялікую павагу і прызнанне. Няхай гэта высакароднае служэнне прадаўжаецца яшчэ доўгія гады, садзейнічаючы ўмацаванню духоўных і маральных асноў грамадства", — гаворыцца ў віншаванні. Прэзідэнт пажадаў Казіміру Свёнтаку моцнага здароўя, мнагалецця і жыццёвых сіл.

Марта АСТРЭЙКА, БелТА.

Актуальна

Міграцыйная картка цяпер адзіная для Беларусі і Расіі

—— Пачатак на 1-й стар. ——

Шэраг катэгорый грамадзян, напрыклад, члены ўрадавых дэлегацый, дыпламаты, члены экіпажаў транспартных сродкаў, якія ўдзельнічаюць у міжнародных перавозках, будуць вызвалены ад неабходнасці запаўняць міграцыйныя карткі. Акрамя таго, не будуць іх запаўняць грамадзяне Расіі пры ўездзе ў Беларусь і грамадзяне Беларусі пры ўездзе ў Расію.

Як тлумачаць у Дэпартаменце па грамадзянстве і міграцыі МУС, бланк міграцыйнай карткі адзінага ўзору складаецца з дзвюх частак: "А" і "Б". Іншаземец абавязаны запоўніць абедзве часткі карткі, падпісаць яе і прад'яўляць службовай асобе пагранічных войскаў Рэспублікі Беларусь пры перасячэнні дзяржаўнай мяжы або супрацоўніку падраздзялення па грамадзянстве і міграцыі, іншага падраздзялення органа ўнутраных спраў па патрабаванні або пры праходжанні працэдуры рэгістрацыі. Частка "А" застаецца ў пагранічніка, частка "Б" з адзнакай аб уездзе захоўваецца ў замежнага госця на працягу ўсяго перыяду яго знаходжання на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь і здаецца службовай асобе пагранічных войскаў Беларусі пры выездзе.

Далей пры рэгістрацыі ў органах унутраных спраў (гэту працэдуру неабходна прайсці на працягу трох сутак, за выключэннем выхадных і свят), на адваротным баку часткі "Б" таксама ставіцца адпаведная адзнака. Калі іншаземец затрымаецца ў краіне даўжэй за пазначаны ў міграцыйнай картцы тэрмін, то ён рызыкуе атрымаць статус нелегала і быць дэпартаваным.

Калі іншаземец прыбыў у Беларусь да 1 лістапада 2006 года, то пры рэгістрацыі і пры выездзе яго з рэспублікі міграцыйная картка не патрэбна. Да 1 студзеня 2007 года ўстаноўлены пераходны перыяд, калі будуць дзейнічаць міграцыйныя карткі старога ўзору, выдадзеныя ў Рэспубліцы Беларусь або Расійскай Федэрацыі.

Увядзенне ў Беларусі і Расіі міграцыйнай карткі адзінага ўзору прадугледжана міжурадавым пагадненнем ад 5 кастрычніка 2004 года і пратаколам МУС Беларусі і Расіі, падпісаным 7 ліпеня 2006 года ў Маскве.

Падрыхтавала Алена СПАСЮК.

Сітуацыя

Вяшчанне "Беларусь-ТБ" у Літве адноўлена

—— Пачатак на 1-й стар. ——

Наведвальнікі могуць азнаёміцца з інфармацыяй пра кабельных аператараў, якія яго рэтрансліруюць, рэкамендацыямі па прыёме, тэрыторыі распаўсюджвання спадарожнікавага сігналу, праграмай перадач з анонсамі найбольш цікавых перадач і кінафільмаў. Запоўніўшы спецыяльную форму, любы Інтэрнэт-карыстальнік можа пакінуць свой водгук ці задаць пытанне супрацоўнікам тэлеканала.

Для тэлегледачоў, якія мала ведаюць пра Беларусь, у спецыяльным раздзеле размешчана падрабязная інфармацыя пра гісторыю, культуру, эканоміку краіны.

І, канешне, працягнецца прамое Інтэрнэт-вяшчанне канала "Беларусь-ТБ". Валерый Радуцкі паведаміў, што за дзевяць месяцаў бягучага года зарэгістравана каля 661 тысячы падключэнняў да Інтэрнэт-рэсурсу канала "Беларусь-ТБ" са 140 краін. Лідэрамі тут з'яўляюцца ЗША, Германія і Турцыя.

Акрамя гэтага спадарожнікавы тэлеканал "Беларусь-ТБ" заключыў дагаворы на рэтрансляцыю з 335 кабельнымі аператарамі ў 246 гарадах 12 краін. Аўдыторыя канала 4,5 мільёна чалавек.

Адноўлена трансляцыя канала ў Літве. Як пісаў "Голас Радзімы", больш за 100 000 абанентаў кабельных сетак Літвы з вясны былі пазбаўлены магчымасці глядзець тэлеканал "Беларусь-ТБ" з прычыны палітычнага рашэння Камісіі па радыё і тэлебачанні гэтай краіны. Прадстаўнікі літоўскіх кабельных аператараў падалі скаргу аб скасаванні гэтага рашэння ў Вільнюскі акружны адміністрацыйны суд і выйгралі справу.

Алена СПАСЮК.

Каментарый

Партрэт нацыі

Важны факт зафіксавалі нядаўна спецыялісты Міністэрства аховы здароўя Беларусі. Ён сведчыць аб тым, што ў студзені — ліпені ў параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года нараджальнасць у краіне павялічыліся на 4,6 працэнта, а смяротнасць знізілася на 2,1 працэнта. За сем месяцаў нарадзіліся 53 829 хлопчыкаў і дзяўчынак — на 2 489 больш, чым у студзені — ліпені 2005 года. У той жа час колькасць памерлых за гэты перыяд скарацілася. Такім чынам, яўна вызначылася станоўчая тэндэнцыя, якая вядзе да таго, што нараджальнасць пачне перавышаць смяротнасць. Спецыялісты асцярожна даюць на гэта тэрмін у пяць гадоў.

Гэта значыць, адмоўны дысбаланс паміж народжанымі і памерлымі можа знікнуць якраз да чарговага перапісу насельніцтва краіны, які павінен прайсці ў 2009 годзе.

Гэта падзея не з ліку радавых, для кожнай краіны яна мае як сацыяльна-эканамічнае, так і палітычнае значэнне. Невыпадкова большасць дзяржаў, у тым ліку і Беларусь, прытрымліваецца строгай часовай цыклічнасці ў правядзенні перапісу — дзесяць гадоў. Менавіта такі тэрмін найбольш рэльефна высвятляе змяненні, якія адбываюцца ў краіне. Гэта атрымліваецца ў працэсе збору дэмаграфічных, эканамічных і сацыяльных даных, якія характарызуюць кожнага жыхара краіны або тэрыторыі. На базе гэтых даных урадам лягчэй распрацоўваць розныя эканамічныя і сацыяльныя праграмы, нібы ў люстэрку бачыць, які будзе ў будучым людскі капітал дзяржавы.

Менавіта зыходзячы з гэтага, да думкі аб неабходнасці ўліку насельніцтва дайшлі дзяржаўныя дзеячы Кітая, Грэцыі, Рыма і іншых краін яшчэ ў глыбокай старажытнасці. Ёсць звесткі, што ў Кітаі ўлік насельніцтва праводзіўся за дзве тысячы гадоў да нашай эры. Аднак гэтыя "перапісы" былі вельмі прымітыўнымі і ахоплівалі не ўсё, а толькі частку насельніцтва.

А першы перапіс, які адказвае навуковым прынцыпам, здзейснены ў Бельгіі ў 1846 годзе пад кіраўніцтвам вядомага статыстыка Кетле. Звесткі збіралі не аб гаспадарках у цэлым, а аб кожным жыхары. Другая палова XIX стагоддзя была перыядам, калі ў развітых краінах свету былі закладзены навуковыя асновы і засвоена практыка правядзення перапісаў насельніцтва.

Першы перапіс на тэрыторыі Беларусі быў праведзены ў 1897 годзе і зафіксаваў колькасць насельніцтва ў 6 мільёнаў 673 тысячы чалавек. Перапісы ў перыяд уваходжання нашай рэспублікі ў склад СССР прайшлі ў 1926, 1939, 1959, 1970, 1979 і 1989 гадах. Дарэчы, менавіта падчас апошняга ўліку быў зафіксаваны рэкорд колькасці насельніцтва — 10 мільёнаў 151,8 тысячы чалавек.

У незалежнай Беларусі першы перапіс прайшоў у 1999 годзе. Ён засведчыў, што Беларусь у сваё суверэннае "плаванне" адправілася, маючы на "борце" 10 мільёнаў 45,2 тысячы грамадзян. За 40 гадоў пасля першага пасляваеннага перапісу насельніцтва павялічылася на 25 працэнтаў, пры гэтым доля гарадскога насельніцтва ў параўнанні з вясковым узрасла ў 2,8 раза. Цікавыя і іншыя даныя. Так, у 1999 годзе на тэрыторыі краіны пражывалі прадстаўнікі 130 нацыянальнасцяў, у тым ліку 81,2 працэнта ад усіх жыхароў запісалі сябе беларусамі, 11 працэнтаў — рускімі, 4 працэнты — палякамі, амаль 2,5 працэнта — украінцамі.

Вынікі чарговага перапісу 2009 года чакаюцца, мусіць, з самай вялікай цікавасцю: упершыню будуць атрыманы вельмі важныя вынікі дзесяцігадовага жыцця краіны ў якасці суверэннага суб'екта. У кола звестак, якое вызначаецца праграмай перапісу, звычайна ўваходзяць дэмаграфічныя прыкметы (пол, узрост, сямейны стан), эканамічныя прыкметы (занятак, галіна або від эканамічнай дзейнасці, статус у занятку), адукацыя (пісьменнасць, наведванне школы), этнічныя прыкметы (нацыянальнасць, мова, часам — веравызнанне). Асаблівую цікавасць будзе ўяўляць інфармацыя аб тых, хто часова пражывае на тэрыторыі Беларусі. Перапіс таксама дазволіць атрымаць звесткі аб становішчы розных сацыяльных груп (дзяцей, моладзі, асоб сталага веку, бяздомных, беспрацоўных). Пры правядзенні перапісу прыняты прынцып самавызначэння, гэта значыць звесткі атрымліваюць не з дакументаў, а са слоў чалавека.

Перапіс праводзяць у кароткія тэрміны, на працягу некалькіх дзён або тыдняў, у той час года, калі людзі найменш мабільныя, але ўсе звесткі збіраюць па стане на так званы крытычны момант (звычайна поўнач напярэдадні першага дня перапісу: памерлыя да і народжаныя пасля гэтага моманту не ўлічваюцца). Мяркуецца, што ў нашай краіне перапіс пройдзе з 14 па 24 кастрычніка 2009 года.

Адказы запісваюць на перапісныя лісты або бланкі адзінага ўзору. Гэта робяць спецыяльна навучаныя лічыльшчыкі (рэгістратары) пры вусным апытанні альбо самі жыхары пры так званым самападліку. Прымаюцца меры, каб нікога не прапусціць і не палічыць двойчы. Такім чынам, перапіс з'яўляецца складанай аперацыяй, якая патрабуе ўсебаковага навуковага абгрунтавання, доўгай падрыхтоўкі і строгай арганізацыі.

Важная аперацыя — апрацоўка матэрыялаў. Пасля дбайнага кантролю запісу ў перапісных лістах кадзіруюцца (шыфруюцца) па некаторых прыкметах (занятак, нацыянальнасць) з дапамогай асаблівых слоўнікаў або счытваюцца спецыяльнымі прыладамі для ўводу ў лічыльныя машыны. Найбольш важныя даныя атрымліваюць папярэдне, часам выбарачна. Поўная апрацоўка матэрыялаў перапісу часам доўжыцца некалькі гадоў.

Такім чынам дзяржава атрымае новы дэмаграфічны, этнічны і сацыяльна-эканамічны партрэт нацыі. Каштаваць гэты "твор" будзе 21 мільярд рублёў, або ў сярэднім долар на чалавека.

Зараз у Беларусі вядзецца падрыхтоўка праекта Нацыянальнай праграмы дэмаграфічнай бяспекі на 2006-2010 гады. Асноўнымі мэтамі яе стануць зніжэнне захворванняў і смяротнасці насельніцтва, павелічэнне нараджальнасці і працягласці жыцця, а таксама аптымізацыі міграцыйных працэсаў. Перапіс 2009 года стане своеасаблівым лакмусавым тэстам, які засведчыць эфектыўнасць такой праграмы і ў якім накірунку даныя дакументы распрацоўваць у будучым.

Адным словам, перапіс — гэта сур'ёзна.

Віктар ЛАЎГАЧ, БелТА.

Удзельнікі веламарафона "Чарнобыль–2000+" праехалі па дарогах 38 краін

Міжнародны дабрачынны веламарафон "Чарнобыль-2000+" 19 кастрычніка прыбыў у сталіцу Беларусі. Акцыя прысвечана 20-й гадавіне чарнобыльскай катастрофы і памяці ўсіх ахвяр радыяцыйных аварый.

Гэты веламарафон стартаваў 26 красавіка ў Маскве на Краснай плошчы, прайшоў 17 тысяч кіламетраў па тэрыторыях 38 краін, 26 кастрычніка фінішыраваў у расійскай сталіцы. Удзельнікі велапрабегу на тэрыторыі Беларусі прайшлі праз Брэст, Кобрын, Баранавічы, Мінск, Барысаў і Оршу да пагранічнага пераходу "Ляды" ў Смаленску.

НА ЗДЫМКУ: удзельнікі веламарафона ў Мінску.

Фота Генадзя СЯМЁНАВА, БелТА.

Падрабязнасці

Асацыяцыя клубаў ЮНЕСКА — сучаснае мысленне, канкрэтныя ўчынкі

Дзмітрый Субцэльны, генеральны сакратар Беларускай асацыяцыі клубаў ЮНЕСКА, скончыў Магілёўскі педагагічны універсітэт, дзе вучыўся на гістарычным факультэце, а з 2000 года з'яўляўся рэгіянальным каардынатарам Асацыяцыі клубаў ЮНЕСКА па Магілёскай вобласці. У Мінску працуе два гады. З яго прыходам дзейнасць Асацыяцыі набыла новыя накірункі. Карэспандэнт "Голасу Радзімы" Рэгіна Гамзовіч зацікавілася праектамі Дзмітрыя і вырашыла распытаць аб іх больш падрабязна.

— Што вам удалося зрабіць у Магілёве значнага, што выклікала цікавасць і запрашэнне на працу ў Мінск?

— У кожнага клуба ЮНЕСКА ёсць свой накірунак дзейнасці. У Магілёве я кіраваў клубам ЮНЕСКА "Кантакт", які садзейнічаў развіццю міжкультурных зносін народаў, што жывуць у магілёўскім рэгіёне. Штомесяц мы праводзілі дні культур розных народаў, і магіляўчане з задавальненнем наведвалі іх, каб пазнаёміцца з традыцыямі народаў, якія жывуць і працуюць побач. Мы супрацоўнічалі з нацыянальнымі аб'яднаннямі — яўрэйскімі, цыганскімі, народаў Каўказа і іншымі. Надаючы вялікую ўвагу міжкультурным зносінам і стасункам, мы нават ажыццявілі міжнародны праект "Альтэрнатыва", прысвечаны пераадольванню стэрэатыпаў, прымхаў паміж народамі Заходняй і Усходняй Еўропы. Яны дагэтуль існуюць, і нашай задачай было — паказаць моладзі гэтых краін, што яны роўныя, у іх агульныя мэты і мары, агульнае бачанне сваёй будучыні, сваёй кар'еры, што ў гэтым свеце можна жыць дружна, мірна, у супрацоўніцтве. Былі запрошаны студэнты з Даніі, Швецыі, Польшчы, Расіі, Беларусі. Выяўляць тое, што нас аб'ядноўвае, з'яўляецца адным з прынцыпаў нашай міжнароднай дзейнасці.

— Раскажыце больш падрабязна пра валанцёрскі летнік "Сядзіба".

— Гэта праект, ажыццёўлены сумесна з Пасольствам Францыі ў Рэспубліцы Беларусь і Нацыянальнай камісіяй Рэспублікі Беларусь па справах ЮНЕСКА. Вось у гэтым праекце мы знайшлі якраз тое, што нас аб'ядноўвае з французскім народам, з французскай культурай. Мастак-экспрэсіяніст Хаім Суцін нарадзіўся ў Беларусі і тут вырас, а затым стаў сусветнавядомым французскім мастаком. У Смілавічы, дзе нарадзіўся Суцін, летась прыязджалі юныя французы як валанцёры і дапамагалі навесці парадак і ў горадзе, і на яўрэйскіх могілках, дзе пахаваны яго продкі, і на тэрыторыі палаца Ваньковіча. Вынікам з'явілася фотавыстава "Натхненне Суціна". На працягу двух тыдняў хлопцы і дзяўчаты з валанцёрскага летніка фатаграфавалі мясцовых жыхароў, прыроду, тое, што ім падабаецца, затым адабралі больш якасныя фатаграфіі, павялічылі ў фармаце і зрабілі фотавыставу. У гэтым годзе выстаўляліся і работы самога Суціна. Праект надзвычай цікавы і плённы.

А ўсяго ў нас два валанцёрскія летнікі — "Сядзіба" і "Замкі Беларусі". Валанцёры працавалі ў Мірскім замку, у сядзібе Ігната Дамейкі, у сядзібе Міхала Клеафаса Агінскага ў Залессі.

— У чым вы бачыце сёння вашу асноўную ролю як генеральнага сакратара Асацыяцыі клубаў ЮНЕСКА?

— Гэта работа з 60 клубамі. Арганізацыя не можа існаваць без сваіх актыўных, устойлівых структур. Мая задача — іх аб'ядноўваць, каб яны не замыкаліся, прыдумваць праекты, праграмы, дзякуючы якім ажыццяўляць інтэграцыю гэтых клубаў, каб была пастаянная сувязь паміж сакратарыятам і клубамі ў самых аддаленых рэгіёнах Беларусі, каб было адчуванне еднасці.

— Назавіце, калі ласка, апошнія праекты клубаў ЮНЕСКА, над якімі вы працавалі.

— Адзін з апошніх праектаў "Універсітэт правоў дзіцяці", які праводзіўся пры падтрымцы дзіцячага фонду ААН ЮНІСЕФ у Рэспубліцы Беларусь. Дзякуючы гэтаму праекту, праводзілася вучоба ва ўсіх абласцях Беларусі, ствараліся дзіцячыя мультыплікатарныя групы, у якіх нашы эксперты з горада Мінска, прафесійныя педагогі, навучалі дзяцей трэнерскаму майстэрству, давалі ім навыкі ў галіне правоў дзіцяці і іх рэалізацыі. Атрымаўшы гэтыя навыкі, дзеці актыўна працуюць са сваімі аднагодкамі, бацькамі, педагогамі, з грамадскасцю ў сваіх рэгіёнах. Гэты праект дае магчымасць сабраць разам прадстаўнікоў клубаў з розных рэгіёнаў і, акрамя навучання, абмяркоўваць праблемы, планы работы клубаў, сумеснай дзейнасці.

З кастрычніка ў нас пачаўся праект, які называецца "Школа лідэра" — праект, накіраваны на падрыхтоўку лідэраў клубаў ЮНЕСКА. Ва ўсіх абласных цэнтрах, у Мінску будзе весціся навучанне арганізацый дзейнасці, прапагандзе здаровага ладу жыцця, прафілактыкі ВІЧ-інфекцыі.

Мы актывізуем нашу дзейнасць па стварэнні клубаў ЮНЕСКА ў рэгіёнах, пацярпелых у выніку аварыі на Чарнобыльскай АЭС. З пачатку 2007 года пачынаем там інфармацыйна-асветную работу. Выбралі чатыры раёны: Чачэрскі і Брагінскі раёны Гомельскай вобласці, Столінскі — Брэсцкай вобласці, Слаўгарадскі — Магілёўскай вобласці. Гэта раёны, якія ўваходзяць у праграму CORE (супрацоўніцтва дзеля рэабілітацыі). Зараз уся грамадская работа павінна быць накіравана на тое, каб садзейнічаць развіццю гэтых рэгіёнаў, каб там працягвалася жыццё, каб мясцовае насельніцтва магло сябе забяспечваць самастойна: "чыстым" харчаваннем, каб паляпшалася эканамічнае становішча, каб ствараліся працоўныя месцы, не было праблемы з жыллём, каб усе атрымлівалі сучасную інфармацыю і навыкі па здаровай жыццядзейнасці. У нас ужо наладжаны кантакты з аддзеламі адукацыі гэтых раёнаў, якія ведаюць стратэгію нашага праекта, разлічанага на два гады.

НА ЗДЫМКАХ: Дзмітрый СУБЦЭЛЬНЫ; валанцёры і сябры клуба ЮНЕСКА "Спадчына" з Брэста.

Фота з архіва Асацыяцыі.

Швейцарскі праект: Інтэрнэт для чарнобыльцаў

25 кастрычніка Андрэ фон Графенрыд, Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Швейцарскай Канфедэрацыі, адкрыў камп'ютэрны клас у чачэрскай школе № 2. Камп'ютэрны клас быў створаны пры падтрымцы Швейцарскага ўпраўлення па развіцці і супрацоўніцтве (ШУРС) у рамках праекта "Інфармацыйна-камунікацыйныя тэхналогіі для развіцця на забруджаных радыенуклідамі тэрыторыях".

Швейцарскае ўпраўленне па развіцці і супрацоўніцтве з'яўляецца аддзяленнем Міністэрства замежных спраў Швейцарскай Канфедэрацыі, адказным за міжнароднае супрацоўніцтва. У Беларусі прадстаўлена Швейцарскім офісам па супрацоўніцтве, які быў створаны ў Мінску ў 2001 годзе.

Праект "Інфармацыйна-камунікацыйныя тэхналогіі для развіцця на забруджаных радыенуклідамі тэрыторыях" рэалізуецца ў Гомельскай вобласці з 2003 года. За гэты час 11 школ Брагінскага і Добрушскага раёнаў атрымалі не толькі камп'ютэрнае абсталяванне, але і доступ да рэсурсаў сусветнай павуціны. Паслугі Інтэрнэта таксама аплачваюцца Швейцарскімі партнёрамі. Школьнікі могуць і самі дзяліцца інфармацыяй: у рамках праекта восем школ стварылі і рэгулярна абнаўляюць свае хатнія вэб-старонкі. Настаўнікі прайшлі навучанне ў Рэспубліканскім цэнтры Інтэрнэт-адукацыі.

Мэта данага праекта — скарачэнне існуючай лічбавай няроўнасці паміж вясковымі і гарадскімі раёнамі, а таксама прадстаўленне дзецям і дарослым, якія пражываюць у чарнобыльскай зоне, магчымасці палепшыць якасць жыцця.

І насельніцтва, і мясцовыя ўлады добра прымаюць праект, прызнаючы, што ён адкрывае ім і іх дзецям новыя перспектывы. Таму ШУРС распрацоўвае шляхі пашырэння праграмы з прыцягненнем беларускіх партнёраў на раённым, абласным і рэспубліканскім узроўнях. У рамках гэтага супрацоўніцтва ажыццяўляецца абсталяванне камп'ютэрных класаў у вясковых школах Магілёўскай і Гомельскай абласцей і падключэнне іх да сеткі Інтэрнэт. Плануецца, што "Белтэлекам" падключыць школы да Інтэрнэта па тэхналогіі xDSL. Аплату бягучых расходаў за карыстанне доступам да сеткі возьме на сябе "Сувязьінфармсервіс".

Адкрыццё класа ў Чачэрску можна лічыць выхадам праекта на якасна новы ўзровень: да канца 2006 года будуць падключаны 15 школ з Краснапольскага, Чэрыкаўскага, Касцюковіцкага, Быхаўскага, Слаўгарадскага, Кармянскага, Хойніцкага, Веткаўскага, Нараўлянскага, Лоеўскага і Ельскага раёнаў.

Падрыхтавала Дзіяна ГРЫШАНАВА.

Чрезвычайный и Полномочный Посол Государства Израиль в Беларуси Зеев Бен АРЬЕ:

"УЕХАТЬ И ВЕРНУТЬСЯ"

ПУТЬ НА РОДИНУ

Я родился в большом украинском городе Харькове, в семье потомственных врачей. Причем, родители были врачами не только по образованию, но и по призваниям. Они служили высокому делу и старались, как говорится, "не влезать" ни в социально-политические, ни в еврейские темы, насколько это было возможно. Но поскольку мой дедушка был одним из самых крупных врачей города, то в 50-е годы, когда "разнарядка" по знаменитому "делу врачей-убийц" докатилась до Харькова, он, естественно, стал первым кандидатом на арест. Так и очутился в киевской тюрьме. После этого достаточно скоро последовала смерть Сталина, что спасло его. Однако несколько тюремных месяцев можно считать годами, ведь каждый день мог оказаться последним. Кстати, в октябре 2005 года в Харькове прошла мемориальная конференция, посвященная моему деду, Виктору Моисеевичу Боген-Ясному. Я на ней присутствовал и как внук, и как посол Израиля в Беларуси.

Возвращаясь в те далекие годы, хочу сказать, что я рос как обычный харьковский парнишка: играл с друзьями в футбол, покуривал тайком, ухаживал за девочками. О Государстве Израиль узнал лишь в 1967 году, после "шестидневной войны". Несколько позже встретился с небольшой группой евреев, хотевших выехать туда, от них узнал больше об Израиле и понял, почему все-таки чувствовал себя, несмотря на вроде бы нормальную жизнь, не до конца уютно в Харькове. Потому что мой дом, очевидно, был в Израиле. Вот тогда я решил присоединиться к желающим уехать из СССР. Однако осуществить такое решение было тогда совсем непросто. А моя мама, узнав об этом, сказала: "У меня уже нет сил носить передачи в тюрьму, как я носила их деду". Но тем не менее во второй половине 1971 года мне удалось репатриироваться в Израиль, и это было одним из двух судьбоносных решений в моей жизни.

Хотя к тому времени я уже получил диплом харьковского университета, и даже начал работать над диссертацией, жизнь распорядилась по-другому. Я стал сотрудничать с израильским радио, а со временем серьезно занялся журналистикой. С 1973 по 1991 год не только писал в газеты, выступал по радио и на телевидении, но и занялся художественными переводами, в основном с иврита на русский. Дело в том, что большинство репатриантов, прибывших в Израиль, овладевают ивритом "на бытовом уровне". И лишь немногие знают его настолько, чтобы наслаждаться чтением литературы на иврите. А поскольку в еврейской литературе есть много весьма достойных произведений, мне захотелось донести их до русскоязычных читателей не только Израиля, но и других стран. Несколько книг моих переводов были изданы, а когда упал "железный занавес", ко мне обратились представители разных израильских организаций с просьбой поехать в бывший СССР и рассказать там об Израиле.

ВТОРОЕ СУДЬБОНОСНОЕ РЕШЕНИЕ

После этого моя жизнь коренным образом изменилась, потому что, став за 20 лет стопроцентным израильтянином, я почувствовал, что могу говорить с людьми на понятном им языке, причем, я имею в виду не только лингвистическую сторону, но и ментальность. И хотя в бывшем Союзе за 20 лет произошли колоссальные изменения, я понимал чем люди живут, о чем думают, на что надеются. И самое главное — я встречал такое же понимание, когда говорил об Израиле. Так что мне захотелось продолжать эту работу. Ее успеху способствовало и то, что СССР развалился, и возникла необходимость открывать посольства во многих бывших его республиках. Но в израильском МИДе тогда было мало специалистов и, откровенно говоря, желающих. Поэтому был объявлен внешний конкурс на замещение дипломатических должностей, я успешно прошел его, и в 1993 году стал помощником посла в Украине. Вот так я вернулся, уже израильским дипломатом. Это и было второе судьбоносное решение. В Киеве вместе с послом Цви Магеном мы создавали буквально "с ноля" новое посольство.

Для меня это стало хоть и тяжелой, но очень хорошей школой, потому что, не будучи кадровым работником МИДа, я без достаточной подготовки был брошен в этот "котел". Наш штат в огромной Украине был небольшим, поэтому помощник посла отвечал и за административную, и за консульскую работу, за экономическое, политическое и культурное направления. К счастью, со временем от этой "многопрофильной" работы "отпочковались" 4 дипломатические должности, но сначала такая "школа" была действительно "шоковой". Ведь большинство обывателей думают, что посол и его помощник, в основном, решают важные политические вопросы на приемах, с бокалом шампанского. На самом же деле — это лишь верхушка айсберга, под которой масса черновой технической и бюрократической работы: переписка, связи с разными инстанциями (своими и страны пребывания). Но все нужно делать, и этому нужно учиться. Вот в процессе этой учебы я и участвовал в формировании отношений между Израилем и странами СНГ.

И хотя как дипломат я обязан никого не обидеть, но должен признаться, что интереснее всего мне работалось в Украине. Может быть, потому, что процессы, проходившие в этой стране в начале 90-х годов, были для меня понятнее. Я ведь попал на время становления независимой Украины, и что-то напоминало мне становление независимого Израиля: прежде всего, вопрос отношения к языку, который был таким сложным и важным в Израиле. Ведь у нас тоже были "языковые войны", потому что на каком-то этапе противостояли идиш и иврит. Дело в том, что идиш знала огромная часть населения и подавляющему большинству выходцев из Европы этот язык был удобней в роли государственного языка. Причем, надо отметить, что к идиш в Израиле отношение очень уважительное: он признается, изучается, выходят газеты на идиш. Но иврит победил в силу исторических связей национального самосознания, глубокой идеологии, сохранения исторических традиций. То же я видел в Украине, где поняли значение родного языка для объединения нации. К тому же во время моего пребывания в Украине еще не создались определенные штампы, все было живым, искались новые пути, они предлагались коммунистами и руховцами, центристами и западниками. Это было очень интересное время.

ДОРОГУ ОСИЛИТ ИДУЩИЙ

После Киева я переехал в Минск, где руководил дипмиссией, правда, в ранге временного поверенного, потом работал в Москве, где вспомнили мое журналистское прошлое и предложили должность пресс-секретаря. Хотя это вроде понижение статуса, но работа в огромной Москве была интересной: все вопросы печати, телевидения, разъяснительные мероприятия… Там было "море работы", постоянное напряжение, и даже езда на автомобиле по московским дорогам напоминала борьбу за выживание. Затем снова на три года Киев. В 1997-98 годах я окончательно перешел в МИД, поскольку до тех пор был как бы "одолжен" у журналистики.

В 2002 году вернулся в Израиль, уже в министерство, а в 2004 году снова прошел сложный конкурс на должность посла в Беларуси и выехал в Минск. Эта страна не являлась для меня "белым пятном". Во-первых, я уже руководил в ней посольством, а, во-вторых, последние два года, работая в МИДе, я тоже, выражаясь журналистским штампом, "держал руку на пульсе" израильско-белорусских отношений. Но после приезда в Беларусь ситуация несколько изменилась.

Дело в том, что в силу финансовых причин (хотя кое-кто пытается объяснить это иначе) мое государство было вынуждено закрыть посольство в Беларуси, правильность (или неправильность) этого решения обсуждать не будем. Но благодаря активности парламентского лобби во главе с депутатом Кнессета, тогда — министром транспорта, лидером партии "Наш дом — Израиль" Авигдором Либерманом деньги нашлись, и посольство возобновило свою деятельность. Хотя, к сожалению, вся налаженная инфраструктура была полностью разрушена, и пришлось начать все сначала. Потом задержки, связанные с бюджетными проблемами в Израиле. Именно поэтому решение вопроса об открытии посольства затянулось так надолго, почти на год. Все это, конечно же, наложилось на мои нынешние белорусские впечатления.

Но тем не менее я решил внести свой совсем уже личный вклад в дело сближения наших народов. Дело в том, что в каждой стране, где я работал, старался достаточно овладеть языком. Выучил и белорусский, но говорить на нем трудно, так как этому мешает… отличное знание украинского, на который невольно сбиваюсь, говоря с белорусами. Но читаю по-белорусски много и с интересом. Узнав, что не существует ни одного перевода произведений Василя Быкова на иврит, перевел несколько рассказов этого писателя и собираюсь опубликовать их в одном из толстых литературных журналов.

ПУТЬ К ЖЕЛУДКУ

Коль уж мы встречаемся "за столом", то сразу скажу: этот вопрос мне близок. Я люблю и восточную, средиземноморскую кухню, и славянскую. Между прочим, должен сделать упрек в адрес своих минских коллег, которые на приемах несколько злоупотребляют стандартной местной ресторанной кухней. Конечно, легче заказать любому ресторану обслуживание по тому меню, которое есть, но мы постарались на первом же приеме познакомить его участников и с популярными у нас "хумусом" и "тхино", причем наши сотрудники объясняли, как это едят. Ну, и фаршированная рыба-фиш подтвердила свой многовековой авторитет. Поэтому, хотя сам я не готовлю, хочу предложить читателям блюдо от моей жены — Ольги Бен Арье.

КУРИНЫЕ КРЫЛЫШКИ С ИЗРАИЛЬСКИМ СОУСОМ

Почему с израильским соусом? Потому что этот соус я придумала сама, и это было в Израиле. Возможно, этот соус уже известен под другим названием, и его кто-то готовит, но нам это неведомо, и мы называем соус "израильским", а это блюдо — фирменным блюдом нашей семьи.

На 4 порции понадобится:

1,5 кг куриных крылышек;

3 большие луковицы;

3 больших красных сладких перца;

по пучку зелени укропа, петрушки, киндзы;

250 г. кетчупа (можно взять острый, если любите);

лимон или 3 столовых ложки уксуса;

3 столовых ложки сухого красного вина;

200 г. соевого соуса для маринада.

Лучше взять соевый соус без добавок, густой консистенции, слегка сладковатый, а не соленый. Соль, немного черного молотого и красного острого перца, другие специи по вкусу. Я добавляю немного молотого кориандра, майорана, базилика, тимьяна, куркумы, сухого молотого чеснока на кончике ножа.

КРЫЛЫШКИ

Залог успеха — хороший маринад и 2-3 часа в запасе, чтобы крылышки хорошо промариновались. Для маринада смешиваем соевый соус с вином.

Промытые крылышки укладываем в миску, посыпаем специями (но не солим), поливаем маринадом, хорошо перемешиваем и оставляем на три часа. Затем замаринованные крылышки выкладываем на покрытый фольгой противень, солим, ставим в духовку, разогретую до 180 градусов. Готовим около часа.

Есть три маленьких секрета, которыми хочу поделиться. Первый: чтобы крылышки получились с хрустящей корочкой, жидкость, образующуюся при жарке, нужно сливать с противня. Второй: минут за десять до готовности крылышки обмазываем кетчупом и — снова в духовку. Теперь за ними нужно посматривать, стараться не пережарить, и, когда они зарумянятся, — сразу на стол, где у нас уже готов израильский соус и рассажены желающие подкрепиться этим блюдом. В этом третий секрет: из духовки — прямо в тарелку!

ИЗРАИЛЬСКИЙ СОУС

Лук чистим, мелко режем, заливаем уксусом и даем постоять 30 минут. Если уксус слишком резок для вас, и вы не используете его в готовке, лук можно залить соком лимона. Красный перец режем небольшими кусочками, смешиваем с мелко нарубленной зеленью и кетчупом, добавляем по вкусу специи и соль. Затем отжимаем лук, кладем его в соус и хорошо перемешиваем.

Приятного аппетита!

В гостях у посла был Юрий ВОЛОШИН.

Інтэрактыўная выстава "Мой мілы таварыш, мой лётчык"

адкрылася ў Дзяржаўным літаратурным музеі Янкі Купалы

Яна прысвечаная 70-годдзю з дня напісання верша "Хлопчык і лётчык", які аказаў значны ўплыў на пакаленне моладзі 40-50-х гадоў XX стагоддзя.

Ён быў любімым вершам першага ў свеце касманаўта, які пабываў у космасе, Юрыя Гагарына, пра што гаворыць яго аўтограф маці на аднайменнай кніжцы, прадстаўленай на выставе. Дырэктар музея Сяргей Вечар адзначыў незвычайнасць мерапрыемства, якое звязвае дзве тэмы — паэзію і авіяцыю. Упершыню вырашана выкарыстаць новую форму правядзення выставы — інтэрактыўную, каб наведвальнікі мелі магчымасць не толькі азнаёміцца з дакументамі і экспанатамі, але і патрымаць іх у руках, памераць лётную форму, адчуць сябе парашутыстамі або сапраўднымі лётчыкамі.

На выставе прадстаўлены экспанаты з фондаў музея Янкі Купалы, Нацыянальнага музея гісторыі і культуры Беларусі, Мінскага дзяржаўнага вышэйшага авіяцыйнага каледжа, 50-й авіяцыйнай базы, УП "Мінскі авіярамонтны завод", ЦПР "Золак" Заводскага раёна Мінска, з асабістых архіваў. Праект экспазіцыі распрацавалі супрацоўнікі музея. Афармленнем залы займаліся маладыя дызайнеры з Акадэміі мастацтваў.

Выстава ўмоўна падзелена на дзве часткі. Першая пераносіць наведвальнікаў у 30-я гады XX стагоддзя на дачу Янкі Купалы ў Ляўках, дзе паэт напісаў шмат дзіцячых вершаў, а таксама ў эпоху, калі авіяцыя толькі нараджалася. Другая, інтэрактыўная частка, дазволіць жадаючым бліжэй пазнаёміцца з прафесіяй лётчыка, з яе спецыфікай і тэхнічным забеспячэннем.

Па меркаванні арганізатараў, выстава дапаможа падлеткавай аўдыторыі больш глыбока асэнсаваць творчасць Янкі Купалы.

НА ЗДЫМКАХ: выставу адкрывае дырэктар музея Сяргей ВЕЧАР; на інтэрактыўнай выставе цікава ўсім.

Фота Фёдара ЧЫГАРАВА, БелТА.

Надзея ДЗЮБА:

"Скарбы нашага архіва пераконваюць: беларусы — народ унікальны"

20 ліпеня ў Беларускім дзяржаўным музеі Вялікай Айчыннай вайны ў Мінску адкрылася выстава "Місія ААН-ЮННРА ў 1946-1947 гадах". Выстава грунтуецца на дакументах Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь і расказвае пра малавядомыя старонкі першых пасляваенных гадоў — пра работу Адміністрацыі Аб'яднаных Нацый па пытаннях дапамогі і аднаўлення (UNNRA). Доўгія гады, згодна з пастановай ЦК, дзейнасць гэтай арганізацыі ў нашай краіне замоўчвалася. Аднак усе дакументы былі захаваны ў Нацыянальным архіве. Гэта выстава ўпершыню найбольш поўна распавядае пра дзейнасць ЮННРА ў Беларусі. Яна адкрывае новую старонку нашай гісторыі.

Якія яшчэ таямніцы мінулага захоўваюцца ў сценах Нацыянальнага архіва? Як працуе самы галоўны архіў краіны? Якія праекты ажыццяўляе? З гэтымі пытаннямі мы звярнуліся да загадчыцы аддзела навуковага выкарыстання дакументаў і інфармацыі Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь Надзеі Дзюбы.

— Надзея Пятроўна, раскажыце, калі ласка, якія яшчэ невядомыя раней старонкі гісторыі былі раскрыты з дапамогай дакументаў, што тут захоўваюцца?

— Я не магу сказаць, што мы нешта сенсацыйна заяўляем пра штосьці ўпершыню. З дапамогай архіўных даных мы пацвярджаем ужо вядомыя звесткі і ўзнаўляем больш поўную карціну падзей. Рыхтавалі сумесныя праекты выстаў з беларускімі музеямі да 50-годдзя асваення цалінных і абложных зямель, да 90-годдзя дзяржаўнага і партыйнага дзеяча К. Т. Мазурава, выставы "Запаведная справа ў Расіі і Беларусі", "Ёсць на карце месца..." (пра грамадскакультурную чыннасць беларускай і расійскай эміграцыі ў Чэхаславакіі ў 1921-1938 гадах), "Беларускі Пецярбург", "Беларуская вёска канца 20-х — пачатку 30-х гадоў" і іншыя.

— Чым займаецца ваш аддзел навуковага выкарыстання дакументаў і інфармацыі?

— У асноўным працуем з людзьмі, якія звяртаюцца ў Нацыянальны архіў. Выдаём звесткі пра партызанскі рух, канцэнтрацыйныя лагеры, рэпрэсіі, звесткі аб заробку, аб навучанні, розныя біяграфічныя даныя. У нас захоўваюцца таксама ўсе дакументы Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь. Акрамя таго, дапамагаем працаваць даследчыкам у чытальнай зале Нацыянальнага архіва. Сумесна з музеямі арганізоўваем выставы. Заўсёды інфармуем насельніцтва аб папаўненні архіва.

— З якімі пытаннямі да вас часцей за ўсё звяртаюцца замежныя грамадзяне?

— Да нас звяртаюцца людзі з усіх куткоў Беларусі, блізкага і далёкага замежжа. У асноўным шукаюць родных. Ці просяць звесткі аб прыналежнасці да партызан, да ваеннапалонных, шукаюць, куды былі рэпрэсіраваны, ці дзе былі расстраляны свякі. Вельмі шмат зваротаў, звязаных з эвакуацыяй ў 1939-1947 гадах беларусаў з Польшчы ў Беларусь і наадварот — палякаў у Польшчу. Просяць знайсці дакументы па гісторыі розных устаноў, сельскіх школ, вёсак. Людзі пачалі праяўляць актыўную цікавасць да гісторыі месца, дзе яны працуюць, жывуць. Мы ахвотна дапамагаем усім.

— Над якімі праектамі ў архіве працуюць замежныя навукоўцы?

— Зараз у нас займаюцца даследаваннем маскоўскія і польскія вучоныя з Варшавы і Беластока. Яны працуюць у розных напрамках. Вывучаюць гісторыю беларускага правапісу, Заходнюю Беларусь 1939 года, гісторыю польскага тэатра імя 11 ліпеня, гісторыю карыстання польскай мовай у Беларусі, гісторыю яўрэяў 20-30-х гадоў і іншае.

— Работа з дакументамі, напэўна, сфарміравала ў вас асабістае стаўленне да гісторыі нашага народа?..

— Я працую ў Нацыянальным архіве ўжо 28 гадоў, але мая цікаўнасць да гісторыі не згасае. Я дагэтуль з хваляваннем перачытваю розныя дакументы. Скарбы нашага архіва пераконваюць, што беларусы — народ унікальны.

Вера БАБРОЎНІК.

У Смаргоні ўзгадваюць падзеі Першай сусветнай вайны

У Смаргоні прайшоў адкрыты конкурс на распрацоўку эскізнага праекта мемарыяльнага ансамбля ў памяць пра абаронцаў Айчыны ў Першую сусветную вайну. Падзеі пачатку мінулага стагоддзя і цяпер добра вядомы жыхарам Смаргоні. Тут, літаральна на ўскраіне горада, праходзіла лінія расійска-германскага фронту. Невыпадкова ў Смаргоні працуе "Ваенна-гістарычны цэнтр". Уся яго дзейнасць пад кіраўніцтвам палкоўніка запасу Уладзіміра Лігуты скіравана на вывучэнне падзей Першай сусветнай вайны, ушанаванне яе герояў і ахвяр.

Да ўдзелу ў конкурсе былі дапушчаны шэсць праектаў.

— Кожны з аўтараў ведаў умовы, якія найперш цікавяць саміх смаргонцаў, — расказвае галоўны архітэктар раёна — начальнік аддзела тэрытарыяльнай планіроўкі, горадабудаўніцтва і архітэктуры Смаргонскага райвыканкама Васіль Тыцык. — Поруч з ушанаваннем падзей Першай сусветнай мы думаем і пра добраўпарадкаванне гарадскога парку, які знаходзіцца на выездзе са Смаргоні. Агульная плошча тэрыторыі аб'екта — 25 гектараў... І вось, як палічыла кампетэнтнае журы, лепшым прызнаны праект, які выкананы аўтарскім калектывам у наступным складзе: скульптар Анатоль Арцімовіч, архітэктары Андрэй Жылінскі, Сяргей Рачэўскі і дызайнер Вячаслаў Ладыневу...

Адметна, што ў складзе журы працавалі вядомыя беларускія майстры мастацтва: старшыня рэспубліканскага мастацка-экспертнага Савета па манументальным мастацтве пры Міністэрстве культуры, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР Іван Міско, старшыня Гродзенскай абласной арганізацыі Беларускага Саюза мастакоў скульптар Уладзімір Панцялееў, скульптар, Ганаровы грамадзянін Смаргоні Уладзімір Церабун, мастак, заслужаны дзеяч мастацтваў Мікалай Апёк. Яны выказалі адзінадушнае меркаванне, падкрэсліўшы ў праекце Анатоля Арцімовіча і яго паплечнікаў наяўнасць усіх складальнікаў мастацкага вырашэння няпростай тэмы.

Алесь КАРЛЮКЕВІЧ.

Навукоўцы з 12 дзяржаў Еўропы наведалі радзіму Дастаеўскіх

Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя, прысвечаная 500-годдзю Дастаеўскіх і 185-годдзю з дня нараджэння Фёдара Дастаеўскага, прайшла 5-6 кастрычніка ў раённым цэнтры Іванава Брэсцкай вобласці.

У ёй прымалі ўдзел навукоўцы з 12 дзяржаў Еўропы.

Менавіта 6 кастрычніка 1506 года заснавальнік роду, Даніла Іванавіч Рцішчаў, атрымаў грамату на ўладанне сялом Дастоева цяперашняга Іванаўскага раёна, па назве якога галіна баярскага роду Рцішчавых атрымала прозвішча Дастаеўскія. Вялікага прыбытку памесце не прыносіла, аднак продкі Фёдара Міхайлавіча валодалі ім больш за сто гадоў. У сярэдзіне XVII стагоддзя па шэрагу прычын Дастаеўскія назаўсёды пакінулі сваё родавае гняздо.

Падрыхтавала Дзіяна ГРЫШАНАВА.

Удакладненне

У № 40-41 "ГР" у матэрыяле "Кніжныя рарытэты: сувязныя стагоддзяў" дапушчана недакладнасць: замест "выданні 1501-1550 гадоў" трэба чытаць "выданні 1517-1525 гадоў".

Знаёмцеся — мой настаўнік Ігар Міхайлавіч Пракаповіч

Ігар Пракаповіч нарадзіўся 9 снежня 1960 года ў горадзе Паставы Віцебскай вобласці. У 1979 годзе паступіў на геаграфічны факультэт БДУ. Спецыялізаваўся на фізічнай геаграфіі (геамарфалогія і лімналогія). Падчас вучобы праходзіў практыку і працаваў у экспедыцыях галіновай навукова-даследчай лабараторыі азёразнаўства пры БДУ <http://www.bsu.by/> і лабараторыі вывучэння ландшафтаў інстытута геахімії і геафізікі АН Беларусі, удзельнічаў у навуковай практыцы на Кольскім паўвостраве. Пасля заканчэння універсітэта вярнуўся на радзіму, дзе працаваў настаўнікам геаграфіі, біялогіі і хімії Апідамскай школы, старшынёй Палескага сельсавета, а з 1986 года працуе настаўнікам геаграфіі і астраноміі СШ №1 горада Паставы. У 1993 годзе становіцца лаўрэатам прэміі часопіса "Маладосць", а ў 1994-м уступае ў Саюз беларускіх пісьменнікаў. У 1999 годзе закончыў (завочна) аспірантуру пры Нацыянальным інстытуце адукацыі па спецыяльнасці "агульная педагогіка". Падрыхтаваў да абароны кандыдацкую дысертацыю па тэме "Арганізацыйна-педагагічныя асновы пабудовы сістэмы краязнаўчай работы ў агульнаадукацыйнай школе". Сфера інтарэсаў: педагогіка (тэорыя і практыка); геаграфія (геамарфалогія, лімналогія, тапаніміка, ландшафтазнаўства); лакальная гісторыя (даславянская гісторыя рэгіёна, старажытныя гандлёвыя шляхі; археалагічныя помнікі; нямецкія ўмацаванні і пахаванні на лініі фронта Першай сусветнай вайны; гістарычныя мясціны Пастаўшчыны); літаратурная работа і журналістыка; бардаўская песня; калекцыяніраванне. Упершыню я ўбачыла Ігара Пракаповіча на занятках геаграфіі ў школе №1 горада Паставы, у якой раней вучылася. Праз год зразумела, што гэта не проста педагог геаграфіі і астраноміі, але Настаўнік, які не толькі змог знайсці свой шлях у жыцці, але і знайшоў дарогу да нашых дзіцячых сэрцаў. Ігар Міхайлавіч стаў сябрам для вучняў школы №1, а такія адносіны — вялікае шчасце для любога настаўніка і вучняў. Калі ёсць узаемаразуменне, то больш новых ідэй і цікавых думак.

НАСТАЎНІК ГОДА-95

"Педагогіка — гэта маё прызванне", — сцвярджае Ігар Пракаповіч".

І гэта не проста словы. За гады работы ў школе Ігар Міхайлавіч распрацаваў сістэму школьнага краязнаўства, стварыў вучэбныя праграмы "Спадчына", "Турызм-краязнаўства" і "Аэракасмічныя метады даследавання ў геаграфіі" (факультатыў), "Пастаўскі край". У 1993 годзе правёў абласны аўтарскі семінар настаўнікаў геаграфіі ў Паставах. З вучнямі школы наладзіў больш сотні краязнаўчых вандровак па Пастаўшчыне.

> *— Каб стаць асобай трэба...*
>
> *— Па-першае, чалавек павінен паважаць сябе, па-другое, развіваць свае здольнасці, а па-трэцяе, любіць іншых людзей.*
>
> **І.П.**

А 1995 год быў для І. Пракаповіча надзвычай плённым: ён стаў пераможцам абласнога і фіналістам рэспубліканскага конкурсу "Настаўнік года-95".

Разам са сваімі вучнямі Ігар Міхайлавіч напісаў тры кнігі гісторыі вёсак — "Манькавічы" ў сааўтарстве са мной і з Анастасіяй Вансовіч, "Мястэчка каля Пушчы: Груздава і ваколіцы" з Інай Собаль, "Мястэчка над возерам: Задзеўе і ваколіцы" ў сааўтарстве са мной.

ДАСЛЕДЧЫК

Ігар Міхайлавіч адкрыў тры паселішчы старажытных людзей і курганны магільнік, вылучыў і абгрунтаваў гіпотэзу пра існаванне ў старажытнасці воднага шляху праз сістэмы рэк Дзвіны, Нёмана і Нарачанскіх азёр.

У 2005 годзе на Пастаўшчыну завітаў вядомы ў Беларусі археолаг, кандыдат гістарычных навук Эдвард Зайкоўскі. Мэта яго паездкі — археалагічная разведка нашага краю. Ігар Міхайлавіч, Э. Зайкоўскі і я адправіліся на пошукі новых адкрыццяў. У план маршруту ўваходзілі возера Загацце, вёска Юнькі і Лысая гара, на якой спынюся крыху падрабязней. Лысая гара — рэспубліканскі ландшафтны геамарфалагічны заказнік. Па меркаванні вучоных, ля падножжа гары павінна было знаходзіцца пасяленне. Нягледзячы на тое, што быў пралівны дождж, наша праца не аказалася дарэмнай: мы знайшлі рэшткі гладкасценнай керамікі без арнаменту. А гэта сведчыць аб тым, што тут было пасяленне ў другой палове першага тысячагоддзя (прыблізна VI-IX стагоддзі нашай эры).

Па выніках уласных даследаванняў Ігар Пракаповіч напісаў каля 50 артыкулаў па краязнаўстве ("Даславянская гісторыя Пастаўшчыны", "Пастаўская воласць у сярэдзіне XIX стагоддзя", "Што ў назве?", "Забыты шлях" і іншыя).

Для Ігара Міхайлавіча захаванне гісторыі — гэта абавязак перад Беларуссю, яе народам, бо выхоўваючы любоў і павагу ў дзяцей да гісторыі, можна смела глядзець у будучыню.

ЛІРЫК

"Літаратура — гэта стан маёй душы. Пішу здаўна. Проза і, у большасці, паэзія — гэта магчымасць самавыказацца. Вось толькі я не ведаю, адкуль нараджаюцца мае вершы, таму веру ў Бога, анёлаў. Паэзія — гэта вышэйшая сфера, у якую, як мне здаецца, прыемна ўваходзіць, але там не заўсёды чакаюць," — дзеліцца сваімі думкамі Ігар Міхайлавіч.

Ігара Пракаповіча чакаюць усюды. Яго зборнікі паэзіі выходзяць адзін за другім: "Рэха малітваў" (1993), "Намагнічаны космас" (1996), "Шляхі наканаванага бязмежжа" (1999); "Лустка вечнасці" (2005), "Я вас каханнем растрывожу" (2005). Апошні зборнік натхніў мяне на напісанне рэцэнзіі. У творчасці паэта ўражвае перш за ўсё ўдумлівасць, некатэгарычная развазлівасць.

> *— Словы — гэта...*
>
> *— Словы — гэта крылы, на якіх разлятаюцца нашы думкі, пачуцці, жаданні. Словы вымушаюць любіць і ненавідзець, хвалявацца і супакойвацца, здзяйсняць і марыць, бо вялікая моц прытоена-схавана ў такіх звычайных і простых словах.*
>
> **І.П.**

Ігарам Міхайлавічам былі арганізаваны і праведзены літаратурныя семінары, прысвечаныя паэту-земляку Уладзіміру Дубоўку <http://postavy.euro.ru/dubouka.html>, "Даўжанскія вечары-96" і "Даўжанскія вечары-99". У 1989 годзе ён піша п'есу "Мова", у 1998 годзе — жартоўную паэму "Хірургічная адысея дзядзькі Антона", у 2004 годзе ў часопісе "Барвы" друкуюцца паэмы "Белая Панна" і "Вышкі", у 2001 годзе ў "ЛіМе" — жартоўная "Казка для сяброў". Хіба такі творчы плён не здзіўляе?

КРАЯЗНАВЕЦ

У 1986 годзе Ігар Пракаповіч стварыў пры школе турыстычны гурток, удзельнікі якога далі яму назву "Ювента", што на лацінскай мове азначае "маладосць". Гурткоўцы наладжваюць вандроўкі па роднай Пастаўшчыне.

У 1994 годзе Яўген Петракоў, удзельнік "Ювенты", стаў пераможцам рэспубліканскіх спаборніцтваў з даследчай працай "Па слядах Першай сусветнай вайны ў Пастаўскім раёне" і атрымаў "крыштальны яблык". Пасля такіх поспехаў "Ювента" стала навуковым краязнаўчым таварыствам. У выніку краязнаўчых вандровак гурткоўцы стварылі калекцыю.

Апошнія дасягненні гурткоўцаў Сяргея Громава, Алесі Кірылавай, Дзімы Гутара, Сашы Аўтушкі, Олі Пракаповіч — гэта перамога ў рэспубліканскім конкурсе на "Лепшы праект краязнаўчага паходу". Яны зрабілі грунтоўны праект маршруту, справаздачу і каляровы буклет.

Навуковае таварыства "Ювента" ахвотна падзялілася са мной сваімі праектамі на 2007 год, сярод іх — мультымедыйная прэзентацыя горада Паставы, стварэнне краязнаўчай экспазіцыі ў школьным музеі, наладжванне кантактаў з футбольным клубам "Ювентус" і іншае.

ГЕОГРАФ

Ігар Пракаповіч выдаў кнігі ў галіне краязнаўства : "Фізічная геаграфія Пастаўскага раёна"(1994), "Насельніцтва Пастаўскага краю" (2004); "Адкуль паходзяць назвы. Назвы рэк і азёр Пастаўскага раёна" (2000); "Крыжы і камяні" (2003), "Манькавічы" (2004), "Ваколіцы Паставаў" (2004), "Мястэчка каля Пушчы" (2005), "И край родной откроет тайны" (2006) і іншыя.

Сабраў і апублікаваў матэрыялы па геаграфічных назвах Афрыкі, Паўднёвай Амерыкі і Еўропы. З'яўляецца членам рэдкалегіі часопіса "Геаграфія: праблемы выкладання", а на VI з'ездзе Беларускага геаграфічнага таварыства абраны ў склад Вучонага савета.

Колькі зрабіў Ігар Пракаповіч, нават і не пералічыць. Але галоўны вынік — яго юныя паплечнікі, з якімі настаўніка яднае агульная любоў і пашана да роднай зямлі.

Ірына ЗАЯЦ.

НА ЗДЫМКАХ: Ігар ПРАКАПОВІЧ(злева) на паэтычнай імпрэзе; прывал у час паходу.

Фота аўтара.

СКАРБЫ НАЦЫІ

Нацыянальнаму акадэмічнаму народнаму аркестру Беларусі імя Жыновіча — 75 гадоў

Нацыянальнаму акадэмічнаму народнаму аркестру Беларусі імя Жыновіча — 75 гадоў. Мастацкі кіраўнік і галоўны дырыжор калектыву — народны артыст Беларусі, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі рэспублікі, рэктар Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі, прафесар Міхаіл Казінец.

Да 75-годдзя аркестра Нацыянальнае тэлебачанне і рэжысёр Валянціна Шапеткіна падрыхтавалі дзве праграмы пра калектыў. У Мінскай гарадской ратушы адбыўся запіс канцэрта аркестра, які будзе паказаны на канале ў лістападзе.

НА ЗДЫМКУ: у час запісу тэлеперадачы.

Фота Наталлі АБЛАЖЭЙ, БелТА.

ВЯЧОРКІ НА ГРОДЗЕНШЧЫНЕ

На аснове матэрыялаў, сабраных у 1999-2005 гадах супрацоўнікамі аддзела народнай творчасці Беларускага дзяржаўнага інстытута праблем культуры ў рамках праекта "Сучасны стан традыцыйнай мастацкай культуры беларусаў Гродзенскага Панямоння".

Каляндарны год у жыцці моладзі ўмоўна падзяляўся на два перыяды — зімовы і летні, што вызначала характар збораў (у хаце ці на вуліцы). Зімовы перыяд пачынаўся, у залежнасці ад мясцовых традыцый, у прамежак часу паміж Першай або Другой Прачыстай і пачаткам Піліпаўскага посту, потым пасля Каляд доўжыўся да Вялікага посту, летні працягваўся ад Благавешчання да Пятроўскага посту.

ПРАЦОЎНЫЯ ВЯЧОРКІ

Ад Пакрова да пачатку Піліпаўскага посту ў кожнай вёсцы ішла апрацоўка сабранага льну: яго сушылі, мялі, трапалі, часалі. Пралі ў буднія дні, а таксама раніцай у суботу (за выключэннем пятніцы). Але ў пятніцу можна было займацца іншымі работамі — шыць, вышываць, вязаць, плесці карункі.

З пачаткам Піліпаўскага посту жанчыны пралі кудзелю звычайна ў сваёй хаце, дзяўчаты сыходзілі з работай да сябровак. На Гродзеншчыне дзённыя зборы называлі "папрадухі (попрадкі)", "кудзялькі (кудзельніцы)", "дзянушкі", вечаровыя зборы — вячоркі (вечаркі, вечарке), вечарушкі". "Кудзельніцамі" называлі таксама дзяўчат, якія хадзілі на вячоркі. Дзяўчаты збіраліся ў кожнай з сябровак па чарзе ("сваім колам"), месца збору мянялі кожны дзень ці тыдзень. Пры такім парадку паводзіны дзяўчат былі найбольш строгімі: яны працавалі ў прысутнасці дарослых той ці іншай сям'і.

У кожнай вёсцы існавала адна ці некалькі асобных груп дзяўчат (тэрытарыяльныя і рознаўзроставыя) колькасцю да 10 чалавек. Хадзіць на вячоркі дзяўчынкі-падлеткі пачыналі дастаткова рана — з 10-12 гадоў. Зборы малодшых адрозніваліся ад вячорак старэйшых: яны працавалі часцей удзень, увечары разыходзіліся па хатах значна раней, і туды, дзе працавалі падлеткі, не наведваліся гурты хлопцаў. Пастаяннымі ўдзельніцамі вячорак дзяўчаты станавіліся ва ўзросце 15-17 гадоў. Адсутнасць дзяўчыны на вячорках гаварыла пра яе анамальныя паводзіны ці праблемы са здароўем.

Кожная несла з сабою на вячоркі прасніцу ці калаўрот, кудзелю, верацёны. "Калаўроты, козачкі" нават у сярэдзіне XX стагоддзя не былі шырока распаўсюджаны. Звычайна калаўрот мела дзяўчына-нявеста ці жанчына. Дзяўчаты ў асноўным пралі кудзелю з прасніцы на верацяно. У хаце рассаджваліся з прасніцамі па лаўках уздоўж сцен. У кожнай дзяўчыны было сваё ўлюбёнае месца, якое сяброўкі не займалі. Калі вышывалі, шылі, плялі карункі, сядалі на лавачкі ці зэдлікі пад лямпу, што вісела пасярод хаты. Колькасць напрадзеных нітак і якасць прадзення кантралявала маці ці іншыя старэйшыя жанчыны ў сям'і. Часам дзяўчына ці маладзіца, якая збірала вячоркі ў сваёй хаце, рыхтавала вячэру для "кудзельніц". Але часцей дзяўчаты частаваліся прынесенымі з сабой яблыкамі, семкамі, параным гарохам і іншым.

Прыходы хлопцаў на вячоркі былі неад'емнай часткай жыцця моладзі. На працягу дня хлопцы і дзяўчаты займаліся хатнімі справамі разам з іншымі членамі сям'і. Але ўвечары яны мелі права адасабляцца ад дарослых, збірацца разам. Па народных уяўленнях, такія ўмовы былі неабходны для выканання асноўнай сацыяльнай задачы — паспяховага пераходу ў стан дарослых, падрыхтоўцы да сямейнага жыцця. Падчас такіх сумесных вечароў завязваліся новыя адносіны паміж моладдзю, вызначаліся ўзаемныя сімпатыі. Вясковы этыкет дазваляў хлопцу падсесці да дзяўчыны "пад прасніцу", весці размову, жартаваць, абараняць ад здзеклівых жартаў іншых дзяўчат, правесці дахаты і гэтак далей.

Безумоўна, на вячорках хлопцы прыглядаліся да дзяўчат, да іх умення спрытна працаваць, характараў. Спакойныя, цярплівыя, незлаблівыя дзяўчаты карысталіся найбольшай павагай. Гульні падчас Піліпаўскага посту дазваляліся толькі ў нядзелю ці святочныя дні. Сярод іх — "У фанты", "У кальцо", "Явар", "Пасу авечкі", "У рэпу" і іншыя. Звычайна вячоркі заканчваліся ў 10-12 гадзін вечара, пра што клапаціліся старэйшыя гаспадыні хаты. Невялікі прамежак часу адводзіўся на праводзіны дзяўчыны дахаты.

У першыя тыдні Вялікага посту дзяўчаты таксама збіраліся з работай на вячоркі — дапрадалі рэшткі кудзелі, шылі. За працай спявалі "святыя" песні, што выконваюцца ў пост. У каталікаў загавіны на Вялікі пост адбываліся ў аўторак, напярэдадні Папяльцовай серады (Папялянец, Папялец). У касцёлах у знак пакаяння кзёндз пасыпаў вернікам галаву попелам, які заставаўся пасля спальвання асвячонай вярбы. Верагодна, гэта паўплывала на забаўны звычай — у першы вечар посту хлопцы сыпалі дзяўчатам у кудзелю попел. У 1950-я гады моладзь яшчэ збіралася на вячоркі, але работа ўжо не была асноўным заняткам дзяўчат. Такія зборы хутчэй былі для моладзі сродкам бавіць час.

СВЯТОЧНЫЯ ВЯЧОРКІ

Святочныя калядныя і масленічныя вячоркі раздзелены невялікім прамежкам часу, але раўназначныя па ступені весялосці і масавасці — групы моладзі, сабраўшыся ў найбольш прасторнай хаце, ладзілі танцы, гульні, застоллі, спявалі песні.

Калядныя вячоркі адбываліся на Раждаство, на Васілія (Новы год), на Вадохрышча, у нядзелю. "На Новы год ноймуць музыканта і гуляюць, п'юць, танцуюць. Усе разам хадзілі і калядавалі, на гурты распрэдзелімся і ходзім, накалядуем, а тады гуляем". Пасля Каляд пачынаўся час вяселляў: да пачатку Вялікага посту, у Мясаед, заключалася значная частка шлюбаў.

Арганізатарамі святочных вечароў на Гродзеншчыне былі выключна хлопцы: яны выбіралі хату, запрашалі дзяўчат, музыкаў, аплочвалі іх ігру, распараджаліся чарговасцю танцаў. Выключэнне складаюць вячоркі на "Валоссе" (Масленіца), калі дзяўчаты збіраліся ў адной з хат, рыхтавалі вячэру і запрашалі да сябе хлопцаў. На Масленічным тыдні, пачынаючы з чацвярга і да загавін, моладзь ладзіла вячоркі з танцамі, гульнямі, святочным застоллем. "Танцавалі на Валоссе, збіраліся ў хаце, хто пазволіць, у каго велька была хата, а хлопцы харашэ надта спявалі. ... Гулялі у чацвер, а ў пятніцу і суботу ўжэ не гулялі, а потым у нядзелю гулялі і ў аўторак".

Музыкам за ігру плацілі звычайна зернем, яйкамі, хлебам, бульбай, зрэдку грашыма. Увосень хлопцы маглі зарабіць грошы, дапамагаючы суседзям, у Каляды амаль усё сабранае ішло на частаванне і плату музыкам. Наймаць музыкаў і заплаціць ім было справай хлопцаў, дзяўчаты па чарзе частавалі музыкаў вячэрай. З дазволу старэйшых на вячоркі збіраліся ў найбольш прасторнай хаце. Хлопцы абавязкова запрашалі дзяўчат, якія самастойна на гулянне не прыходзілі.

Уменне добра танцаваць надавала хлопцу ці дзяўчыне аўтарытэт і дадатковую прывабнасць. Таму навучыцца імкнуліся з дзяцінства. Улетку, калі моладзь ладзіла танцы на вуліцы, дзецям не забаранялася прысутнічаць на іх — на свае вочы можна ўбачыць, як добра танцуюць старэйшыя, якія самі маглі павучыць іх. Увосень і ўзімку, калі малодшых не дапускалі ў хаты, дзе танцавала моладзь, дзеці і падлеткі збіраліся сваім гуртам і ладзілі ўласныя танцы. Танцавальныя мелодыі напявалі ці наігрывалі на грэбні. Хлопчыкі на вёсцы змалку ўмелі граць на музычных інструментах, таму і ў малодшых часам былі "свае" музыкі.

Паколькі на Гродзеншчыне наймалі музыкаў і плацілі ім хлопцы, дзяўчына не магла адмовіць хлопцу, які запрасіў яе на танец, бо гэта лічылася вялікай абразай. У такім выпадку хлопец даваў каманду музыкам, і дзяўчыну дэманстратыўна выправаджвалі з хаты пад марш на вачах у прысутных. Вярнуцца ў хату ў гэты вечар яна не мела права. Толькі ў адным выпадку дзяўчына магла без пакарання адмовіць хлопцу ў запрашэнні на танец — калі той быў занадта нецвярозы, але такія выпадкі былі даволі рэдкія. Пазбавіцца ад надакучлівага кавалера ці пазбегнуць выправаджвання пад марш магла дзяўчына, за якую заступаліся браты ці сябры.

Але былі і надзвычай добра арганізаваныя вечары, куды запрашалі вялікі калектыў музыкаў, быў старэйшы ("дэлегат"), які распараджаўся чаргаваннем танцаў, наглядаў за парадкам. Правілы паводзін дыктавалі бясспрэчнае падпарадкаванне старэйшаму, тым больш, што гэта звычайна быў паважаны і аўтарытэтны чалавек. На такіх добра арганізаваных вечарынах дзяўчына, якая адмовіла хлопцу, не падвяргалася пакаранню ці асуджэнню.

Дарослыя, акрамя гаспадароў хаты, звычайна не прысутнічалі на вячорках, але на кароткі час маглі прыйсці у хату, дзе ладзіліся танцы.

Успаміны пра восеньскія і калядныя вячоркі — адны з самых яркіх і настальгічных у жыхароў старэйшага пакалення. Параўноўваючы час мінулы і сучасны, яны адзначаюць, што такой весялосці на вёсцы больш няма. Канчаткова разбурэнню строгай сістэмы працоўных і святочных вячорак, правілаў паводзін на іх, збядненню зносін паміж моладдзю паспрыяла масавае стварэнне сельскіх клубаў, Дамоў культуры з сярэдзіны XX стагоддзя.

Ірына СМІРНОВА,
старшы навуковы супрацоўнік Белдзяржінстытута праблем культуры.

Урокі Дзеда Усёведа

Прывітанне, мае дарагія хлопчыкі і дзяўчынкі! Сёння прапаную вам урок: ПАДАРОЖЖА ПА ГРОДЗЕНСКАЙ ВОБЛАСЦІ БЕЛАРУСІ. Паглядзіце па карце, з якіх раёнаў складаецца Гродзенская вобласць. Можа вашы родныя з гэтых мясцін?

ПЕРШЫ ПРЫПЫНАК — СЛОЎНІКАВЫ

Цікаўнасць — любознательность, пытливость, любопытство.

Вартыя (заслугоўваюць) увагі — достойны (заслуживают) внимания.

Ахайны, дагледжаны, чысты, акуратны — аккуратный, чистый.

Сучасны, тагачасны, мадэрновы — современный.

Зваротная дарога (шлях), дарога назад — обратный путь.

Імкнуцца — стремиться.

Парушаць — нарушать.

Наталіць, задаволіць, заспакоіць (патрэбы, жаданні і гэтак далей) — удовлетворить.

Устрывожыць — встревожить.

Дзівіцца, здзіўляцца — удивляться.

Адраджаць, аднаўляць — возрождать, обновлять.

Пачаставаць, пачаставацца — угостить, угоститься.

Пакараць, заваёўваць — покорять.

Трапіць, папасці — попасть.

Прагна — с большой охотой, желанием.

Непрыкметна, незаўважна, няўзнакі — незаметно.

Нязмерна — неизмеримо.

ДРУГІ ПРЫПЫНАК — ДЛЯ ДАПЫТЛІВЫХ

Гродзенская вобласць знаходзіцца на захадзе Беларусі.

Плошча — 25 тысяч квадратных кіламетраў.

Найбуйнейшая рака вобласці — Нёман з прытокамі Бярэзіна, Гаўя, Дзітва, Котра, Уша, Сэрвач, Моўчадзь, Шчара, Зальвянка (на ёй Зальвянскае вадасховішча), Рось, Свіслач і іншыя. Азёр мала, найбуйнейшыя — Белае, Берштаўскае. На тэрыторыі вобласці знаходзяцца часткі Нацыянальнага парку "Белавежская пушча" і Налібоцкага паляўнічага заказніка, гідралагічны заказнік Дзікае, ландшафтныя — Свіцязянскі і Азёры, батанічныя — Гожаўскі, Парэцкі, Сапоцкінскі, Слонімскі, два заказнікі-журавіннікі.

Абласны цэнтр — горад Гродна. Паводле археалагічных даследаванняў, горад узнік у канцы IX стагоддзя на балцкай тэрыторыі як умацаваны пункт і цэнтр каланізацыі дрыгавічоў і валынян на так званай Замкавай гары пры ўпадзенні ракі Горадня (Гараднічанка) у Нёман. Упершыню ўпамінаецца ў летапісах пад 1127 годам. Да сярэдзіны XVI стагоддзя вядомы ў крыніцах як Гарадзен (Городень).

Найбуйнейшыя гарады вобласці — Гродна, Ліда, Слонім, Ваўкавыск, Смаргонь, Навагрудак.

У вобласці найбольш развітымі галінамі **прамысловасці** з'яўляюцца: паліўная, хімічная, машына будаўнічая і метала-апрацоўчая, будаўнічых матэрыялаў, харчовая, дрэваапрацоўчая, лёгкая.

Па вытворчасці цэменту (аб'яднанне "Ваўкавыскцэментнашыфер") вобласць займае другое месца ў рэспубліцы.

Самае буйное прадпрыемства дрэваапрацоўчай прамысловасці — ВА "Мастоўдрэў", харчовай — цукравы камбінат у Скідзелі, шкляной — шклозавод "Нёман" у Бярозаўцы.

У вобласці **шмат славутасцяў**. Вось дзе сапраўды можна наталіць сваю цікаўнасць да гістарычнай спадчыны! У адным толькі Гродне можна наведаць Гродзенскі гісторыка-археалагічны запаведнік, у склад якога ўваходзіць Стары замак (XI-XIX стагоддзі), касцёлы і кляштары бернардзінцаў, брыгітак, францысканцаў, езуітаў, Гродзенскі манастыр базыльянак, Гродзенскі каралеўскі палац Гарадніца, Уладзімірскую царкву, Каложскую (Свята-Барыса-Глебскую) царкву (пабудавана ў другой палове XII стагоддзя з цэглы), сінагогу. Вартыя ўвагі турыстаў Лідскі замак, Навагрудскія замкі, Шчорсаўскі палацава-паркавы комплекс і іншае.

ТРЭЦІ ПРЫПЫНАК — ВІКТАРЫНА

Які буйнейшы на тэрыторыі рэспублікі фестываль мастацтва традыцыйна праходзіць у Гродне?

(Усебеларускі фестываль нацыянальных культур).

Якія знакамітыя асобы паходзяць з Гродзеншчыны і што вы пра іх ведаеце?

(Друкар і кнігавыдавец XVI стагоддзя Я. Карцан, пісьменнікі, паэты Э. Ажэшка, З. Верас, Д. Бічэль-Загнетава, М. Быш, Я. Быліна, П. Граніт, А. Абінец, А. Пажко, мастак І. Пушкоў, кампазітары К. Горскі, А. Шыдлоўскі, спявачка Г. Радзько і іншыя).

Які быў першы пастаянны тэатр у Гродне, што вы пра яго ведаеце. Якія тэатры ў Гродне існуюць зараз?

(Першы пастаянны тэатр — Гродзенскі тэатр Дэшнер, існаваў у 1802-1809 гадах. Арганізатар — польская актрыса Саламея Дэшнер. Зараз у Гродне ёсць Гродзенскі абласны драматычны тэатр, Гродзенскі абласны тэатр лялек).

На гэтым я заканчваю свой урок. Да новых сустрэч!

Ваш Дзед Усёвед.

Падрыхтавала Святлана КАРПУЧОК.

Крыжаванка ад Лявонція Целеша

ПА ГАРЫЗАНТАЛІ:

1. ...на Парнасе". Ананімная паэма, якая ўпершыню выйшла ў Гродне ў 1896 годзе. 4. Горад у Францыі, пабрацім Гродна. 11. Частка свету. 12. Выраб, прызначаны для курэння тытуню. 13. Геолаг, удзельнік вызваленчага руху ў Беларусі. Даследчык Чылі. Яго імем названы хрыбет у Андах, устаноўлены помнік у Сант'яга. Ураджэнец Карэліцкага раёна. 16. Рака, левы прыток Нёмана. 17. Мужчынскае імя. 18. Магдэбургскае ... . Статус, прывілеі гарадоў і іх насельнікаў у ВКЛ. Горад Гродна атрымаў у 1391 годзе. 21 Назва фабрыкі трыкатажных вырабаў у Гродне. 22. Шум, грукат (разм.). 23. Вялікі князь ВКЛ, сын Міндоўга, князь наваградскі ў 1254-м, 1258-1963 гадах. 25. Цэнтр памежнага з Польшчай адміністрацыйнага раёна. 26. Ансамбль з дзевяці выканаўцаў. 27. Сукупнасць узброеных сіл дзяржавы. 28. Помнік беларускай абарончай архітэктуры ў Смаргоні, якому больш за паўтысячагоддзя. 33. Вёска ў Смаргонскім раёне, дзе знаходзіцца сядзібны мемарыял Ф. Багушэвіча. 35. Вядомая беларуская польскамоўная пісьменніца, аўтар раманаў "Над Нёманам", "Аргонаўты" і іншых. Ураджэнка Гродзеншчыны. 36. Выдатны філолаг-славіст, этнограф, фалькларыст, палеограф. Галоўнае ў яго навуковай спадчыне — трохтомная праца "Беларусы". Ураджэнец Гродненскага раёна. 37. Сярэдневяковы палац і крэпасць. На Гродзеншчыне існавалі з сівой даўніны ў Гродне, Лідзе, Навагрудку, Міры і іншых. 38. Дзень хрысціянскага заступніка Уласа, які ў народзе лічыўся заступнікам хатняй жывёлы. Адзначаўся 11 лютага па старым стылі.



ПА ВЕРТЫКАЛІ:

2. Назва буйнога Гродзенскага вытворчага аб'яднання. 3. Дзяржанне ў прыладах працы. 5. Рака ў Іўеўскім раёне. 6. Вёска ў Шчучынскім раёне, на беразе Нёмана. Упершыню ўпамінаецца ў Літоўскай метрыцы як маёнтак Арлея, уласнасць Ю. Сташэўскага. 7. Вядомы мастак, прадстаўнік беларускай дыяспары ў Латвіі. Аўтар партрэтаў Я. Купалы, А. Мальдзіса... Складальнік кнігі "Мінск на старых паштоўках". Ураджэнец Гродзеншчыны. 8. Жыхарка аднаго з гарадоў Гродзеншчыны. 9. Вядомы польскі пісьменнік. За раман "Мужыкі" быў узнагароджаны Нобелеўскай прэміяй. Часта быў у Гродне, наведваў Э. Ажэшку. 10. Чорная... . Рака ў Гродзенскім раёне, левы прыток Нёмана. 14. Гісторыка-этнаграфічны рэгіён, у які ўваходзіць Гродзенская вобласць. 15. Назва Лідскага вытворчага аб'яднання, прадукцыя якога карыстаецца вялікім попытам. 19. Усходняя, узвышаная частка хрысціянскага храма. 20. Украінскі дзяржаўны дзеяч з беларускага, шляхецкага роду герба "Навіна". Аўтар першай украінскай канстытуцыі. Ураджэнец былога Ашмянскага павета. У гонар яго імя названы аэрапорт у Парыжы. 24. Невялікая рыба, народная назва ўстынка. Сустракаецца ў рэках басейна Нёмана. 25. Возера ў Навагрудскім раёне. 26. Назва вядомага шклозавода ў пасёлку Бярозаўка Лідскага раёна. 29. Рускі этнограф, ваенны картограф XIX стагоддзя. Найбольш каштоўныя яго этнаграфічныя карты Беларусі. 30. Пралётная і пералётная птушка, селіцца каля вадаёмаў, корміцца рыбай. Сустракаецца на Гродзеншчыне. Занесена ў Чырвоную кнігу Беларусі. 31. Вядомы беларускі пісьменнік. Доўгі час жыў і працаваў у Гродне. Тут ім напісаны творы "Альпійская балада", "Абеліск", "Круглянскі мост" і іншыя. 32. Горная асадкавая парода чырвонага, зялёнага, або шэрага колеру. 34. Вузенькая палоска скуры, якую краўцы закладвалі ў шво кажуха, рукавіцы.

АДКАЗЫ НА КРЫЖАВАНКУ

ПА ГАРЫЗАНТАЛІ:

1. Тарас. 4. Лімож. 11. Еўропа. 12. Люлька. 13. Дамейка. 16. Шчара. 17 Антон. 18. Права. 21. "Васілька". 22. Тарарам. 23. Войшалк. 25. Свіслач. 26. Нанет. 27. Армія. 28. Сабор. 33. Кушляны. 35. Ажэшка. 36. Карскі. 37. Замак. 38. Аўпас.

ПА ВЕРТЫКАЛІ:

2. Азот. 3. Асада. 5. Ісліч. 6. Орля. 7. Целеш. 8. Ашмянка. 9. Раймонт. 10. Ганча. 14. Панямонне. 15. Лакафарба. 19. Алтар. 20. Орлік. 24. Корушка. 25. Свіцязь. 26. Нёман. 29. Рыціх. 30. Скапа. 31. Быкаў. 32. Яшма. 34. Ірша.

На дабранач дзецям

Як асёл спяваць перастаў

Італьянская народная казка

Калісьці было так, што асёл спяваў тэнарам лепей, чымсьці хто іншы. Аднойчы ўсе звяры сабраліся на раду. І леў, які быў царом усіх звяроў, спытаў:

— Хто з вас самы прыгожы?

— Я, йа! — адразу ж закрычаў асёл.

— Добра, ты самы прыгожы. А хто самы дужы?

— Я, йа, йа! — закрычаў асёл хутчэй за ўсіх звяроў.

— Малайчына, — сказаў цар звяроў. — А хто сярод вас самы дурны?

— Я, йа, йа! — навыперадкі зароў асёл, спужаўшыся, каб яго часам які са звяроў не апярэдзіў. Усе звяры так і пакаціліся з рогату, а бедалага асёл ад сораму страціў свой прыгожы голас.

З тае пары ён толькі і ўмее: "Я, йа, йа"...

Пераклад з італьянскай мовы Петруся КАПЧЫКА (Украіна).

"АРТ-КРОК" — пяты крок

У галерэі Нацыянальнай бібліятэкі "Лабірынт" адкрылася выстава "АРТ-КРОК". Гэта пятая па ліку выстава, якая ладзіцца сябрамі Міжнароднай гільдыі жывапісцаў.

Штогод менавіта яны і вызначаюць удзельнікаў выстаў гэтага творчага аб'яднання. Умова ўдзелу ў праекце — мастак прадстаўляе па сваім выбары да трох работ за апошні год, якія раней не выстаўляліся. Гэта, на думку арганізатараў, дае магчымасць зацікаўленаму гледачу ўбачыць на выставе пэўны зрэз беларускага жывапісу, зразумець і выявіць некаторыя тэндэнцыі яго развіцця. Выстава паказвае даволі стракатую палітру сучаснага беларускага мастацтва. Тут прадстаўлены жывапісныя творы, акварэль, мастацкае фота самых розных напрамкаў і стыляў: ад абстрактных да акадэмічных работ.

Мастак Фёдар Ястраб, загадчык аддзела галерэйнай дзейнасці Нацыянальнай бібліятэкі, кажа на гэты конт: "Постмадэрнісцкі дух сучаснага мастацтва не прымае нейкі адзін стыль, скажам, рамантызм ці рэалізм. Ён сцвярджае, што кожны мастак мае права, а зрэшты і абавязак стварыць глыбока індывідуальны, арыгінальны і непаўторны ўласны стыль. Тым не менш гэта не перашкаджае беларускім мастакам актыўна засвойваць вопыт многіх пакаленняў майстроў самых розных школ і напрамкаў".

Самыя розныя мастакі кажуць, што непаўторнасць, самабытнасць творцы непасрэдна звязана з яго нацыянальнай адметнасцю. Тым не менш зараз глабальныя працэсы закранаюць асновы грамадства. Ф. Ястраб працягвае: "Сучасныя тэхналогіі, Інтэрнэт, сістэма масавых камунікацый, якая імкліва развіваецца, безумоўна, уплываюць на сучасныя формы мастацтва і не заўсёды станоўча. У многім страчваецца самабытнасць мясцовых школ, нівеліруецца індывідуальнасць. Гледзячы на абстрактныя палотны ці інсталяцыю, не заўсёды можна сказаць, хто аўтар — немец, кітаец або японец. Да гонару беларускіх мастакоў, беларускае мастацтва, засвойваючы здабыткі сусветнай мастацкай культуры, не губляе сваіх нацыянальных прыкмет і самабытнасці. Аб гэтым яскрава сведчаць шматлікія творы на прадстаўленай экспазіцыі. Цікавыя мастакі са сваім почыркам і асабістым тварам".

Дарэчы, мастацкае фота ў агульнай экспазіцыі — адлюстраванне канцэпцыі арганізатараў, якія лічаць, што яно з'яўляецца паўнапраўнай часткай выяўленчага мастацтва. Старшыня аб'яднання "Фотамастацтва" Іван Пятровіч заўважыў: "Беларускае фотамастацтва мае высокі ўзровень. Часам аўтары вядомы за мяжой, а пра іх нічога не ведаюць дома ў Беларусі. Мы спадзяёмся, што нашы агульныя праекты дадуць магчымасць гледачу ацаніць беларускіх фотамайстроў".

Фёдар Ястраб падкрэсліў, што, дзякуючы сённяшнім магчымасцям Нацыянальнай бібліятэкі, беларускія творцы атрымалі штуршок да развіцця. Тут ёсць і месца, і спецыялісты для ажыццяўлення розных праектаў, імпрэз. Тут адбываюцца і будуць адбывацца не камерцыйныя, а іміджавыя выставы.

Нацыянальная бібліятэка становіцца не толькі адукацыйным цэнтрам, але і значным мастацкім асяродкам, дзе актыўна экспануюцца творы сучаснага мастацтва. Вядома, што мастацкі асяродак Беларусі мае патрэбу ў выставачных плошчах. І бібліятэка становіцца сапраўднай знаходкай у гэтым сэнсе. Нават калі ў Нацыянальнай бібліятэцы не было такіх выставачных магчымасцяў, тут ладзіліся цікавыя жывапісныя, фатаграфічныя выставачныя праекты. Цяпер жа, як кажуць, і сам Бог загадаў. Радуецца вока ад дастойнага эстэтычнага выгляду галерэй, а іх тут на розных паверхах чатыры, ад стыльнага дызайну, якаснага асвятлення, што вельмі важна для экспанавання твораў мастацтва. Галоўнае ж — у бібліятэку заўсёды прыходзіць глядач. Гэта і шматлікія чытачы, і экскурсанты, і прадстаўнікі дэлегацый, якія наведваюць бібліятэку. Такім чынам усё больш людзей адкрываюць для сябе беларускае мастацтва.

Алена СПАСЮК.

НА ЗДЫМКАХ: на адкрыцці выставы.
Фота Кацярыны САВІЦКАЙ.

Мастак поўдня

Прыемна рабіць адкрыцці. Рыхтую сваю персанальную выставу ў Адэсе і даведваюся, што ў гэты час у мастацкім музеі праходзіць выстава мастака М. Шалюты, да стагоддзя з дня нараджэння. Іду на выставу, чытаю даведку, аказваецца: ён наш, беларус, ды яшчэ з Гомельшчыны, як і я.

Мікалай Андрэевіч нарадзіўся ў вёсцы Глухаўка 22 лютага 1906 года. У сям'і было адзінаццаць дзяцей. Па магчымасці бацькі, як маглі, дапамагалі дзецям атрымаць веды. І Мікола навучаўся ў гімназіі. Хлапчуку лёгка даваліся матэматыка, алгебра і геаметрыя.

Калі яму падарылі каробку акварэлі, Мікола так добра намаляваў чырвонец, што яго прынялі ў вясковай краме ў аплату за цукеркі. Падробка грошай у той час каралася сурова, і, каб далей ад граху, на сямейным савеце вырашылі адправіць Міколу да старэйшай сястры ў Новасібірск. Там палічылі: калі хлопчык добра малюе, то яму трэба вучыцца на мастака.

Гісторыя з фальшыўкай усё ж выявілася праз шмат гадоў, і М. Шалюта правёў некалькі дзён у Адэскай турме. Адтуль яго вызваляў вядомы мастак і яго настаўнік прафесар П. Валакідзін.

З 1925 па 1931 гады М. Шалюта вучыўся ў Адэскім мастацкім вучылішчы. Першыя творы — "Партрэт мужчыны", "Партрэт жонкі", "Аўтапартрэт" — маюць абагульненні, стрыманы каларыт у карычнева-вохрыстай гаме, у іх дамінуе малюнак, які падпарадкоўвае сабе жывапіс. Бачны ўплыў украінскага авангарда 20-х гадоў.

У час афіцыёзу 30-х гадоў мастак пераходзіць да жывапісу на пленэры. На мой погляд, погляд сучасніка, характэрным творам таго перыяду з'яўляецца невялікая праца "Парус", дзе на цёмным фоне вады і неба выдзяляецца светлы трохкутнік. Ён, здаецца, павіс у густой прасторы сіняга колеру, дзе адчуваецца трывога.

У гэты час пішуцца невялікія па памерах творы інтымнага характару "Горка", "Лодкі", "Возера". Пленэр дазваляе зберагчы мастаку душу і застацца самім сабой. У 1936 годзе ён упершыню выстаўляецца на рэспубліканскай выставе.

Ужо будучы мастаком, М. Шалюта працаваў сталяром, тэхнікам сцэны, настаўнікам матэматыкі. Нягледзячы на занятасць, шмат маляваў. Да Мікалая Андрэевіча адносіліся з павагай.

На вайну пайшоў добраахвотнікам. На Каўказе, дзе ён знаходзіўся, загінуў амаль увесь узвод. Яго вылечылі хінай, але Мікалай часова страціў зрок.

Пасля вайны мастак вяртаецца да пленэрнага жывапісу "Пляж пасля вайны", "Ускраіна Адэсы", "Рыбная гавань" — працы пішуцца ў адзін прыём. На працягу трыццаці гадоў — з 1937 па 1967 — М. Шалюта выкладаў малюнак і жывапіс у Адэскім мастацкім вучылішчы. Ён быў выкладчыкам па прызванні. Мікалай Андрэевіч лічыў, што навокал — надзвычай таленавітыя людзі. У яго майстэрні збіралася моладзь і сталыя, вядомыя мастакі. Пасярод майстэрні стаяў сталярны станок, рамы для сваіх твораў мастак заўсёды рабіў сам. Ён з дзіцячых гадоў асвоіў цяслярскую справу.

У 50-я гады М. Шалюта піша Крым: як эцюды, так і вялікія палотны "Крым. Мядзведзь-гара", "Від на Аю Даг", "Вясна ў Крыме". Гэтымі творамі мастак вызначыўся як майстар.

Мастацтвазнавец Вольга Савіцкая сказала пра творчасць М. Шалюты: "Мастак і асяроддзе быццам дыхалі адным рытмам, былі кампліментарныя, "любілі адзін аднаго". Так нарадзілася мастацтва дзіўнай гармоніі, ласкавага пэндзля і тонкіх адносін. Ва ўсіх творах паветра пранізана сонечным святлом, вібрыруе. Мастак з майстэрствам перадае розныя настроі ў прыродзе. На першы погляд усё так проста, што не адразу разумееш узровень майстэрства.

Мікалай Андрэевіч — заслужаны дзеяч мастацтваў Украіны. Быў старшынёй мастацкага фонду, членам рэспубліканскага праўлення Саюза мастакоў, дэлегатам некалькіх Усесаюзных з'ездаў саюза. Узнагароджаны ордэнам "Знак Пашаны", медалямі.

Як расказала ўнучка М. Шалюты мастачка Ганна Літвіненка, з-за малой выставачнай плошчы вялікая колькасць прац мастака засталася непрадстаўленай. Але мы ўбачылі раннія малюнкі, акварэль і жывапіс, што дае добрае ўяўленне аб творчасці М. Шалюты.

Мікалай Шалюта належыць да пакалення мастакоў, якія прадоўжылі традыцыі жывапісу, закладзеныя членамі Таварыства паўднёварускіх мастакоў на рубяжы XIX-XX стагоддзяў.

Вячаслаў ІГНАЦЕНКА, мастак.
Адэса, Украіна.

Леанід ДРОБАЎ:

"Мне хочацца перадаць прыроду праз "момант"

У фае Нацыянальнага мастацкага музея адкрылася выстава мастака-мастацтвазнаўцы, доктара мастацтвазнаўства, прафесара, лаўрэата Дзяржаўнай прэміі Леаніда Дробава, якая прысвечана 80-годдзю з дня яго нараджэння (6.08. 1926 — 7.07. 2002).

Нарадзіўся Леанід Міканоравіч у вёсцы Растаў Гомельскай вобласці. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Вучыўся ў мінскім педтэхнікуме імя Н. К. Крупскай (1941), мінскім мастацкім вучылішчы (1956), на факультэце журналістыкі БДУ (1958), на мастацкім факультэце Беларускага Дзяржаўнага тэатральна-мастацкага інстытута (1965), у аспірантуры ІМЭФ АН БССР (1961). З 1964-га — сябар БСМ.

Экспазіцыя складаецца з двух частак: манаграфіі, навуковыя выданні і мастацкія творы. Глядач можа ўбачыць увесь арсенал асабістага навуковага ўкладу Дробава — канцэпцыю нацыянальнай спадчыны беларускага мастацтва, якая заключаецца ў тым, што аўтар вызначыў кола мастакоў XIX — пачатку XX стагоддзя, якія з'яўляюцца выхадцамі з Беларусі і ўнеслі свой уклад у нашу культуру, не адмаўляючы таго ўкладу, які яны ўнеслі ў рускае, польскае, літоўскае, яўрэйскае мастацтва. Вывучаў творчыя біяграфіі С. Богуш-Сестранцэвіча, В. Ваньковіча, І. Дамеля, В. Бялыніцкага-Бірулі, Н. Орды, І. Хруцкага, Ю. Пэна і іншых. Навуковы набытак прадстаўляюць манаграфіі "Беларускія мастакі XIX стагоддзя" (1971), "Жывапіс Беларусі XIX — пачатку XX стагоддзя" (1974), "Жывапіс Савецкай Беларусі" (1979), "Сучасны беларускі партрэт" (1983), "Графіка XIX — пачатку XX стагоддзя." (2000). Дробаў — аўтар публікацый пра творчыя шляхі А. Бархаткова, А. Курачкіна, А. Мазалёва, А. Шаўчынкі, А. Шыбнёва і іншых. Пад навуковым кіраўніцтвам Дробава ўбачыла свет шасцітомная "Гісторыя беларускага мастацтва" (1987 — 1994), за актыўны ўдзел у якой яму была прысуджана Дзяржаўная прэмія Беларусі (1996). За ўдзел у напісанні раздзелаў па беларускім мастацтве для "Гісторыі мастацтваў народаў СССР" быў узнагароджаны залатым медалём Акадэміі мастацтваў СССР (1982).

Экспазіцыя пад назвай "Прасторы роднага краю" ўключае творы 1970-90-х гадоў. Пейзажы лірычнага і гістарычнага жанраў прадстаўляюць матывы любімых пор года — вясны і восені, мясціны творчага натхнення Янкі Купалы — Ляўкі, матывы роднай Рудабелыччыны, авеянай баявой партызанскай славай, узбярэжжаў Крыма, у прыватнасці, Гурзуф, які ў свой час наведвалі А. Міцкевіч, В. Ваньковіч, А. Пушкін. Характэрнай асаблівасцю творчай манеры з'яўляецца рэалістычнае ўвасабленне бачанага ва ўзвышанапаэтычным настроі, калі цябе апаноўвае пачуццё непаўторнасці і каштоўнасці быцця. Пейзажныя матывы "Перад навальніцай" (1984), "Ветраны дзень" (1992), "Зімовы пейзаж" (1992), "Збожжа паспела" (1992), "Дарога на Парэчча" (1992), "Вясной павеяла" (1994) нясуць у сабе складаны сінтэтычны сплаў рэалістычных і сімвалічных вобразаў. "Я — рэаліст, можна сказаць, пішу Беларусь у карцінах прыроды. Мне хочацца перадаць прыроду праз "момант", і я спрабую гэта рабіць", — кажа мастак. Гурбы снегу, рэкі, дрэвы атаясамліваюцца з прыроднымі праблемамі стыхійнага жыцця, з перажываннямі, лёсамі людзей, пакаленняў, гістарычнымі асацыяцыямі. У жанры нацюрморта жывапісцу ўдалося дасягнуць выдатных каларыстычных здабыткаў. Белыя ружы, бэз, шматлікія палявыя кветкі ўтвараюць таямнічы свет, які аб'ядноўвае з неабсяжнай духоўнай прасторай роднай зямлі, звязвае з вялікімі традыцыямі еўрапейскага жывапісу.



Леанід Міканоравіч Дробаў быў удзячны сваёй малой радзіме, якая дала яму шлях у жыццё, і паклапаціўся аб тым, каб яго творы трапілі на Бацькаўшчыну. У ліку першых перадаў свае творы ў карцінную галерэю гарадскога пасёлка Акцябрскі Гомельскай вобласці, якая з 2002 года носіць яго імя. Спадчына выдатнага дзеяча культуры з'яўляецца вялікім узорам і каштоўнай крыніцай для маральнага, эстэтычнага і духоўнага развіцця.

Людміла НАЛІВАЙКА.

Зубры Налібоцкай пушчы

Налібоцкая пушча ў чарговы раз стала месцам правядзення унікальнага эксперымента. Рашэннем Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь у 2005 годзе частка аднаго са старажытных еўрапейскіх лясных масіваў стала Дзяржаўным ландшафтным заказнікам "Налібоцкі" на агульнай плошчы ў 77,5 тысячы гектараў, часткова ў межах сярэдневяковай пушчы ВКЛ,часоў князя Вітаўта — на тэрыторыі сённяшніх Валожынскага і Стаўбцоўскага раёнаў Мінскай вобласці, а таксама Іўеўскага і Навагрудскага раёнаў Гродзенскай вобласці.

Да гэтага часу ў навейшай гісторыі нашы пушчанскія лясы ўжо былі ў складзе Вялаўскага Дзяржаўнага заказніка (1940-1951 гады), а таксама Налібоцкага Дзяржаўнага паляўнічага заказніка (1960-2000 гады). Заўсёды пад таямнічым словам "Пушча" меўся на ўвазе вялікі масіў густога лесу. Вялікая Айчынная вайна нанесла значны ўрон нашым лясам. За часы ваеннага ліхалецця, як сцвярджаюць спецыялісты лясной гаспадаркі, пацярпеў, або застаўся знішчаным кожны чацвёрты кубаметр спелай драўніны (яе вывозілі ў Германію і саюзныя з ёй краіны, а таксама выкарыстоўвалі на будаўніцтва або аднаўленне фартыфікацыйных збудаванняў, мастоў, дарог праз балоты...). Нельга забывацца яшчэ і пра тое, колькі было знішчана пажарамі. Таму сённяшнія лясы, якія ўваходзяць у склад пушчы Налібоцкай — гэта пасляваенныя, рукатворныя лясы, у асноўным створаныя і адноўленыя мясцовымі таленавітымі лесаводамі.

Лес радуе чалавека не толькі багаццем раслiннага свету, але і жывёльнай разнастайнасцю. У гэтых адносінах, фаўна Налібоцкай пушчы ні ў чым не саступіць другім рэгіёнам нашай краіны. Яшчэ, пры валожынскім графе Тышкевічы у нашых лясах прыжылася грацыёзная лань, завезеная з Германіі, а ў пасляваенныя саракавыя гады да нас прыйшла і прыжылася янотападобная сабака з Усурыйскага краю. Для рэакліматызацыі у 1972 — 1973 гадах у Валожынскія лясы былі завезены высакародныя алені.

Але галоўнай падзеяй для Налібацкай пушчы стала вяртанне на сваю гістарычную Радзіму прадстаўніка каменнага веку, магутнага старадаўняга зубра. Мы ніколі не забудзем той зімовы марозны дзень 4 лютага 1994 года, калі першая партыя з чатырох зуброў, паспяхова пераадолела адлегласць з Белавежскай пушчы, з'явілася у нашым вальеры. А пасля трох тыдняў у загоне ужо знаходзіліся 15 зуброў(10 самак і 5 самцоў), якія заснавалі новую Валожынскую мікрапапуляцыю белавежскіх патрыярхаў. Пачынаючы, з 28 мая 1994 года, статак з 20 галоў стаў жыць на волі, па-гаспадарску абжываць новыя для сябе ўгоддзі. Яны адрозніваюцца складам кармоў, якіх так не хапала ў Белавежскай пушчы з-за перанасялення паляўнічых угоддзяў рознымі капытнымі — канкурэнтамі па кармах.

З першага дня з'яўлення зуброў на Валожынскай зямлі пачалася напружаная праца ў егерскай службы лясгаса. Егеры Ю. Рудовіч, А. Рубацкі, С. Іода і Ф. Сухадолец з вялікай адказнасцю і любоўю даглядалі навасёлаў, падкормлівалі, вялі кругласутачны нагляд. Так пачаўся сучасны летапіс у гісторыі Валожынскай мікрапапуляцыі еўрапейскага (белавежскага ці літоўскага) зубра. Хоць, трэба адзначыць, што далёкія продкі зуброў — бізоны некалі вадзіліся ў нашых мясцінах.

У сувязі са змяненнем клімату і прыродных умоў бізоны падзялiліся на тры катэгорыі — каўказскія, карпацкія і еўрапейскія. Тых бізонаў, якія трапілі ў паўночную Еўропу, сталі называць еўрапейскімі. Калі яны з'вiліся ў нашым краі? Аб гэтым мы даведаліся толькі ў 1997 годзе, дзякуючы здарэнню, якое адбылося ў вёсцы Паморшчына Ракаўскага сельскага савета Валожынскага раёна. А адбылося ўсё так. Людзі капалі студню і на глыбіні пяці метраў раптам праца спынілася, бо перашкаджалі незвычайныя косці, значных памераў. Як пазней высветлілі вучоныя Інстытута геалогіі Нацыянальнай акадэміі навук Рэспублікі Беларусь, гэта былі косці першабытнага бізона (рагавы стрыжань і абломкі пазванкоў), якія праляжалі ў зямлі 13 700 гадоў. Палеантолаг П. Калiноўскі падцвердзіў, што на тэрыторыі Беларусі такія палеанталагічныя матэрыялы знойдзены толькі ў шасці месцах у Віцебскай, Гомельскай і Гродзенскай абласцях. У тых старажытных жывёлін вага дасягала 2-2,5 тоны (сучасны ж белавежскі зубр важыць толькі 1,2 тоны, а амерыканскі бізон — 0,7 тоны). Яшчэ ў пачатку новай эры бізоны засялялі вялікія абшары Еўропы ад вярхоўяў Дуная і да Балтыйскага мора, але ў IX-X стагоддзях яны пачалі цалкам знікаць.

Аналізуючы гістарычныя падзеі, якія адбываліся затым у Еўропе і ў ВКЛ пад Каронай польскай у сярэднія вякі, да якога тады належаў і наш край, а таксама аналізуючы ўсе тыя змяненні, якія адбываліся і ў дзікай прыродзе нашага краю, варта звярнуцца да нашага славутага земляка Мікалая Гусоўскага (1475 — 1533 гады), які ў паэме "Песня пра зубра" напісаў, што "звер гэты цудам толькі яшчэ ў нас захаваўся пад зоркай Палярнай"... Менавіта, вось пра гэтага зубра ў яго творы і ідзе гаворка, бо, як далей піша М. Гусоўскі, што "калі зубра раняць смяротна і ранены ўкленчыць — трох паляўнічых садзіцца у яго між рагамі". Вось якія жылі зубры ў нашай пушчы ўсяго 500 гадоў таму!

Калі звярнуць увагу з навуковага боку на паводзіны сённяшніх зуброў — навасёлаў, асабліва ў летні перыяд, то нас здзіўляе тое, што яны здольныя наведваць і абжываць нават далёкія ускраіны пушчы, якія былі некалі ў межах пушчы часоў князя Вітаўта. Нашых зуброў ужо сустракалі і ў раёне возера Кромань — у Стаўбцоўскім раёне, і ў раёне ўрочышча Зялёнае, што на правым беразе ракі Нёман — супраць мястэчка Любча Навагрудскага раёна. А вось некалькі самых смелых самцоў, прайшоўшы ўздоўж усю сваю вотчыну па тэрыторыі Беларусі, перайшлі на дзяржаўную мяжу з Літвой, але пакуль да месца сваёй пастаяннай прапіскі — у Валожынскі вопытны лясгас — не вярнуліся. Гэтыя эпізоды з сённяшняга іх жыцця красамоўна сведчаць, што нашы сучасныя зубры прытрымліваюцца павадак сваіх далёкіх продкаў, але ёсць і асаблівасці. Напэўна, гэта звязана з рознымі ўзроўнямі цывілізацыі...

Сёння зубры жывуць статкамі па 15-20 галоў. Важаком кожнага статку з'яўляецца магутная, вопытная самка. Самцы ў статках трымаюцца да 3-4-гадовага ўзросту, а затым арганізоўваюць самастойныя кланы самцоў. А вось старэйшыя самцы жывуць самотна, толькі далучаюцца да статка ў перыяд шлюбных гульняў (перыяд юр). Нашы дарослыя самцы важаць 800-1 000 кілаграмаў, даўжыня іх — 3,5 метра, а вышыня — каля 2-х метраў. Самкі трохі меншыя і лягчэйшыя. Зубрыны юр праходзіць у жніўні — верасні, у ім удзельнічаюць зубры-самцы, старэйшыя за пяць гадоў, самкі-зубрыцы дасягаюць дзетароднасці нават у 3-4 гады. Самка-маці нараджае адно зубраня ў маі — чэрвені наступнага года. Маці-зубрыца корміць яго болей аднаго года сваім малаком, тлустасць якога 12-14 працэнтаў.

Гісторыя ўратавання зуброў пачалася з 1929 года, з ініцыятывы польскіх навукоўцаў. Дзякуючы іх намаганням, з'явіліся зубры ў Белавежскай пушчы. У 1946 годзе іх ініцыятыву перанялі нашы спецыялісты — зубраводы з БССР. У 1966 годзе назва гэтай знікаючай жывёлы была занесена ў Міжнародную Чырвоную кнігу. У 1978 годзе зубр быў занесены і ў Чырвоную кнігу СССР , а затым у 1981 годзе — у кнігу БССР, а ў 1993-м — у Чырвоную кнігу Рэспублікі Беларусь. Калі ў 1994 годзе ў Рэспубліцы Беларусь налічвалася 347 зуброў, то ў 2005-м іх стала 680. Варта адзначыць, што ў 2001 годзе ў 37 краінах свету іх налічвалася ўсяго 2 956 галоў. У тым жа 2001 годзе сусветны запас белавежскага, або літоўскага, зубра склаў 2 864 галавы, з якіх 60 працэнтаў, або 1 700, галоў жывуць на волі. Гэтыя зубры аб'яднаны ў мікрапапуляцыі, якіх у Беларусі — 7, у Расіі — 8, Украіне — 9, у Літве — 1, у Польшчы — 5. Наша Валожынская мікрапапуляцыя развіваецца таксама стабільна. 15 зуброў было завезена ў 1994 годзе, па стане на пачатак 1999 года мы мелі 37 галоў, а ў 2006 годзе іх стала 56. За ўвесь перыяд пражывання зуброў у нашых лясах нарадзіліся 72 зубраняты. Дзякуючы падтрымцы дзяржавы, у нашым вопытным лясгасе праводзіцца значная праца па павелічэнні колькасці статка зуброў.

Васіль ШАКУН,
вядучы інжынер Валожынскага вопытнага лясгаса.
Фота Яўгена КАЗЮЛІ.

Чырвоная кніга для Лунінца

Хачу пазнаёміць чытачоў "ГР" з цудоўнымі людзьмі, настаўнікамі, краязнаўцамі Іванам Аляксеевічам і з Ларысай Канстанцінаўнай Панасюкамі. Ларыса Канстанцінаўна — аўтар Чырвонай кнігі Лунінецкага раёна. Іван Аляксеевіч пайшоў далей, стварыў эксклюзіўныя кніжкі па краязнаўстве і пераклаў іх на нямецкую мову. Чырвоная кніга ўжо перададзена ў кожную школу. Педагогі Панасюкі ўпэўнены, што ў школе павінен быць праграмны, а не факультатыўны ўрок па краязнаўстве.

Быў жнівень, а на Белым возеры яшчэ квітнела вельмі рэдкая расліна — выцвілы за лета, зараз амаль белы, а ўвогуле блакітны званочак Лабелія Дортмана. Гэта лілея. Ёсць яшчэ толькі адно месца, акрамя Белага возера ў Беларусі, дзе яна квітнее, — возера Свіцязь. Гэта рэдкая і вельмі далікатная расліна — у Чырвонай кнізе нашай рэспублікі.

На Лунінеччыне ніхто, нават маленькія дзеці, не зрывае Лабелію Дортмана. Усе ведаюць: калі ахоўваецца Чырвонай кнігай, значыць, ахоўваецца і мной...

Лунінец, яго ваколіцы — унікальны куток прыроды, тут мноства рэдкіх відаў раслін, жывёл. У самым Лунінцы растуць сорак дзве разнавіднасці рэліктавых дрэў і кустоў. Тутавае дрэва, барбарыс, сасна варатнічковая месцяцца проста ля дарогі. А туя — каля аптэкі. Секвоі растуць прама ля вады, а грабяншчык, які нагадвае бэзаваружовыя каштаны, — невялікай рэліктавай алейкай — каля райвыканкама.

— Тамарыск у нас называюць Чырвонымі свечкамі, — сказаў Іван Аляксеевіч. — Нядаўна выдаў невялікую кніжку па краязнаўстве на нямецкай мове. Я, акрамя прыродазнаўства, яшчэ і настаўнік нямецкай мовы. Зрабілі выданне для нашых пабрацімаў з нямецкага гарадка Шэнефельда пад Гамбургам, своеасаблівую Чырвоную кнігу лунінецкай зямлі і яе рэдкай прыроды...

— Іван Аляксеевіч, не ў кожным раёне Беларусі вядзецца такая праца. Не ўсюды ёсць свая Чырвоная кніга. Не ўсюды столькі захопленых краязнаўствам, а ў вас усё атрымліваецца!

— Я ішоў да гэтага трыццаць гадоў. Дакладней, мы з жонкай. А яна ў мяне біёлаг. Аднаму б столькі не зрабіць. Усё жыццё мы працуем у школах. Шмат сіл аддалі рабоце ў каледжы, ліцэі, дзе экалагічнаму выхаванню надаецца вялікая ўвага.

— Я была там і вельмі здзівілася, калі даведалася, што школьныя навуковыя працы, гербарыі ліцэістаў прызнаюць вучоныя ў Акадэміі навук і універсітэтах.

— А як жа інакш? Бо і мы, настаўнікі, і вучоныя з універсітэтаў выкладаем у ліцэі. Думаеце, лёгка навучыць дзіця не зрываць Лабеліі званочак, калі ён на Белым возеры не адзін, а невялікія зараснікі ўжо? Навучыліся ўсе разам... Веру, што хутка будзе ў школах прадмет пад назвай "лунінцазнаўства".

— А ці можна больш падрабязна пра гэта?

— Ну як жа! Гісторыя і захаванне прыроды — узаемазвязаны. Наш край унікальны, тут цячэ Прыпяць, знаходзяцца Белае і Чорнае возеры... Мноства іншых малых азёр і рэчак. Гняздуюцца буслы белыя і чорныя, журавы... І ўсё блізка, побач... Калі гэта засвоіць у школе, будзе каму клапаціцца пра самую вялікую каштоўнасць — зямлю, на якой жывём, нашу Бацькаўшчыну.

— Верагодна, вы даяце нейкія канкрэтныя парады дзецям?

— Заўсёды гавару дзецям: слухайце цішыню, не шуміце, не ўключайце гучна радыё: шум палохае птушак і насякомых. Другое правіла — паразмаўляйце з кветкамі і не рвіце іх вялікімі ахапкамі, бо, каб вырасла расліна, трэба гадоў сем-восем. Трэцяе — калі сустрэлі птушку лясную ці жывёлу, не прыручайце, бо яны нарадзіліся не на падвор'і. Лепш парадуйцеся шчаслівай сустрэчы, а свае назіранні запішыце ў дзённік... Чацвёртае — калі вы запалілі вогнішча ў лесе — не пакідайце гэтага месца, пакуль не патушыце кожны вугольчык. У наступны раз лепш прыйсці сюды зноў, каб не выпальваць яшчэ больш лясной травы. Усяго я сфармуляваў дзесяць такіх самых простых правіл, і дзеці хутка засвойваюць іх...

— Атрымліваецца, вы, настаўнікі, выхавацелі, дапамагаеце дзецям і дарослым не толькі пазнаць малую радзіму, але і творча яе добраўпарадкаваць. Гэта так?

— Вы бачылі, як змяніўся наш гарадок, якія вёскі сталі прыгожыя. Кожны дворык, нават старэнькі — у кветках. На возеры чыста, белыя і жоўтыя гарлачыкі надзіва вялізныя, іх таксама ніхто не зрывае... Гэта вынікі сістэмы выхавання, якая склалася ў раёне: выхоўваць дзяцей грамадзянамі, якія любяць прыроду роднага краю, а таксама паважаюць дасягненні старэйшага пакалення.

Вольга ЯГОРАВА.

НАЦІОНАЛЬНЫ ОТВЕТ

Спецвыпуск №12

Яўген Шунейка — дацэнт кафедры гісторыі і тэорыі мастацтва Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў, кандыдат мастацтвазнаўства, член Саюза мастакоў Беларусі. Ён разам з Вольгай Штокман прадстаўлены на суісканне прэміі імя Георга Дэхіа грамадскай арганізацыі "Германскі форум усходнееўрапейскай культуры" за 2007 год. Вольга Штокман, грамадзянка Рэспублікі Беларусь, старшыня грамадскага аб'яднання нямецкай культуры "Масты" ў Мінску вылучана за дасягненне поспехаў у вывучэнні, захаванні і папулярызацыі лепшых узораў нямецкай культуры сярод шырокай грамадскасці, значны ўклад ва ўмацаванне нацыянальнай згоды, развіццё міжкультурнага дыялогу і ўзаемаразумення паміж народамі. Я. Шунейка вылучаны за цыкл навукова-папулярных і публіцыстычных твораў пра нямецкае мастацтва, аўтарскія праекты па развіцці творчага дыялогу мастакоў Германіі і Беларусі, арганізацыі абменных выстаў і сімпозіумаў, азнаямленне беларускай грамадскасці з мастацкімі дасягненнямі і духоўнымі каштоўнасцямі немцаў і прадстаўнікоў нямецкай грамадскасці з творчасцю беларускіх майстроў. З Вольгай Штокман чытачы "ГР" нядаўна мелі сустрэчу ў "Национальном ответе". Сёння Валянціна ГРЫШКЕВІЧ гутарыць з Яўгенам Шунейкам.

Леваруч Свіслачы – Шпрэя

— Ці было чаканым для вас вылучэнне ад Беларусі?

— Шчыра кажучы, прапанова выставіць маю кандыдатуру была зусім нечаканай. Я не ведаў нават, што такі фонд існуе ўжо шэсць гадоў, мне раней ніколі не сустракалася прозвішча аднаго з класікаў нямецкага мастацтвазнаўства Георга Дэхіа (1850 — 1932), але цяпер абавязкова знайду ўсю неабходную інфармацыю пра дзейнасць гэтага навукоўца, імя якога носіць "Германскі форум усходнееўрапейскай культуры". З пачатку 1990-х гадоў беларуска-нямецкія адносіны перажываюць сапраўдны культурны Рэнесанс, ёсць каштоўныя вынікі. Лічу сябе адным з многіх германафілаў, якія аднаўляюць парушаныя ліхалеццямі гістарычныя сувязі, менш за ўсё думаючы пра магчымыя намінацыі, прэстыжныя конкурсы, прэміі і гэтак далей. Але, калі атрымаў такую прапанову, не стаў адмаўляцца. Па-першае, гэта акалічнасць спрыяе падсумаванню ўласнай дзейнасці за 15 гадоў. Па-другое, у дасягненні пэўных вынікаў мяне падтрымлівалі шматлікія зацікаўленыя асобы, якім я, нарэшце, карыстаючыся сродкамі друку, магу выказаць шчырыя словы ўдзячнасці. Ва ўсім спрыяючы маёй рамантычнай, так бы мовіць, нямецкай захопленасці, яны аб'ектыўна адлюстроўвалі агульны для большасці ў нашым соцыуме погляд на неабходнасць ломкі стэрэатыпаў і стварэння ў грамадскай свядомасці новага, рэальнага вобраза Германіі.

— Калі вас прывабілі беларуска-нямецкія стасункі?

— У 1991 годзе я напісаў у сааўтарстве з калегам па пяру П. Васілеўскім вялікі аналітычны артыкул пра выставу ў Мінску сучаснай нямецкай скульптуры з Музея В. Лембрука ў Дуйсбургу. З таго часу, дзякуючы зычліваму стаўленню да мяне як да "неўтаймаванага аўтара" з боку рэдактараў вядучага рэспубліканскага часопіса "Мастацтва" Я. Сахуты, А. Дударава, М. Гіля, В. Трэгубовіч, В. Вайткевіча, Т. Мушынскай, Л. Грамыкі, В. Паўлаўца, А. Ганчарова, Н. Шаранговіч, А. Белявец і іншых, мне заўсёды прадстаўлялася не адна старонка, каб паслядоўна асвятляць творчыя нямецкія здабыткі. Такім чынам, у 1990-х гадах у друку з'явіўся шэраг маіх артыкулаў пра наватарскія перамены ў мастацтве Германіі XX стагоддзя. Яны былі не толькі багата ілюстраваны, але сваім свабодным стылем напісання былі прызначаны, каб наблізіць чытача не толькі да твораў мастацтва, але і да атмасферы жыцця, розных характэрных рэалій яшчэ вельмі загадкавай для нас краіны над Рэйнам, Эльбай і Шпрэяй.

— А ці былі вы ў Германіі, каб узбагаціцца патрэбнымі асабістымі ўражаннямі?

— Так, і не аднойчы. Нельга сказаць, што гэта было вельмі паглыбленае даследаванне нямецкага жыцця, але ў сканцэнтраванай форме многае паспеў для сябе асэнсаваць, пазнаёміўся з рознымі неардынарнымі людзьмі, спрабуючы не без цяжкасцяў размаўляць з імі па-нямецку. Пасля першага вяртання з Германіі, куды вазіў на адпачынак дзяцей з чарнобыльскай зоны, падзяліўся сваімі ненадуманымі, аб'ектыўнымі назіраннямі на старонках "Літаратуры і мастацтва" ў разгорнутым эсэістычным матэрыяле "Нямеччына зблізку".

У 2003 годзе мне таксама пашчасціла як больш-менш спрактыкаванаму "германазнаўцу" аператыўна падрыхтаваць у нямецкамоўны выпуск штотыднёвіка "Культуры" насычаны прыкладамі артыкул пра гісторыю беларускай кніжнай графікі для міжнароднага кніжнага кірмашу ў Франкфурце-на-Майне. Лінгвістычны ўзровень майго спецыялізаванага тэкста кваліфікаваныя эксперты потым вызначылі як "вышэй за сярэдні", чым я не перастаю ганарыцца.

— Дзе яшчэ спрыяла веданне нямецкай мовы?

— Я спрабую праяўляць свае арганізатарскія схільнасці ў двух нямецкіх напрамках дзейнасці, дзе нямецкая мова вельмі пажаданая. Гэта — "Відэргэбурт" і "Тахелес". Першы з іх (па-руску "Адраджэнне") звязаны з грамадскім аб'яднаннем немцаў Беларусі, якое ўтварылася напачатку 1990-х гадоў у Мінску. Так я стаў адным з актывістаў аб'яднання і разам з Львом Гольцэрам, Таццянай Хайнбіхлер-Горбач, Львом Йовам, Вікторыяй Вернэр і іншымі шматлікімі сябрамі з "Відэргэбурт" спяваў у хоры, танцаваў у народных строях, ладзіў святы і жалобныя дні нацыянальнай памяці, выдаваў альманах "Wie geht's?" (у перакладзе — "Як жывецца?"), назапашваў у жывых кантактах з калегамі свой нямецкамоўны вопыт.

Такія нефармальныя грамадскія абавязкі вельмі моцна мяне ўзбагачаюць маральна і культурна, дазваляюць рэалізоўваць розныя задумы, да якіх у іншых абставінах ніколі б не дадумаўся. Напрыклад, для розных святочных мерапрыемстваў пачаў пісаць тэксты лялечных сцэнак на тэмы сустрэч І. Гутэнберга з Ф.Скарынам, І. В. Гётэ з А. Радзівілам, Кацярынай II з нямецкімі перасяленцамі і гэтак далей. Я, канешне, не прэтэндую ў іх на вялікія сцэнічныя здабыткі, але сама праблематыка, лічу, вельмі актуальная, дае штуршок для пашырэння творчых далеглядаў.

Каб ілюстраваць розныя нумары альманахаў аб'яднання, дакрануўся таксама да такіх неасэнсаваных яшчэ тэм у выяўленчых відах мастацтва, як лёс дэпартаваных у 1941 годзе немцаў Паволжжа, уклад палонных вермахта ў пасляваеннае аднаўленне Мінска. Нават адважыўся намаляваць па ўласным уяўленні вобразны партрэт берлінскага гісторыка мастацтва Альберта Іпеля, які ў 1918 годзе напісаў першую манаграфію ў Еўропе пра яшчэ зусім невядомае ў свеце беларускае мастацтва.

— Ці ўдалося вам прадэманстраваць свае здольнасці падчас гродзенскіх фестываляў?

— У 1998, 2000, 2002, 2004 гадах я перажыў у сувязі з гэтымі падзеямі сапраўдную творчую ліхаманку, тым больш што я нарадзіўся ў Гродне, і ў мяне з'явілася незвычайная магчымасць пазнаёміць землякоў з нямецкай культурай, якая для іх не такая ўжо і далёкая ў геаграфічным і гістарычным сэнсе. Мы выступалі на прызначаным нам арганізатарамі "Нямецкім падворку" ў цэнтры старога горада і заўсёды адчувалі жывое, шчырае, станоўчае стаўленне шматлікіх гледачоў да нашых культурных праграм. Не магу забыць, як да мяне падыходзілі людзі розных узростаў і шчыра распавядалі пра свае нямецкія сувязі: хто служыў у ГДР, хто старанна вывучаў нямецкую мову яшчэ "за польскім часам" і дагэтуль памятае, хто адправіў дзяцей на лета пагасцяваць у нямецкія сем'і, а хто сустракаўся з немцамі ў сібірскім выгнанні і гэтак далей.

Гэта натхняла мяне на розныя жартоўныя перформансы (міні-прадстаўленні). Я пераапранаўся ў традыцыйнае "Майскае дрэва" з падвешанымі на галінках цукеркамі і пернікамі, адыгрываў у замаскіраваным выглядзе ролі асла, пеўня і іншых славутых "Брэменскіх музыкаў". Але самы выразны, здаецца, атрымаўся ў мяне ў 2004 годзе вобраз барона Мюнхаўзена (на здымку ў цэнтры). У белым парыку і з шызай бародкай, у трохкутным капелюшы і ў экстравагантным касцюме ўзору XVIII стагоддзя я апынуўся ў цэнтры ўвагі. Планую новы, вясёлы пэрформанс для наступнага фестывалю.

— А што ўяўляе сабой "Тахелес"?

— У многіх берлінскіх даведніках для турыстаў у спісе для першачарговага наведвання на трэцім месцы пасля адноўленага Рэйхстага і Брандэнбургскай брамы пазначаны "Тахелес" — Міжнародны дом сучаснай мастацкай творчасці, які знаходзіцца ў самым цэнтры горада на Араніенбургштрасэ ў шматпавярховым даваенным яўрэйскім універсаме. Таму ў яго засталася такая загадкавая назва, якую не бяруся растлумачыць. У 2001 годзе я стаў куратарам і ўдзельнікам выставы 30 беларускіх мастакоў у гэтым незалежным творчым асяродку, якая праходзіла пад разумелым для нас і немцаў лаканічным дэвізам "Дах". Берлінскія арганізатары былі вельмі задаволены цікавасцю гледачоў да мастацтва "новай невядомай краіны", і мы вырашылі працягваць супрацоўніцтва, наладжваць творчыя мастакоўскія паездкі ў Берлін і Мінск. Такім чынам, у 2003 годзе да нас прыехалі на некалькі месяцаў працаваць прадстаўнікі "Тахелеса" Андрэас Штраус і Б'янка Флегель, а самі берлінцы так упадабалі нашага мінскага жывапісца Алеся Родзіна, што без яго рэгулярных візітаў ужо не могуць абысціся. І зараз ён там ладзіць чарговую выставу. Я як куратар такога творчага мастака таксама зрэдку бываю на ўзбярэжнай Шпрэі і заўсёды яе малюю з натуры. Ёсць у Берліне і іншыя матывы, тэмы, якія мне падаюцца невычэрпна вобразнымі. Вось так ужо пяць гадоў існуюць "тахелесаўскія", "дахаўскія" ўзаемасувязі, якія маюць свой рэальны творчы патэнцыял.

Яшчэ адзін напрамак супрацоўніцтва звязаны са стварэннем напачатку 1990-х гадоў у Мінску Інстытута Гётэ, які ўзначаліла вельмі энергічная пані Вера Багальянц. Яна здолела наладзіць вельмі шырокія сувязі з беларускімі германафіламі. Плённа супрацоўнічаў з гэтай арганізацыяй падчас правядзення ў Віцебску міжнародных пленэраў жывапісу памяці М. Шагала. У іх бралі ўдзел нямецкія мастакі Джанет Кіпка, Карла Войсніца, Маціас Вільд і іншыя, якіх я як куратар мастацкай крытыкі на пленэрах, знаёміў з нашай культурай.

— Шчыра кажучы, уражвае, што вы за адносна невялікі час столькі зрабілі для наладжвання беларуска-нямецкіх сувязяў. Што новага прагназуеце ў іх развіцці, якой бачыце сваю далейшую ролю?

— Зараз пачынаецца новы перыяд у беларуска-нямецкім збліжэнні. Берлін — адзін з самых наватарскіх цэнтраў еўрапейскай культуры, якімі ў свой час былі Парыж і Нью-Йорк. Немцы ў мастацтве застаюцца праўдалюбцамі і стваральнікамі глабальнага дыялогу культур, які ў 2000-х гадах становіцца самай актуальнай творчай задачай. Берлін, як і Мінск, Масква, Пекін і іншыя сталіцы незалежных краін, памятае сацыялістычны перыяд, а гэта, на маю думку, вельмі значны гістарычны пласт перажытага, драматычнага. Нам, людзям розных нацыянальнасцяў так званай постсавецкай прасторы, ёсць што ўнесці ў гэты вялікі культурны дыялог, бо мы не згубілі свае лепшыя традыцыі і хутка засвоілі заходняе наватарства ў самых розных сферах жыцця, у тым ліку і незалежнай мастацкай творчасці. Гэтыя задачы, канешне, недасягальныя для пяцігвілінных энтузіястаў. Тут патрабуецца цярплівая і перакананая праца на ідэю, без асаблівых ілюзій на хуткі камерцыйны поспех. Не магу не сказаць, што прызнанне маіх сціплых поспехаў Камітэтам па справах рэлігій і нацыянальнасцяў, а цяпер яго праваперамеснікам — Упаўнаважаным па справах рэлігій і нацыянальнасцяў, — вялікая для мяне маральная падтрымка. Таму ўжо больш упэўнена, як "свой чалавек" планую ўзмацніць творчае супрацоўніцтва з ім па актуальнай праграме "Талерантнасць", у куратарстве над Ратамскай школай-інтэрнатам для дзяцей з праблемамі псіхалагічнага развіцця, дзе найбольш патрабуецца мастацкая падтрымка і іншыя праекты. Маленькіх, неістотных спраў тут не існуе, хоць не ўсё аднолькава папулярызуецца, сваечасова асэнсоўваецца. У заключэнні хацеў бы падкрэсліць, што самае вялікае шчасце, сапраўднае багацце — гэта такі лад дзейнасці, калі ідэй заўсёды болей, чым часу для іх ажыццяўлення. Лічу, што мне ў гэтым асабіста паспрыялі мае нямецкія сантыменты і сімпатыі. Таму ўсім зацікаўленым у культурным дыялогу пажадаю не абмінаць нямецкіх сувязяў дзеля карысці асабістай і агульначалавечай.

Фота з архіва Я. ШУНЕЙКІ.

Ужо 150 гадоў гарыць полымя таленту Івана Франко

150 год з дня нараджэння знакамітага сына Украіны, вядомага пісьменніка, Івана Франко, адзначылі ў Беларусі.

У верасні ў Нацыянальным музеі імя Янкі Купалы, здаецца, размаўлялі толькі на ўкраінскай мове. Тут сабраліся пісьменнікі і перакладчыкі, студэнты-ўкраіністы, прадстаўнікі ўкраінскага пасольства ў Беларусі і звычайныя ўкраінцы, якія жывуць у нашай рэспубліцы.

Іван Франко — гэта другая велічная постаць у гісторыі ўкраінскай літаратуры пасля Тараса Шаўчэнкі. Як некалі назваў яго Максім Рыльскі, гэта розум і сэрца ўкраінскага народа. Як у кожнага сапраўднага генія, яго талент шматбаковы. Іван Франко валодаў 14 мовамі, быў доктарам філасофіі, ганаровым доктарам рускай славеснасці, за сваё жыццё надрукаваў каля шасці тысяч твораў, сярод іх вершы, драматычныя творы, літаратурна-крытычныя артыкулы, мастацкія пераклады і іншыя. Ён пісаў не толькі сур'ёзныя і знакавыя для яго краіны і ўсёй Еўропы рэчы, але і дзіцячыя казкі і вельмі цікавыя апавяданні. Некалі ў Беларусі ставіліся яго п'есы "Будка №27", "Украдзенае шчасце", у Дзяржаўным тэатры лялек ішла пастаноўка па казцы "Фарбаваны ліс" пад назвай "Зялёная лісіца". Іван Франко цікавіўся гісторыяй, культурай і літаратурай суседняй Беларусі. У сваіх нарысах неаднаразова закранаў пытанні беларускага кнігадрукавання і старажытнай беларускай мовы. У свой час перакладаў творы беларускіх аўтараў на ўкраінскую мову.

Між іншым, дзень нараджэння Івана Якаўлевіча Франко ўключаны ў каляндар памятных дат ЮНЕСКА на 2006-2007 гады.

У Беларусі юбілей вядомага паэта быў адзначаны выхадам кнігі перакладаў яго твораў на беларускую мову. Да літаратурнай вечарыны, прысвечанай памяці пісьменніка, была прызначана і прэзентацыя кнігі "Народзе мой...". Перакладаў творы Івана Франко на беларускую мову старшыня міжнароднага фонду імя Янкі Купалы, літаратуразнавец, прафесар Вячаслаў Рагойша. Ён акцэнтаваў увагу на парадоксах, звязаных з творчасцю Івана Франко. Самы вялікі парадокс, на яго думку, у тым, што нягледзячы на яго талент, на тое, што гэты навуковец у свой час, акрамя літаратуры, зрабіў шмат у сферах сацыялогіі, этнаграфіі, філасофіі, зараз яго хоць і ведаюць у свеце, але не цэняць на столькі, на колькі ён гэтага заслугоўвае. Цудоўную прадмову да кнігі напісала Таццяна Кабржыцкая. Па яе словах, усё жыццё Івана Франко "ярка гарэла полымя таленту, адчуваўся пульс энергічнага розуму, здаровая і несакрушальная бадзёрасць духу".

У той вечар цудоўна перапляталіся вершы Івана Якаўлевіча з цёплымі словамі і мілагучнымі песнямі, якія выконваў народны ўкраінскі хор "Криниця", пад кіраўніцтвам Маргарыты Кучук.

У вечарыне прымалі таксама ўдзел часовы павераны ў справах Украіны ў Беларусі Аксана Кіцун, паэты, перакладчыкі, навукоўцы Васіль Жуковіч, Валерый Стралко, Павел Навойчык і іншыя не менш цікавыя госці.

Вера БАБРОЎНІК.

ЗША

Давід МЕЛЬЦЭР, прафесар:

"Пераезд з краіны ў краіну — драматычная падзея"

30 кастрычніка 2006 года флагман вышэйшай адукацыі Рэспублікі Беларусь — Беларускі дзяржаўны універсітэт — адзначыў сваё 85-годдзе. Больш паловы гэтага юбілею — амаль паўстагоддзя (1943-1992) — гісторыя БДУ звязана з імем таленавітага вучонага, доктара гістарычных навук, прафесара Давіда Барысавіча Мельцэра, якога па праву называюць "жывой гісторыяй БДУ". Аўтар 370 друкаваных прац, ён унёс уклад не толькі ў беларускую і балгарскую, але і сусветную гістарычную навуку. І яшчэ Мельцэра называлі "буйнейшым у свеце вучоным-балгарыстам" і "балгарскім летапісцам". Справа ў тым, што кандыдацкая і доктарская дысертацыі вучонага прысвечаны гісторыі Балгарыі.

Толькі ўявіце сабе: у кастрычніку 1943 года, калі на станцыі Сходня (пад Масквой) аднавіліся заняткі на шасці факультэтах Беларускага дзяржаўнага універсітэта, спыненыя Вялікай Айчыннай вайной, сакратаром камітэта камсамола БДУ і членам Хімкінскага райкома камсамола выбіраецца 18-гадовы юнак, загадчык ваеннага кабінета БДУ Давід Мельцэр. Між іншым, кіраўніком ваеннай кафедры быў студэнт ІІІ курса філфака Іван Мележ — будучы вядомы беларускі пісьменнік.

Студэнт БДУ, аспірант кафедры новай і навейшай гісторыі гэтай вышэйшай навучальнай установы, дацэнт гэтай жа кафедры і кафедры гісторыі Беларусі, намеснік дэкана гістарычнага факультэта, прафесар кафедры гісторыі Беларусі гістфака БДУ — вось асноўныя вехі працоўнага шляху Д. Мельцэра на тэрыторыі нашай рэспублікі. Вось ужо 14 гадоў (з 1992 года) вучоны жыве ў ЗША.

Менавіта гэтаму чалавеку прысвечана манаграфія прафесара Брэсцкага тэхнічнага універсітэта М. Стральца "Д. Б. Мельцэр: партрэт вучонага і педагога", якая выйшла зусім нядаўна. У ёй даследуецца навуковая, педагагічная і грамадская дзейнасць вучонага-гісторыка. Цэнтральнае месца ў кнізе займае паказ яго ўклада ў навуку як у савецкі, так і амерыканскі перыяды жыцця апантанага даследчыка сусветнай гісторыі.

У апошнія дзесяцігоддзі ў нашай рэспублікі выйшлі кнігі пра такіх вучоных-гісторыкаў, як М. Нікольскі, У. Перцаў, Г. Ліўшыц, У. Ігнатоўскі, Я. Мараш.

Чым жа адрозніваецца ад іх манаграфія М. Стральца?

Па-першае, шырынёй і ўсебаковасцю ахопу жыццёвага шляху Д. Мельцэра. Яна ўключае два асноўныя раздзелы: "Жыццё па-савецку" і "Жыццё па-амерыканску". Першы раздзел — гэта тры главы, якія прысвечаны фарміраванню асобы і станаўленню вучонага, педагагічнай дзейнасці Мельцэра, паказу яго як савецкага вучонага, прапагандыста гістарычных ведаў. Другі раздзел з дзвюх глаў раскрывае адаптацыю вучонага да амерыканскіх рэалій і прапаганду краіназнаўчых ведаў, яго ўклад у распрацоўку праблем Другой сусветнай вайны.

Па-другое, шматлікасцю і разнастайнасцю гістарычных крыніц, якія выкарыстаў аўтар кнігі М. Стралец. Гэта працы Мельцэра, перыядычны друк 1943-2006 гадоў, асабліва падшыўкі газеты "Беларускі універсітэт", асабісты архіў Д. Мельцэра, працы вучонага на балгарскай мове, успаміны былых студэнтаў і аспірантаў, рэцэнзіі балгарскіх гісторыкаў на працы вучонага, пастановы Прэзідыума АН БССР, звязаныя з яго навуковай дзейнасцю.

Па-трэцяе, у рэцэнзуемай манаграфіі ўпершыню прыведзена бібліяграфія друкаваных прац Д. Мельцэра.

Іа-чацвёртае, безумоўна, выклікае цікавасць дадатак, у якім змяшчаюцца спіс міжнародных канферэнцый, у якіх прымаў удзел прафесар Д. Мельцэр, дакументы і матэрыялы аб яго жыцці і дзейнасці, а таксама тэксты ўспамінаў пра вучонага выпускнікоў БДУ і аднаго з яго аспірантаў — дацэнта кафедры гісторыі Беларусі Гродзенскага дзяржуніверсітэта Э. Ярмусіка.

Па-пятае, умелым спалучэннем навуковасці і папулярнасці.

24 жніўня 1992 года ўраджэнец беларускага горада Мазыра Давід Барысавіч Мельцэр разам з жонкай, ураджэнкай Мінска, выпускніцай хімфака БДУ Ганнай Якаўлеўнай пакінулі Мінск і адправіліся ў ЗША, дзе ўжо з 1989 года пражывала іх дачка Таццяна Гарадніцкая са сваёй сям'ёй. Ён развітаўся з родным універсітэтам, з любімай працай, але аб'яднаўся са сваёй сям'ёй, адзінай дачкой, любімымі ўнукамі.

У 2004 годзе ў пісьме да аўтара кнігі М. Стральца ён напісаў: "Вось ужо 12 год, як жыву ў Нью-Йорку. Пераезд з краіны ў краіну — драматычная падзея ў жыцці любога чалавека. Для мяне, які без малога паўстагоддзя быў звязаны з Беларускім дзяржаўным універсітэтам, сорак тры гады працуючы на гістарычным факультэце, гэта быў вельмі складаны крок. Доўгі час я адчуваў сябе тут, быццам знаходжуся ў камандзіроўцы. Аднак актыўная грамадская дзейнасць дапамагла мне пераадолець настальгію".

Пачаўшы ў 1993 годзе супрацоўнічаць з рускамоўнай прэсай, прафесар Д. Б. Мельцэр надрукаваў звыш 100 артыкулаў. Асноўнай тэмай яго публікацый, у тым ліку і манаграфіі, стала тэма Халакоста. Акрамя таго, шэраг работ прысвечаны гісторыі Беларусі і гісторыі ЗША.

Кніга М. Стральца ілюстравана 24 фатаграфіямі з сямейнага альбома Д. Мельцэра.

У заключэнні адзначым, што беларуская гістарыяграфія паўднёвых і заходніх славян, навейшай гісторыі і гісторыі Беларусі папоўнілася каштоўнай і цікавай кнігай пра аднаго з таленавітых беларускіх вучоных-славістаў Д. Мельцэра.

Эмануіл ІОФЕ,
доктар гістарычных навук.

Прэзентацыя

Пад гукі струн сардэчных

У Мінскай абласной бібліятэцы імя А. Пушкіна адбылася прэзентацыя двух зборнікаў паэзіі нашага суайчынніка, даўняга аўтара газеты Уладзіміра Фёдаравіча Шуглі. Зборнікі выйшлі ў 2006 годзе пад назвамі "Под звуки струн сердечных" і "Горит, горит сердечная свеча".



Уладзімір Шугля жыве і працуе ў Цюмені. Ён вядомы як паспяховы прадпрымальнік, акадэмік Міжнароднай акадэміі інфармацыйных тэхналогій, грамадскі дзеяч, прэзідэнт гандлёвага дома "Мангазея", старшыня абласной грамадскай арганізацыі "Саюз — інтэграцыя брацкіх народаў". З'яўляецца ініцыятарам і арганізатарам стварэння Цюменскага нацыянальна-культурнага таварыства "Беларусь". Мае ўрадавыя ўзнагароды Расійскай Федэрацыі і Рэспублікі Беларусь. У 2005 годзе Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка ўзнагародзіў У. Шуглю медалём Францыска Скарыны. А вось, што ён літаратар, паэт, мала хто ведаў як у Цюмені, так і ў Беларусі. Прэзентацыя зборнікаў паэзіі з'явілася поўнай нечаканасцю для многіх. Зала бібліятэкі была поўнай.

На прэзентацыі прысутнічаў старшыня Камітэта па справах рэлігій і нацыянальнасцяў пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь Леанід Гуляка, які ўзнагародзіў У. Шуглю граматай Камітэта за "Значныя творчыя, літаратурныя дасягненні, актыўную грамадзянскую пазіцыю і дзейсныя намаганні па развіцці беларуска-расійскага сяброўства, шчырую адданасць роднаму дому, сям'і і Бацькаўшчыне, духоўным агульначалавечым каштоўнасцям", а таксама сказаў: "Не кожнаму паэту шчасціць праводзіць такое мерапрыемства ў такой утульнай зале з такой аўдыторыяй і ў такім высокім мастацкім аздабленні, якое сёння ёсць тут — творы Нінэль Шчаснай — адной з вядучых мастакоў нашай краіны — і яе дачкі. Не кожнаму паэту шчасціць, каб яго вершы чытала народная артыстка Рэспублікі Беларусь Марыя Захарэвіч. З вялікім задавальненнем прысутнічаю на гэтым вечары і хачу нагадаць словы народнага артыста Беларусі Ігара Лучанка: "Паэт адбыўся, але многае яшчэ наперадзе", хачу пажадаць, каб гэтыя словы і надалей былі дэвізам для Уладзіміра Фёдаравіча".

На вечары прысутнічала Валянціна Піскунова, старшыня Саюза беларусаў Латвіі, якая павіншавала У. Шуглю з яго выдатнымі зборнікамі і сказала аб тым, што беларусы, дзе б яны ні былі, годна прадстаўляюць сваю радзіму за яе межамі.

На вечары выступалі Марыя Захарэвіч, Нінэль Шчасная, Міхаіл Ткачоў, Уладзімір Шугля, спяваў беларускія і рускія песні рускі хор імя А. Нікіцінай.

Валянціна ГРЫШКЕВІЧ.

Уладзімір ШУГЛЯ

Увы, другой не будет жизни,
Сейчас достойно
нужно жить —
Себя служению Отчизне,
Высоким идеалам посвятить.

Отбросив мелкие желанья
И от бесплодной убежав
тоски…
В огромном мира здании
Песчинки мы и вечные
природы должники.

***

Нет о человеке лучшей вести,
Чем его способность жить по
чести,
И перед Родиной, семьей долг
исполняя,
Жить, никого не предавая.

***

Сторонушка моя
исповедальная,
Любимый край святой,
Все испытавшая,
многострадальная,
И сердцу уголок родной.

Тобой увлечена моя душа
И разум околдован мой.
Как будто заворожен я,
О, Беларусь, твоей красой.

И верю — это потому,
Что в ней родителей душа.
И без нее я не могу,
О, Беларусь, как ты мне дорога!

Анонс

Паказвае "Беларусь-ТБ"

"Мы з "Дынама"
10 лістапада ў 15.30

Відэафільм з цыкла "Нашчадкі Перамогі". Ён раскажа аб славутым спартыўным клубе "Дынама" і саміх "дынамаўцах".

"Міхаіл Савіцкі. Сказаць без слоў"
11 лістапада ў 15.30

Прэм'ера! Відэафільм прысвечаны Герою Беларусі, народнаму мастаку СССР і БССР, лаўрэату Дзяржаўнай прэміі СССР — Міхаілу Савіцкаму.

"Галерэя вобразаў"
12 лістапада ў 14.30

Праграма пазнаёміць з маладымі беларускімі дызайнерамі, шматразовымі пераможцамі розных конкурсаў моды — сёстрамі Парфяновіч.

"Чалавек ад зямлі"
19 лістапада ў 19.00

Да дня працаўнікоў сельскай гаспадаркі, які адзначаецца 19 лістапада. Фільм прысвечаны Герою Беларусі, лаўрэату Дзяржаўнай прэміі, кавалеру ордэна Знак Пашаны, былому дырэктару агракамбіната "Сноў", які заўчасна пайшоў з жыцця, М. А. Карчміту.

**Час выхаду перадач — мінскі.*

Расія

Выдадзена ў Іркуцку

На старонках дзіцячай складанкі пад прыгожай назвай "Сонейка" (Іркуцк. 2006) кожны вершык паэтэсы Кацярыны Лапо-Агаркавай іскрыцца сонечным цяплом, і цяпло гэта ўсім нам добра вядома з дзяцінства.

З той самай пары, калі мы толькі пачынаем азірацца вакол і ў глыбіні цікаўных вачэй адлюстроўваюцца адкрыцці жыцця, якія з дзяцінства запамінаем назаўсёды. Як і паэтэса, мы праносім праз ўсё жыццё радасць ад першага паходу па грыбы, промняў сонейка, якое ў акно глядзіць, "смяецца кожнай лужай у дварэ…". Працытуем адзін з вершаў іркуцянкі:

…Ручаі, падняўшы гоман,
Звоняць з самага рання,
І ад гэтых іх гаворак
Не было выдатней дня!
Дзеці мокрыя па вушы —
Не даклічаш іх дамоў,
І прасцей, ласкавей душы
Ўсіх, хто стрэнуўся са мной!

Добрыя і ласкавыя вершы Кацярыны Лапо-Агаркавай падараць радасць маленькім беларускім чытачам, якіх многа ў Іркуцкай вобласці, асабліва ў вёсках, і якія ведаюць, як чыстасардэчна сустракаць пяшчотнасць сваёй зямлі…

Мяне вершы "Зборніка дзіцячых вершаў з малюнкамі" ўразілі чысцінёй пачуццяў, шчырасцю і адкрытасцю. Усё гэта родам з дзяцінства, адтуль, дзе ніхто не носіць масак, не іграе на публіку, не жангліруе падробленымі пачуццямі і не хаваецца ад сапраўднага жыцця за сур'ёзнасцю. Вершы напамінаюць нам таксама і пра тое, што дзесьці зусім блізка знаходзіцца шчаслівая краіна дзяцінства, дзе няма турбот, няма для душы межаў, ёсць толькі асалода адкрыцця новага на кожным кроку ў, здаецца, бясконцым падарожжы жыцця. Вельмі добра, калі гэта падарожжа пачынаецца з любові да навакольля, якой прасякнуты гэтыя чыстыя і цёплыя вершы.



Настасся МЯРКУЛАВА.

У таварыстве "Радзіма"

МАЛАДЗЁЖНЫ ФОРУМ У ДАНБАСЕ

Таварыства "Радзіма" стала кардынатарам з боку Беларусі праекта "Моладзь без межаў", які ажыццяўляўся ў рамках Пятага маладзёжнага форуму ў Данбасе. Арганізатарам з украінскага боку выступілі Данецкая абласная дзяржаўная адміністрацыя, упраўленне па справах сям'і і моладзі.

Дэлегацыю з Беларусі для ўдзелу ў форуме ўзначаліў в.а. старшыні таварыства "Радзіма" М. Дубянок. У складзе быў сакратар пярвічнай арганізацыі БРСМ Нацыянальнага тэхнічнага універсітэта Юрый Чэчукевіч, а таксама маладзёжны рок-гурт "Дзіас" з райцэнтра Узда Мінскага раёна.

Форум сабраў больш за 400 удзельнікаў — лідэраў маладзёжных грамадскіх аб'яднанняў, студэнцкага самакіравання, журналістаў маладзёжных СМІ, творчую моладзь.

Нашы артысты ўдзельнічалі ва ўсіх мерапрыемствах, якія праходзілі ў рамках форуму. Цікавасць, добрыя, цёплыя адносіны адчуваліся на працягу ўсяго знаходжання на данецкай зямлі. А ў час прэзентацыі і канцэрта рок-групы "Дзіас" зала стоячы некалькі хвілін скандзіравала "Беларусь" і не адпускала беларусаў са сцэны.

Таварыства "Радзіма" атрымала падзяку ад арганізатараў мерапрыемства.

МІЖНАРОДНАЯ ЛЯТУЧКА ЮНЫХ ЖУРНАЛІСТАЎ

Яшчэ ў адным мерапрыемстве ва Украіне на Данеччыне прынялі ўдзел маладыя прадстаўнікі з Беларусі. Пяты Усеўкраінскі фестываль дзіцячых і маладзёжных СМІ "МСМІ на ReCord", які праводзіўся ў горадзе Святагорску, сабраў юных журналістаў з большасці рэгіёнаў Украіны, а таксама Расійскай Федэрацыі, Узбекістана, Казахстана, Малдовы.

Беларусь прадстаўлялі юныя журналісты з мінскай школы № 161.

СВЯТА ЎРАДЖАЮ Ў ШАЛЬЧЫНІНКАІ

Урачыста прайшло свята ўраджаю ў Шальчынінкаі (Літва). Шмат дэлегацый з памежных рэгіёнаў Польшчы, Літвы прыехалі на яго па запрашэнні Шальчынінкайскага раённага самакіравання.

Дарэчы, у таварыства "Радзіма" і Шальчынінкайскага раённага самакіравання існуе "Дэкларацыя партнёрства", падпісаная ў 2006 годзе.

Таварыства "Радзіма" накіравала цёплыя словы прывітання гасцям і ўдзельнікам свята. У якасці падарунка на святе выступіў ансамбль беларускай песні "Церніца".

ВЫСОКАЯ БЕЛАРУСКАЯ НОТА Ў КЫРГЫЗСТАНЕ

Як напісала нам у "Радзіму" Настасся Міхайлаўна Самардак з горада Токмок (Кыргызстан), сярэдняя школа № 7 гэтага горада ў гарадскім конкурсе мастацкай самадзейнасці прадстаўляла Беларусь і заняла другое месца. Старшыня аб'яднання беларусаў у Кыргызскай Рэспубліцы "Світанак" Аляксандр Сяргеевіч Шут выказаў падзяку і аказаў грашовую дапамогу школе.

Н. Самардак ужо 13 гадоў у "Світанку", і, нягледзячы на сталы ўзрост, вельмі актыўны ўдзельнік яго мерапрыемстваў. Да нас піша толькі на беларускай мове і марыць аб сустрэчы са сваёй Бацькаўшчынай.

"ЗОРЬКУ" ВЫПІСАЎ СПОНСАР

Вучні з беларускай школы ў Рызе (Латвія) будуць мець магчымасць чытаць беларускую дзіцячую газету "Зорька". Падпіску на газету праз таварыства "Радзіма" зрабіў намеснік старшыні Саюза беларусаў Латвіі Віталь Козел.

Галіна НАВІЦКАЯ, супрацоўніца таварыства "Радзіма".

Украіна, Ізяслаў

Нарэшце маем "Нумар года"!

Сябры гурта беларускай культуры "Зорка Венеры" з украінскага горада Ізяслава (на мясцовай гаворцы яго называюць "Заслаў"), прачытаўшы артыкул карэспандэнта "Голасу Радзімы" Рэгіны Гамзовіч "Арттмікс-гурт "Рагнеда" з Заслаўя" ў № 40-41, аднагалосна "прагаласавалі", што гэта — самы цікавы матэрыял гэтага года на старонках "ГР"! І гэта яшчэ не ўсё! Перачытаўшы ўсе публікацыі нумара ад 12 кастрычніка, гуртоўцы прыйшлі да такой высновы: нумар № 40-41 лічыць "Нумарам года — 2006"!!! Галоўнаму рэдактару тыднёвіка спадарыні Наталлі Салук выказаць шчырую падзяку за такі змястоўны і цікавы нумар, дзе практычна няма нецікавых публікацый.

Тайным галасаваннем у "дзесятку" самых цікавых і карысных увайшлі публікацыі:

1. Рэгіна Гамзовіч — "Арттмікс-гурт "Рагнеда" з Заслаўя".

2. Рэгіна Гамзовіч — "Урокі дасканаласці па версіі "Вадалеі".

3. Алесна Спасюк — "Мазыран выклікаюць на "біс".

4. Вольга Ягорава — "У Дарашэвічах, амаль як у Каракумах".

5. Алена Спасюк — "Усмешка па-беларуску" з эстонскім акцэнтам".

6. Сяргей Трахімёнак — апавяданне "Гэта страшнае слова — кіно".

7. Леанід Калядзінскі — "Слуцкі кароль".

8. Дзіяна Грышанава — "Алесь Камоцкі: новы падыход".

9. Мікола Котаў — "Меранне сарочкі".

10. Марына Габрыянік — "Ода Свіслачы — гораду на беразе ракі".

Безумоўна, што і іншыя матэрыялы не засталіся па-за ўвагай усіх, хто браў у рукі гэты "Нумар года".

Спадзяёмся, што Андрэй Кунец у Бухарэсце на "Еўрабачанні-2006" заспявае свой "Новы дзень" на беларускай мове. А мы тут будзем заўзята за яго галасаваць, каб Беларусь і ў Румыніі стала першай у Еўропе.

Настассі Нікіфаравай — гераіні артыкула "Урокі дасканаласці па версіі "Вадалеі" зычым поспехаў у яе далейшых выступленнях на розным міжнародных конкурсах, дзе яна годна прадстаўляе нашу гістарычную Бацькаўшчыну — Беларусь. Спадарыні Кацярыне Пашкевіч нізкі паклон за падрыхтоўку Настассі, а бацькам дзяўчынкі — падзяка за выхаванне такой цудоўнай дачкі.

Беларускі строй, у якім мы яе бачым у газеце, вельмі ёй пасуе: сапраўдная беларусачка!

Зацікавілі нас і Дарашэвічы!

Яшчэ раз вялікі дзякуй за самы цікавы нумар газеты ў гэтым годзе.

P.S. Калі з'явіцца яшчэ цікавейшы — будзем вітаць яго з'яўленне на "біс"!

Пятрусь КАПЧЫК, кіраўнік гурта "Зорка Венеры".

Між намі, еўрапейцамі

Люблю беларускую школу!

Вольга Карон, беларуская журналістка, знайшла сямейнае шчасце ў Францыі, пра яе гісторыю "ГР" пісаў у №№ 22-23, 38-39 за 2005 год. Потым былі тэлефанаванні і дамова аб супрацоўніцтве, якая нарэшце рэалізавалася. Вольга Карон піша аб тым, як беларуска, маладая маці чацвярых дзяцей успрымае французскія рэаліі.

Французы, у тым ліку і ў прэсе, часам крытыкуюць сваю сістэму адукацыі. Ужо некалькі разоў за апошнія гады мянялася методыка навучання чытанню: ад складовай да глабальнай (грунтуецца на запамінанні цэлых слоў, а не на літарным прагаворванні), затым да змешанай, а з гэтага года афіцыйна адбылося вяртанне да сілабічнай. Настаўнікі, вядома, так хутка не могуць прыстасавацца да змен, што пакуль і назіраецца.

Французы спахапіліся, канстатуючы вельмі нізкі ўзровень пісьменнасці ў навучальных установах, у тым ліку і ў вну. Аказваецца, у каледжах некаторыя не ўмеюць яшчэ добра чытаць! Былі прыняты рашэнні ўвесці рэгулярныя дыктанты (аб якіх сталі забываць), завучванне вершаў на памяць і гэтак далей.

Я ж упершыню пачула крытычныя заўвагі наконт французскай адукацыі ад рускіх эмігрантаў (у гэтым яны абсалютна адзінагалосныя), але не надала ім асаблівага значэння ў той час… Але вось два гады таму мой старэйшы сын пайшоў у школу, і мне прыйшлося з усім гэтым асабіста сутыкнуцца.

Пасля нашай простай і зручнай сістэмы адліку класаў — 1-ы, 2-і, 3-і і гэтак далей я акунулася ў нейкае глупства лічбаў і паняццяў, логіку якіх так і не зразумела да канца. (Самі французы не могуць даць якія-небудзь пераканаўчыя тлумачэнні). Выглядае гэта так.

Падрыхтоўчы клас (наш першы), 1-ы элементарны клас, 2-і элементарны, 1-ы сярэдні, 2-і сярэдні.

Каледж: 6-ы, 5-ы, 4-ы, 3-і.

Ліцэй: 2-і, 1-ы, выпускны.

У першым класе ў майго сына быў адзіны падручнік — па матэматыцы, па якім ён займаўся толькі ў школе, а дадому прыносіў на выхадныя (і тое не кожны тыдзень)… каб бацькі распісаліся.

Вельмі цяжка змірыцца з адсутнасцю хатніх заданняў. Школа тут арганізавана так, што засваенне навучальнага матэрыялу павінна адбывацца ў яе сценах. Дзеці знаходзяцца ў школе з 9.00 да 12.00, а потым (калі не абедаюць у сталовай) з 13.45 да 16.45. Усё гэта, вядома, чаргуецца з вялікімі перапынкамі на школьным двары. Дарэчы, дзецям эмігрантаў, якія вярнуліся на радзіму, цяжка потым уседзець за партай у школе.

Французскую мову мой сын вучыў па лістках ксеракопіі, а вучыўся чытаць… адразу па кніжцы. Гэта было адно адгадванне слоў і нават фраз. Маё абурэнне было такое, што я перастала з ім займацца французскай мовай, а займалася толькі рускай. У школе, вядома, ён блытаў рускія і французскія літары, і настаўніца папрасіла мяне не размаўляць з сынам па-руску, пакуль дзіця не навучыцца чытаць па-французску. Да таго ж мне прыйшлося сутыкнуцца з незвычайнай сістэмай заахвочванняў: за пэўную колькасць плюсаў у вучобе і паводзінах вучні ўзнагароджваюцца цукеркай або маленькай цацкай тыпу Макдональд. Дзецям, вядома, падабаецца такі падыход. Але задавальненне яны вучацца атрымліваць не ад сваёй працы, а ад зароблена цукеркі...

Майго сына бавіла, што яго настаўніца прыходзіць то з сінімі, то з чырвонымі валасамі, а мяне засмучала, што яна курыць прама каля школьнай брамы, праводзячы сваіх вучняў. Я яе, вядома, не асуджаю, проста ў маім разуменні зусім іншы вобраз настаўніцы, які склаўся яшчэ тады, калі я жыла ў Мінску.

На наступны год нам удалося ўладкаваць усіх траіх старэйшых дзяцей у прыватную каталіцкую школу. Мой старэйшы сын Канстанцін пайшоў тады ў другі клас, Себасцьян — у першы, а Кацярына — у сярэднюю групу садка ў гэтай жа школе. У хлопчыкаў з'явіўся падручнік па чытанні. Праўда, галоўным яго персанажам з'яўляецца прывід Гафі (і гэта ў каталіцкай школе!). А ў першакласнікаў падручнік з ведзьмай — яе яны бачаць на кожнай старонцы! Чамусьці лічыцца, што калі ў гісторыі няма страшных або незвычайных персанажаў, то дзяцей не зацікавіць. Так, замест класікі або якіх-небудзь павучальных гісторый дзяцей прывучаюць да коміксаў і забаўляльнага чытання з першага класа.

Прыватныя школы складаюць усяго 20 працэнтаў ад усіх школ Францыі, прычым гэта прапорцыя захоўваецца па волі дзяржавы. Між тым яны карыстаюцца вялікім попытам, і каб туды патрапіць, трэба стаць на чаргу (калі вы не маеце знаёмства або ў вас не атрымаецца пераканаць дырэктара школы ў сваёй зацікаўленасці). Прыватныя школы зручныя тым, што там ёсць прадлёнкі — як увечар, так і раніцай. У іх большая ўвага надаецца дысцыпліне, а таксама выкладаецца катэхізіс.

У дзяржаўных школах адукацыя (з 3-х гадоў) бясплатная, у тым ліку і сшыткі ў пачатковых класах. У прыватных кошт можа быць розны. У нашай школе ён складае 55 еўра ў месяц за адно дзіця, плюс усе школьныя прылады, якія набывае бацькоўскі савет.

Кожная школа носіць імя якога-небудзь пісьменніка, мастака, палітычнага або рэлігійнага дзеяча і нават святога, калі гэта каталіцкая школа. Наша школа носіць імя святой Марыі Магдаліны (у Сэн-Максімен захоўваецца частка яе мошчаў).

Я не шкадую, што мы змянілі школу, хаця адносна адукацыі засталася тая ж незадаволенасць (адсутнасць падручнікаў і хатніх заданняў). З дысцыплінай жа справы ідуць значна лепш. Многія імкнуцца ўладкаваць сваіх дзяцей у гэту школу дзеля таго, каб яны змаглі патрапіць у прыватны каледж, таму што аб дзяржаўным у Сэн-Максімен ходзіць дрэнная слава: частая адсутнасць выкладчыкаў, дрэнная дысцыпліна, бойкі і гэтак далей. Калі дадаць забастоўкі, якімі так захапляюцца ў Францыі, у тым ліку і настаўнікі, то вучыцца ў такім каледжы прыходзіцца зусім мала. Дарэчы, у прыватных школах настаўнікі не баструюць, і гэта ўжо не мала!

Вольга КАРОН.
Сэн-Максімен, Францыя.

НА ЗДЫМКАХ: Сільван і Вольга КАРОН са страэйшымі дзецьмі; шкаляр Канстанцін з катом Маркізам.
Фота з сямейнага архіва.

Францыя, Тулон

Паважаная рэдакцыя!

Хачу выказаць вам вялікую ўдзячнасць. Цудоўная газета! Заўсёды з задавальненнем чытаю.

Таксама хацелася б перадаць "Дзякуй" Марыне Габрыянік за цікавы артыкул пра мяне ("Мексіка — гэта не так ужо і далёка", "ГР" № 33-35, 24.08.06).

Поспехаў і ўсяго добрага!

Вольга СОТНІКАВА-РАМОС.

Этнаастраномія

НА МОВЕ ЗОРАК...

Цімафей Авілін — этнаастраном. Гэты яго занятак можна было б назваць захапленнем, калі б студэнт факультэта ядзернай фізікі і электронікі БДУ сур'ёзна і даўно не займаўся вывучэннем народнай астраноміі. Яго працы друкуюць салідныя навуковыя часопісы. Нядаўна ў Маскве ў зборніку "Гісторыка-астранамічныя даследаванні" Інстытута гісторыі натуразнаўства і тэхнікі імя С. І. Вавілава выйшаў артыкул маладога даследчыка "Беларуская народная астраномія", яго матэрыялы чакаюць іншыя еўрапейскія навуковыя выданні.



— Цімафей, як сталася, што вы разам з фізікай грунтоўна займаецеся гуманітарнай навукай?

— У дзяцінстве мяне цікавіла гісторыя. Паралельна я захапляўся астраноміяй. Яе я вывучаў у Рэспубліканскім тэхнічным цэнтры навучэнцаў, назіраў за метэорамі, зоркамі. Мой кіраўнік Канстанцін Цыркун падказаў ідэю — напісаць артыкул пра тое, як беларусы называлі сузор'і. Мае далейшыя даследаванні выліліся ў большае. Я пачаў сур'ёзна займацца вывучэннем народнай астраноміі.

— А ці ёсць у Беларусі навукоўцы, якія б глыбока распрацоўвалі гэту тэму?

— Па сутнасці, у нас этнаастраноміяй ніхто не займаецца. Закранаюць гэту праблематыку лінгвісты. Але яны больш вывучаюць тэму з пункту гледжання філалогіі. Паколькі я займаюся астраноміяй, цудоўна разумею людзей, якія прыгадваюць, як у старажытнасці называліся тыя ці іншыя астранамічныя аб'екты і дзе яны насамрэч знаходзяцца. Чалавек кажа: вось зорка, якая стаіць каля Сіта... Даследчык, які ведае астраномію, адразу вызначыць, дзе знаходзіцца аб'ект, пра які ідзе гаворка, як зоркі дапамагалі вызначаць час, гадавыя святы.

А вось Палярную зорку, ці Альфа Малой Мядзведзіцы нашы продкі называлі Зорны Кол, Стажар. Яны верылі, што Стажар — вяршыня Слупа, гэта значыць, Млечнага Шляху. Альфа Малой Мядзведзіцы — нерухомая на небасхіле. І гэтыя веды дазвалялі арыентавацца ў прасторы.

Назвы Сітко, Сіта часта сустракаюцца і ў беларускіх народных казках, літаратурных творах Яна Баршчэўскага, Адама Міцкевіча. Існуе тры асноўныя аб'екты, якія ведала большая частка людзей — Вялікая Мядзведзіца, Пляяды, Пояс Арыёна. Каляснiца, Воз, Карэц — так яшчэ называлі Вялікую Мядзведзіцу, Пляяды — Сіта, Куркі, Сітко, Валоскі, Валосы, Валасажар. Арыён — Касцы, Тры Каралі, Асілкі, Тры Сястры.

У народзе няшмат захавалася легенд, чаму з'явілася тая ці іншая назва.

— Калі і як вы пачалі вывучаць народныя павер'і, звязаныя з астранамічнымі аб'ектамі?

— Некалькі гадоў таму ў адным старым часопісе за 1920 год натыкнуўся на інфармацыю: у вёсцы Опса ёсць такія і такія назвы, але невядома, што яны абазначаюць. Я зацікавіўся гэтым і адправіўся на Браслаўшчыну, дзе знаходзіцца гэта вёска. Мне ўдалося сабраць надта цікавы матэрыял. Аказалася, што мясцовыя жыхары памятаюць, як называліся раней астранамічныя аб'екты. Я зрабіў для сябе выснову: пакуль ёсць носьбіты народнай памяці, трэба збіраць матэрыял.

Пачаў вывучаць слоўнікі, часопісы, кнігі, збіраў артыкулы — беларускія, польскія, літоўскія, рускія, украінскія. Пасля паехаў па розных беларускіх вёсках. Я зразумеў, што трэба збіраць матэрыял на месцах, пакуль яшчэ застаецца пакаленне, якое памятае старыя назвы, легенды.

— Цікава даведацца, пра што вашы даследчыцкія працы?

— Адна з іх прысвечана, напрыклад, метэорам. У беларусаў дзеная з'ява звязваецца з "падзеннем" зоркі або "вогненным змеем". Прычым "змеем" называлі вельмі яркія метэоры, баліды. Калі людзі назіралі такія з'явы, яны загадвалі жаданне. Убачыўшы метэор, казалі: ляціць анёл, але мы грэшныя і не можам бачыць яго. Казалі таксама , што ляціць свечка, якую Бог запаліў і паставіў на неба. Метэарытаў жа моцна баяліся, лічылі, што гэта кара з неба.

У расійскім зборніку "Гісторыка-астранамічныя даследаванні" выйшаў мой артыкул пад назвай "Беларуская народная астраномія", дзе я пастараўся сабраць асноўнае, што вядома. Беларусы, як і іншыя народы, бачылі плямы на сонцы. Яны лічылі, быццам тыя латкі, якія з'яўляюцца часам на сонцы, — гэта вароты ў рай, якія прасвечваюцца праз сонца. Пра Месяц казалі, што той быў створаны Богам, каб свяціць людзям, але ён заленаваўся. Таму Бог зрабіў так, што кожныя чатыры тыдні Месяц перараджаецца.

Самыя старыя запісы пра астранамічныя аб'екты ў Беларусі былі занатаваны ў канцы XIX стагоддзя. Звычайна ў беларускім фальклоры апісваюцца Сонца, Месяц, Заранка — Венера, якія паміж імі адносіны. Заранка — жонка Месяца, Месяц і Сонца — браты. "Ранішнюю" Венеру называлі заранкай, зарніцай, ючнай, а "вячэрнюю" — вячоркай, вечарніцай, мілавіцай. Сустракаецца таксама назва Воўчая Зорка. Венера першай з'яўляецца на небе з надыходам цемры, якраз у тую пару, калі воўк пачынае сваё паляванне. Гэта "зорка" дазваляла вызначаць час сутак, напрыклад, з усходам заранкі пачыналі паліць печ.

Сустракаюцца песні, у якіх ідзе расповед пра падзенне метэораў і пра тое, што з гэтым звязана: зорка паляцела — і дзяўчына журыцца, хто яе павядзе дадому? Яна варожыць, адкуль яе суджаны прыйдзе. Гэты сюжэт характэрны для славянскіх народаў.

— Як вядома, шмат паданняў нашых продкаў звязана з Бетлеемскай зоркай.

— Пра яе казалі: "Бетлеемская зорка ўказвае пастушкам дарогу". Звычайна яе чакалі на Каляды. Куцюю садзіліся есці, калі першая зорка з'явіцца на небе. Яе яшчэ называлі Казой, Заранкай...

— Наколькі вядома, вы вывучаеце і беларускі Стоўнхендж...

— Гэты дзіўны комплекс знаходзіцца на поўначы Беларусі, у Віцебскай вобласці, ля вёскі Бікульнічы. Што гэта такое, для чаго ён быў створаны? Гэта застаецца пакуль загадкай. Адно можна сказаць, на Купалу сонца ўзыходзіць там менавіта так, як указваюць камяні. Асаблівасць даных камянёў — яны пірамідальнай формы. Знаходжанне камянёў таксама невыпадковае, яны маюць пэўнае месцазнаходжанне па баках свету. Капішча змешчана на плошчы каля 100 квадратных метраў.

— А калі быў устаноўлены гэты комплекс?

— Пакуль невядома, які яго ўзрост. Комплекс трэба вывучаць. Пры першым позірку камяні падаюцца невялікімі, але калі выкопваеш верхні пласт зямлі на сантыметраў 10-15, дык бачыш, што гэта вялізныя валуны. Мясцовыя жыхары расказваюць, што трохі далей на беразе ракі некалі стаяў агромністы камень, які ўзарвалі. Насамрэч, ён мог быць арыенцірам, і людзі мелі магчымасць назіраць, калі пачынаецца Купалле. Першапачаткова яго выкарыстоўвалі па прызначэнні. Ён павінен быў фіксаваць, калі пачынаецца тое або іншае свята, калі сонца ўзыходзіць: у дзень летняга сонцастаяння, вясенняй раўнавагі.

Беларускі Стоўнхендж прыцягвае турыстаў. І такі аб'ект у Беларусі не адзіны. У Аршанскім раёне таксама знайшлі нешта падобнае. На мяжы Беларусі з Літвой знойдзены камень, на які нанесены малюнкі, там вельмі добра відаць зоркавае неба. У Беларусі шмат чаго захавалася этнаастранамічнага.

— Прыкметы народнай астраноміі захаваліся толькі ў вёсках? І носьбітаў такіх ведаў можна сустрэць толькі там?

— Так. Народныя ўяўленні захаваліся ў асноўным у вёсках. Яны захаваліся не толькі ў словах, а і на ручніках, іншых побытавых прадметах. Лічылася, што кожнаму чалавеку належыць зорка. І калі на ручніку вышыта зорка, дык гэта не толькі зорка, але і душа чалавека. Часта на ручніках сустракаюцца выявы трох зорак. Іх яшчэ называюць — Тры сястры. Зрэшты, Тры Сястры — частка сузор'я Арыёна (Касцы). У нашых продкаў існуе шмат казак і паданняў, у якіх асноўнымі дзеючымі асобамі з'яўляюцца касцы-мужчыны, жанчыны, што працуюць на полі. Тыя ж вобразы можна ўбачыць і ў небе: касцы — Арыён, жанчыны — Пляяды, дарога — Млечны Шлях. Па Касцах вызначалі час: Касцы далёка пайшлі — трэба падымацца.

Цікава, што Млечны Шлях у Беларусі называлі Гусінай дарогай, Птушынай дарогай. Казалі, што па гэтай дарожцы птушкі ляцяць у вырай. Захаваліся камяні, на якіх адлюстраваны зоркавае неба, нейкія асобныя сузор'і. Нашы продкі карысталіся зоркавай інфармацыяй. Для іх было важна ведаць, калі араць, сеяць, якая пара года.

— З якімі новымі працамі вы маеце намер пазнаёміць тых, хто цікавіцца беларускай этнаастраноміяй па-за межамі нашай краіны?

— Зараз у рамках міжнароднага праекта "Meteor folk-beliefs" рыхтую для англійскага часопіса другі артыкул пра беларускія народныя ўяўленні аб метэорах. Міжнародная арганізацыя па назіранні за метэорамі мае намер выпусціць зборнік на дадзеную тэму і паказаць, як успрымалі гэту прыродную з'яву ў розных краінах свету, у тым ліку і нашы продкі.

Што тычыцца маёй далейшай працы, дык працягваю збіраць матэрыял. Стараюся вышукваць старыя зборнікі, дыялекталагічныя слоўнікі. Мяркую разам з супрацоўнікам музея, што ў пасёлку Малетай (Літва), Ёнасам Вайшкунасам даследаваць памежныя раёны, знайсці новыя назвы зорак і сузор'яў, легенды, звязаныя з імі.

Гутарыла Наталля МАЗУР.

НА ЗДЫМКАХ: Цімафей АВІЛІН; зорнае неба.

Зваротная сувязь

Польшча

Апошняе развітанне

Памяці Кастуся Майсені

Жыццёвы лёс зусім не быў салодкі,
Ён быў цярністы, Дарагі Кастусь,
Супроць Цябе было шмат розных сродкаў,
Ты ўсё жыццё цярпеў за Беларусь.

Цяжкім было і доўгае ўміранне,
Выгляд шпітальных хоспісных умоў.
Апошняе з Табою развітанне
Чуллівай Жонкі і Тваіх сяброў.

Ты ўсё жыццё сваё пражыў з надзеяй,
Што праца не растраціцца Твая.
Дык помнік Твой, у постаці Музея,
Павінен быць Твайго, Кастусь, імя.

Спі, спі спакойна, Дружа, з Божым Духам,
Пасля трудоў жыццёвых і трывог.
Хай хоць зямелька будзе Табе пухам,
Няхай Цябе ў апецы мае Бог!

Віктар ШВЕД.
Гайнаўка, 14.X.2006 года.

Малдова

Іван БАТРАЧКІН

Поэт. Не поэт

Я не поэт. Мне так сказали.
Мол, нет поэзии в стихах.
Лиризма в них не отыскали.
Одна лишь проза. Ох да ах!

Быть может лирики не много.
А может даже вовсе нет.
Судья нашелся очень строгий
И приговор: "Ты не поэт".

Ну и пускай. Я не в обиде
На эту горькую мне весть.
Я ведь писал о том, что видел.
А в жизни только проза есть.

Я не поэт. О, милый Боже!
Не надо слезы проливать.
На что стихи мои похожи,
Читатель может лишь сказать.

И Бог судья судье такому.
У всех есть мнение свое.
Одни едят траву-солому,
Иные ищут мумие.

Латвія, Даўгаўпілс

Дзень моў у Даўгаўпілскім універсітэце

Па ініцыятыве кафедры заходніх моў штогод гэта свята праводзіцца з 2003 года. Кожны год яно мае сваю пэўную тэму. Сёлета — прэзентацыя аднаго з нацыянальных свят усіх тых краін, мовы якіх вывучаюць студэнты універсітэта. А іх ужо 12. Сярод іх дзесяць гадоў вывучаецца і наша беларуская мова. Дарэчы, сёлета ўведзена кітайская мова. Студэнты другога курса вырашылі паказаць, як беларусы святкуюць Багач, пачаставаць прысутных агароднінай і садавінай, выказаць усім свае пажаданні. Ансамбль "Ластаўкі" Цэнтра беларускай культуры парадаваў прысутных беларускай песняй.

Нашы пажаданні з гэтым святам мы дасылаем усім беларусам:

Каб вы былі здаровы, як вада,
Багатыя, як зямля,
Вясёлымі, як сваты на вяселлі.
Шчасця вам, долі, хлеба ўволю.
Жадаем вам,
Каб у садочку і хлявочку,
у полечку і дамочку
ўсё радзіла і пладзіла.

Таццяна БУЧЭЛЬ.

Упершыню першыя

Беларуская каманда па стральбе з лука ўпершыню заваявала залатыя медалі чэмпіянату Еўропы. Гэтага поспеху дабіліся Антон Прылепаў, Мікалай Марусеў і Сяргей Віторскі.

Беларускае трыо на шляху да фіналу ўпэўнена перамагло ўсіх сапернікаў, у тым ліку суайчыннікаў легендарнага Робін Гуда з Англіі, а ў апошняй сустрэчы ў спрэчцы за "золата" нашы спартсмены выйгралі ў алімпійскіх чэмпіёнаў — зборнай Іспаніі.

Сярэбраны дождж

Беларускія спартсменкі заваявалі сем узнагарод у фінале "Гран-пры" па мастацкай гімнастыцы ў Берліне.

Са сталіцы Германіі нашы грацыі прывезлі шэсць сярэбраных і адзін бронзавы медаль, паведамілі ў Міністэрстве спорту і турызму. Найвялікшага поспеху сярод беларусак дабілася Іна Жукава. Яна заваявала тры "серабра" ў практыкаваннях са скакалкай, булавамі і стужкай. У шматбор'і Жукава стала трэцяй. Акрамя таго, у шматбор'і ў групавых практыкаваннях зборная Беларусі стала другой, прапусціўшы наперад толькі расіянак.

Цэнтр фігурнага катання перамясціўся ў Гомель

Вядомыя расійскія фігурысты Ілья Авербух і Ірына Лабачова ствараюць у Гомелі сваю школу. Праект будзе ажыццяўляцца пры падтрымцы Гомельскага прадстаўніцтва Нацыянальнага алімпійскага камітэта, аб чым было падпісана пагадненне ў гомельскім Лядовым палацы.

Як паведаміў на прэс-канферэнцыі дырэктар кампаніі "Лядовая сімфонія" Ілья Авербух, школа ствараецца на базе Лядовага палаца, дзе дзейнічае дзіцячая юнацкая спартыўная школа №5 і секцыя фігурнага катання. Мяркуецца, што школа вядомых майстроў пачне працаваць ужо праз месяц. У Гомель будуць накіраваны расійскія спецыялісты па фігурным катанні для адбору перспектыўных дзяцей. Пасля з імі будуць займацца вядомыя трэнеры, у тым ліку алімпійскія чэмпіёны.

Адказваючы на пытанні журналістаў, Ілья Авербух адзначыў высокі ўзровень падрыхтоўкі гомельскіх дзяцей, якія займаюцца ў секцыі фігурнага катання ДЮСШ №5, для якіх фігурысты правялі майстар-клас.

Дэбют гімнаста Царэвіча прайшоў на "пяцёркі"

Беларускі гімнаст Аляксандр Царэвіч удала выступіў на этапе Кубка свету ў нямецкім Штутгарце.

Дэбютанту беларускай зборнай асабліва ўдаліся практыкаванні на брусах і перакладзіне, дзе ён заняў у фінале пятыя месцы. Малады спартсмен змог апярэдзіць многіх вядомых майстроў, а саступіў прызёрам сусветных і еўрапейскіх першынстваў.

У наступным годзе Штутгарт прыме сусветны чэмпіянат, дзе будуць разыграны пуцёўкі на Алімпійскія гульні-2008 у Пекіне.

Аляксандр САКАЛОЎ:

"Більярд як спорт і мастацтва"

Не так даўно ў Мінску прайшоў розыгрыш першага ў гісторыі рускага більярда Кубка Еўропы па "пірамідзе". Трыбуны былі перапоўненыя. У прысутнасці міністра спорту і турызму краіны прызы пераможцам уручаў трохразовы алімпійскі чэмпіён Аляксандр Мядзведзь. Бліскучую арганізацыю спаборніцтваў забяспечыла кампанія "Руптур", генеральны дырэктар якой Аляксандр Сакалоў па сумяшчальніцтве — старшыня Еўрапейскага камітэта па "пірамідзе". Для Аляксандра Іванавіча більярд не проста спартыўнае захапленне, але і паспяховы бізнес.

— Па адукацыі я геолаг, і, натуральна, мой шлях у бізнесе пачаўся з інжынерна-геалагічных пошукаў. А 11 гадоў таму я арганізаваў фірму, якую назваў "Руптур", што азначала "Прарыў", і пачаў шукаць новы шлях. Спачатку мы проста гандлявалі рознымі таварамі, у тым ліку і спартыўным трыкатажам. Але аднойчы ў адным са спартыўных магазінаў у Бранску нам задалі пытанне: "А чаму вы не возіце більярднае абсталяванне? У Мінску ж ёсць добрая фабрыка"? Мы пайшлі на гэту фабрыку, пераканаліся, што яе прадукцыя нядрэнная, улічылі, што ў краінах СНД узрасла цікавасць да гэтай гульні, і пачалі паставаць на гэтую вытворчасць. Вядома, цяжкасці былі. Вельмі моцна падкасіў 1998 год, калі ў Расіі здарыўся "дэфолт". Але дзякуючы таму, што ў нашым асартыменце з'явіўся добры спартыўны стол "Брытанія", мы акрыялі значна хутчэй, чым іншыя камерцыйныя фірмы, паколькі більярд развіваўся даволі бурна. Ужо праз паўгода мы зноў сталі на ногі, а зараз адраджаем і вытворчасць кіёў. Сёння 80 працэнтаў нашага збыту — у Расіі, 15 — у Беларусі, астатняе прыходзіцца на іншыя краіны СНД. У нас ёсць дылерская сетка, праз якую маем магчымасць планавай рэалізацыі. Робім любыя сталы, якія нам заказваюць: для "піраміды", снукера, пула, і вытворчая база штогод пашыраецца. Гэта дае магчымасць частку грошай накіроўваць на развіццё більярднага спорту ў Беларусі. Але, шчыра кажучы, "гнаць вал" досыць маркотна, хай нават і прыбыткова. Таму зараз шмат сіл накіроўваем на канструктарскія працы, стараемся сумясціць, як гаворыцца, спорт і мастацтва. Бо адна справа — паставіць стол, і зусім іншая — стварыць вакол яго добрую атмасферу, настрой. Так і нарадзіліся більярд-комплексы "Адмірал", дзе выкарыстоўваюцца марскія матывы, "Інквізітар", стылізаваны пад сярэднявечча, ратангавы більярд-салон "Раджа" нібы пераносіць яго ўладальніка і гасцей у віктарыянскую эпоху каланіяльнай Індыі...

У нас ужо з'явіліся заказы з Амерыкі, Германіі, іншых краін "далёкага замежжа", дзе разумеюць карысць у дызайне і добрай працы. Наша фірма ўкладвае сродкі ў развіццё більярда ў Беларусі, верыць у яго значную сацыяльную функцыю: займаючыся ў більярдных залах, моладзь не толькі развіваецца фізічна, але і адрываецца ад бяздумных забаў на дыскатэках і ў Інтэрнэт-кафэ.

Фота Сяргея ДЗЕНІСЕНКІ.

Іна КАЛІНІНА:

"Жыццё — гэта бесперапынны бег з бар'ерамі"

"Вядома, спорт гартуе чалавека. Але ён, урэшце рэшт, заканчваецца. А потым? Колькі мы ведаем вялікіх спартсменаў, якія не знайшлі сябе па-за спортам. Трэба знайсці ў сабе сілы, узяць для сябе ўсё магчымае ў спорце і загадзя рыхтавацца да так званага нармальнага жыцця (сёння зусім няпростага). Тут таксама трэба знайсці сваё месца, і ўжо на гэтым месцы дамагчыся максімальных вынікаў". Так лічыць беларуская лёгкаатлетка Іна Калініна. Так яна і жыве.

— Я нарадзілася ў Жлобіне, у простай рабочай сям'і. Маці дагэтуль працуе там кранаўшчыцай на Жлобінскім вопытным рамонтна-механічным заводзе, а бацька — слесарам на Беларускім металургічным заводзе. Там жа працуе і брат. А я з дзяцінства марыла аб чымсьці вялікім, цікавым. Пачала займацца танцамі, але нечакана для ўсіх (і для сябе) перамагла ў гарадскім лёгкаатлетычным кросе. Там мяне і заўважыў трэнер Віктар Навуменка, які збіраў каманду на абласны крос. У яго я і стала трэніравацца з 12 гадоў. А ўжо ў дзевятым класе паступіла ў гомельскае вучылішча алімпійскага рэзерву.

…З Сашам мы не маглі не сустрэцца: ён таксама займаўся лёгкай атлетыкай, бегаў 400 метраў з бар'ерамі. А яшчэ быў душой любой кампаніі, жартаўнік, выдумшчык, прыгажун. І я, тады "шэранькая мышка", вядома ж, патрапіла пад яго прывабнасць, мы сталі сустракацца не толькі на трэніроўках. Ён быў старэйшы і неўзабаве паступіў у інстытут фізкультуры ў Мінску, дзе пачаў трэніравацца пад кіраўніцтвам выдатнага настаўніка — заслужанага трэнера СССР Анатоля Юліна. Ну і, як вы самі разумееце, у мяне іншай дарогі не было: я апынулася ў тым жа інстытуце, перайшла да таго ж трэнера. Анатоль Іванавіч параіў змяніць кваліфікацыю: раней бегала на 800 метраў, а перайшла на 400 метраў з бар'ерамі. Дыстанцыя і мне самой вельмі спадабалася, менавіта на ёй я стала майстрам спорту. Так усё і ішло да 2000 года. А потым мы з Сашам вырашылі пажаніцца, з'явілася дачушка Дашанька.

Тады, у 2001 годзе, я "выпала са спорту" на тры гады. Думала, што ўжо не вярнуся, бо да гэтага часу памёр дарагі Анатоль Іванавіч. Але за час сядзення з дзіцем я гэтулькі перачытала і перадумала, што вырашыла "пачаць рухацца". І вось, калі паволі бегла па лесе ля базы "Працоўных рэзерваў", то сустрэла маладога трэнера Ігара Захарэвіча. Мы пагаварылі, і ён прапанаваў дапамагчы, калі я зноў пачну бегаць 800 метраў. Мне не вельмі хацелася гэта рабіць, але іншых прапаноў тады не было. Тым больш, што Ігар пагадзіўся падчас трэніровак прыглядаць за маленькай Дашай, пад крыкі якой я і бегала.

Да гэтай дыстанцыі душа ўжо не ляжала, і праз дзевяць месяцаў я пачала трэніраваць бар'еры з былой вучаніцай Юліна — Тамарай Калеснікавай. З першага ж старту выйшла ў лідэры і трапіла на Кубак Еўропы. А аднойчы мне патэлефанавала Калеснікава і прапанавала выкладаць на кафедры фізвыхавання ў Інстытуце радыёэлектронікі — у мяне на руках ужо быў дыплом аб заканчэнні вну. Спачатку сумнявалася, ці спраўлюся. Але кіраўніцтва паабяцала ва ўсім ісці насустрач. У спорце пасля трохгадовага перапынку не паказвала "сусветны ўзровень", хоць і была лепшай у краіне ў гэтым відзе. Трэба было зарабляць на гэту, як я лічыла, "забаву", бо грошы былі вельмі патрэбныя — на вітамінізацыю, адпаведнае харчаванне і іншае. А прасіць у мужа, хоць ён паступова пачаў прыстойна зарабляць, не хацелася.

Вось, пазнаёміўшыся з інстытуцкай спецыфікай, я ўмацавалася ў думцы атрымаць другую спецыяльнасць "маркетолаг-эканаміст". І зноў кіраўніцтва інстытута пайшло мне насустрач, хоць пасля гэтага жыццё моцна ўскладнілася: праца, вучоба, маленькая Даша. Як ні дзіўна, паратункам стаў спорт. Калі ў канцы дня ў галаве поўная каша, мора негатыўных эмоцый, то, паставіўшы гэтыя бар'еры і прабягаючы іх шмат разоў да знямогі, раптам адчуваеш шчаслівую пустэчу, калі хочацца аблашчыць і дзіця, і мужа… Можа, гэта і ёсць шчасце?

І нават калі я, дасць Бог, стану прызёрам на нейкіх буйных спаборніцтвах, або патраплю на Алімпійскія гульні, чаго мне вельмі хочацца, то ўсё роўна — калі-небудзь спорт скончыцца. А потым трэба жыць далей, і каб не пачынаць гэта жыццё з нуля, трэба працягваць развівацца — ужо ў іншай якасці. Жыццё — гэта бесперапынны бег з бар'ерамі, пастаяннае развіццё.

Старонку падрыхтаваў Юрый ВОЛГІН.

"Цырк на вадзе" – містычны сплаў музыкі, казачнага свету і харэаграфіі

У Беларускім дзяржаўным цырку адбылася прэм'ера новай праграмы "Цырк на вадзе". Як паведаміла дырэктар Белдзяржцырка Таццяна Бандарчук, перагаворы аб пастаноўцы ў Мінску праграмы "Цырк на вадзе" ішлі тры гады. Аўтары ідэі Яна і Андрэй Шаўчэнкі прадстаўляць беларускаму гледачу цырк XXI стагоддзя — містычны сплаў музыкі, казачнага свету і харэаграфіі на вадзе. Для прадстаўлення спецыяльна падабрана унікальная трупа цыркавых артыстаў розных жанраў. Акрамя таго, на арэне замест звыклага манежа ўстаноўлены сапраўдны басейн. У шоу выкарыстоўваецца 135-160 кубаметраў вады, а таксама 85 тысяч тэнісных шарыкаў для стварэння нагляднасці марской пены.

НА ЗДЫМКАХ: у час прадстаўлення.

Фота Генадзя ЖЫНКОВА, БелТА.



"Сілічы" ў золаце і срэбры

Нацыянальны банк Рэспублікі Беларусь увёў у абарачэнне памятныя манеты "Рэспубліканскі гарналыжны цэнтр "Сілічы": залатую — наміналам 200 рублёў; сярэбраную — наміналам 20 рублёў, медна-нікелевую — наміналам адзін рубель.

Залатыя і сярэбраныя манеты адчаканены якасцю "пруф", медна-нікелевыя — "пруф-лайк". Тыраж залатой — 2 000 штук, сярэбранай — 5 000 штук, медна-нікелевай — 5 000 штук.

"Смаленскія брыльянты" прадставілі "Эрмітаж"



Вядомы расійскі ювелірны брэнд "Смаленскія брыльянты" прадставіў у Мінску калекцыю ўпрыгожванняў "Эрмітаж". Яна дэманстравалася ў Нацыянальным мастацкім музеі Беларусі.

У калекцыі было прадстаўлена больш за 100 упрыгожванняў, выкананых па матывах форм старажытнарускай архітэктуры: званіц, купалаў велічных рускіх сабораў і іншых. Частка калекцыі — каля 18 прадметаў — зроблена ў адзінкавых экземплярах.

НА ЗДЫМКУ: паказ калекцыі ўпрыгожванняў "Эрмітаж".

Фота Фёдара ЧЫГАРАВА, БелТА.

Нататкі з нагоды

Пра мудрую і спрытную, створаную з чортавага хваста...

У старажытных славян была цікавая і малавядомая для нас гіпотэза стварэння першых людзей. Лічылі нашы далёкія продкі, што Бог стварыў Мужчыну з гліны, а Чорт украў гэту новую істоту (напэўна, каб самому бавіць з ёй час). Бог, даганяючы нягодніка, адарваў яму хвост... і зрабіў з хваста Жанчыну!

Так тлумачыцца яе непастаянства, хітрасць і спрытны розум. Але старажытныя славяне ў сваіх касмалагічных вераваннях рэабілітавалі Жанчыну, сказаўшы, што яна, яблык і спакуса не маюць адносін да выгнання людзей з раю. Гэта Мужчына, які праспаў цэлы дзень пад кустом, згубіў валоў, што Бог сказаў яму пасвіць быў пакараны за непаслухмянства.

Нічога не маю супраць біблейскай версіі, але старажытнаславянскі погляд на такі далікатны момант у жыцці чалавецтва падштурхоўвае мяне да вываду: прыслухоўвайцеся да жанчыны, а мужчыну — скідвайце з канапы, каб не праспаў.

У Беларусі жанчыны складаюць 53 працэнты насельніцтва. Займаюць самыя розныя нішы ў грамадстве. Выгодна адчуваюць сябе ў бізнесе і палітыцы, вядуць актыўную грамадскую дзейнасць. Распрацоўваюць шырокае кола праграм беларуская жаночая партыя "Надзея", Саюз беларускіх жанчын. Пытаннямі жаночага лідэрства займаюцца жаночы інстытут "Энвіла", грамадскія аб'яднанні "Жаночы незалежны дэмакратычны рух", "Супрацоўніцтва дзелавых і творчых жанчын" і "Беларуская жаночая ліга". Працэнт жанчын у саветах вырас да 44 з паловай.

Прычынамі такой паспяховай, канкурэнтназдольнай у адносінах да мужчын працы з'яўляюцца ініцыятыўнасць, прафесіяналізм, абавязкова спрытны розум і хітрасць (продкі нашы, славяне, не памыляліся). Жанчына-прэзідэнт? Цяпер гэта так верагодна, як некалі здавалася немагчымым. Вядомы прыклад: Латвіяй кіруе Вайра Віке-Фрэйберга, на прэзідэнцкіх выбарах у Чылі атрымала перамогу Мічэль Бачэлет. Гэта ўжо не выключэнне з агульных правілаў, а норма жыцця, якая паказвае, што жанчына на многае здольная.

...Сустракаю на вуліцах жанчын задуменных альбо бесклапотных, са строгім позіркам ці з лагоднай усмешкай. Пасля працы чакаюць іх хатнія клопаты. Не мае значэнне, хто жанчына па прафесіі — настаўніца або міністр, сямейнае вогнішча з'яўляецца яе найвялікшай місіяй, не выканаць якую яна не мае права. Ва ўсе часы, ва ўсіх народаў жанчына лічылася сімвалам урадлівасці і прадаўжэння жыцця. Гэты бок яе існасці самы трапяткі і самы безабаронны. Жанчыне заўсёды была патрэбна ўвага і падтрымка моцнай сваёй паловы.

Некалі жанчыны насілі абярэгі. У наш час нічога не змянілася. Проста забыліся ўсе, што падвескі, завушніцы, грабяшкі, пярсцёнкі служылі для абароны ад злых духаў. Выкоўваліся абярэгі з бронзы ці іншага жоўтага, "сонечнага" металу, а таксама серабра. Апекуном жанчыны лічыўся Месяц, таямнічы і магічны. Дарэмна мужчыны прымаюць ўпрыгожванні за жаночы капрыз і не надаюць ім асаблівага значэння, увогуле, як і некаторыя жанчыны. Што не змянілася, дык гэта меркаванне, маўляў, колькасць пярсцёнкаў, пацеркаў, завушніц гаворыць пра статус прыгажуні, пра яе задаволенасць жыццём. Хаця цяпер бяруцца да ўвагі іншыя фактары: месца працы, марка аўтамабіля, мадэль сотавага тэлефона, колькасць вопраткі ў шафе і шмат іншае.

Але справа зусім не ў гэтым... Шчаслівае асабістае жыццё! Вось, што сапраўды патрэбна жанчыне. А гэта, калі пасля працы прыходзіш дадому стомленая, але з вялікім задавальненнем гатуеш вячэру, таму што хутка вернецца мужны, моцны, ласкавы... адным словам — мужчына. І не задумваешся нават аб тым, што трэба змагацца супраць дыскрымінацыі, за раўнапраўе, за сумеснае супрацоўніцтва ў грамадстве, навуцы, палітыцы. Не зважаеш увагу, калі тэрміны "фемінізм", "эмансіпацыя" і "фрыгіднасць" ужываюць як сінонімы. Так, у сучаснай жанчыны, якая рэалізуе сябе, менш часу застаецца для сваіх родных і каханых, але ад гэтага яна не губляе сваю сутнасць. Не павінна губляць.

Вялікая перамога жанчыны — не застацца адзінокай у сваіх лаўрах, быць прафесіяналам у сваёй дзейнасці і яшчэ большым прафесіяналам у мацярынстве. Найвялікшая мудрасць жанчыны (хвала Богу, які стварыў яе з чортавага хваста) — зрабіць так, каб мужчына не спаў, калі трэба пасвіць валоў, каб яму заўсёды хацелася быць мужным, моцным, ласкавым.

P.S. 2006 год, які хутка завяршыцца, аб'яўлены ў Беларусі годам жанчыны. А ў глабальным плане астролагі прызналі XXI стагоддзе — часам лідэрства!

Марына ГАБРЫЯНІК.

«Голас Радзімы»
Галоўны рэдактар
Наталля САЛУК.

ЗАСНАВАЛЬНІКІ:
Міністэрства замежных спраў Рэспублікі Беларусь;
Камітэт па справах рэлігій і нацыянальнасцяў пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь;
Беларускае таварыства дружбы і культурнай сувязі з зарубежнымі краінамі;
Беларускае таварыства па сувязях з суайчыннікамі за рубяжом «Радзіма».

Наш адрас: 220005, Рэспубліка Беларусь, Мінск, пр. Незалежнасці, 44.
Тэлефоны: (+375 – 17) 288 – 11 – 97 (тэл./факс), 288–12–80, 284–76–56 (бухгалтэрыя), 288– 17– 82.
Галоўны рэдактар: 8029– 6– 88–17– 82. E-mail:golas_radzimy@tut.by

ЧЫТАЙЦЕ «Голас Радзімы» Ў ІНТЭРНЭЦЕ:
http://www.belarus21.by

Рэгістрацыйнае пасведчанне №81. Падпісны індэкс у Беларусі 63854.
Аб'ём 8 друк. аркушаў. Тыраж 1296 экз. Заказ 651Г. Падпісана да друку 07. 11. 2006 г. у 12.00.
Газета набрана і звярстана на рэдакцыйным настольна-выдавецкім комплексе. Знакам R пазначаны рэкламныя матэрыялы.
Аддрукавана ААТ «Чырвоная зорка» (220073, г. Мінск, 1-шы Загарадны завулак, 3).
Пазіцыі рэдакцыі і аўтараў, матэрыялы якіх друкуюцца на старонках «Голасу Радзімы», могуць не супадаць.
© «Голас Радзімы», 2006.